№ 3 (457) 20 студзеня 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы



ГЖЭГАЖ ДАМБРОЎСКІ

## Аднаго твару досыць

Лідзія Ярмошына вынесла папярэджаньні Мілінкевічу й Пазьняку. Старонка 4.

**Паводле законаў сьмятаны**

«Наверсе баяцца не абстрактна-максымалісцкіх лёзунгаў, а пэрсаналізаванай альтэрнатывы — з вусамі і барадой гарадзенскага фізыка». «Палітычная кухня» Аляксандра Класкоўскага — **старонка 24.**

## «Першы раз бачу такое»

«У Менску зьбіраць подпісы цяжэй, чым у рэгіёнах, сярод моладзі — цяжэй, чым сярод старэйшых людзей». Вынікі збору подпісаў аналізуюць палітыкі й палітолягі. **Старонка 6.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Мароз нас ня возьме

У чацьвер у Менску чакалі мінус 20, у ноч на нядзелю сыноптыкі абяцаюць мінус 26. Паводле сайту www.meteo.by "пацяпленьне" чакаецца ў другой палове наступнага тыдня — да мінус 12.

**Падпішыся сёньня!** Каб гарантавана чытаць «НН», дашліце ў Рэдакцыю свой адрас. Дэталі, сьпіс ахвярадаўцаў «НН» — **старонка 9**.

**Набліжэньне эпохі**

Эсэ Сяргея Дубаўца. **Старонка 20**.

**Сяргею Дубаўцу**

адказвае Андрэй Дынько. Старонка 23.

**Украінцы рабілі рэвалюцыю ў Беларусі**

Артыкул украінскага гісторыка Міколы Чабана. **Старонка 32.**

## Сэзон падпольных канцэртаў

пачаўся. Старонка 16.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ



**раваабаронца Алесь Бяляцкі атрымаў прэмію Сахарава. Нарвэскі Хельсынскі камітэт ганараваў яго а практычную і палітычную дапамогу ахвярам рэпрэсій.**

**«Едзе мышка» — складзі кніжку**

Новы праект «НН» «Газэтка дзеткам» — **старонка 44.**

# У нумары:

**факты і камэнтары**
Аднаго твару досыць. Папярэджаньні ЦВК Мілінкевічу й Пазьняку ... 4
Як стаць членам участковай выбарчай камісіі ... 4
Скура для Домаша ... 5
Літаратары і іншыя ідэалягічныя работнікі ... 5
«Першы раз бачу такое». Аб чым сьведчыць тэмп збору подпісаў. Апытаньне экспэртаў ... 6
Зацьверджаны слоган кампаніі Мілінкевіча ... 7
Мілінкевіч накіруецца ў Варшаву і Шчучын ... 11

**пішуць чытачы**
Беларускае? Канфіскаваць! ... 8
Беларусы Кракава згуртаваліся ... 8
Што робіцца ў Воршы ... 8

**мы самі**
Падзякі ахвярадаўцам ... 9
Увазе падпісчыкаў «НН»!!! ... 10

**рэпартаж**
Падарожжа ў сэрца ... 11

**хроніка**
Павал Севярынец. Лісты зь лесу: Палігон ... 12
Сьціслая хроніка рэпрэсій і супраціву ... 12
Зь яго пачынаецца Жодзіна. Крымінальная справа супраць Паўла Красоўскага ... 14

**культура**
Пачаўся сэзон падпольных канцэртаў ... 16
«Шостае падарожжа» Касі ... 17
Тузін гітоў: вынікі ... 17
БДАааа, «Песьняры»… ... 18
У Беларусі, і нідзе болей ... 19

**вострая брама**
Сяргей Дубавец. Набліжэньне эпохі ... 20
Андрэй Дынько. Адказ Сяргею Дубаўцу ... 23

**палітычная кухня**
Аляксандар Класкоўскі. Паводле законаў сьмятаны ... 24

**левым вокам**
Лёлік Ушкін. Дэмакратычны сатурналій ... 25

**пошта рэдакцыі**
Лісты і водгукі ... 26

**іншымі словамі**
Віталь Тарас. Гульня ў інфанты ... 28

**стыль жыцьця**
Джынсы — не найгоршы варыянт ... 30

**гісторыя**
Як украінцы рабілі рэвалюцыю ў Беларусі ... 32

**бібліятэка**
Піянэрская праца. Анатоль Сідарэвіч пра кнігу Аляксандра Надсана ... 34
Новыя кнігі, дасланыя ў Рэдакцыю ... 35

**паэтычны аглядальнік**
Блазен гасподні. Аляксандар Фядута пра Віктара Шалкевіча ... 36

**літаратура**
Ева Вежнавец. Шлях дробнай сволачы ... 40
Уладзімер Някляеў. Знакі прыпынку ... 42
Старонка вершаванага радка ... 43

**газэтка дзеткам**
Едзе мышка ... 44

**вольны час**
Каіса ... 45
«Песьні свабоды»: складзем дыск разам ... 45

**дзе варта быць**
Варта паглядзець ... 46
Кіно на выходныя ... 46
Зрабі з газэты кнігу ... 46

**абвесткі і жарты**
«НН» 100 гадоў з вамі ... 48
Прыватныя абвесткі ... 48

**Вельмі просім чытачоў, якія ад Новага году чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

## 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

Адны чытачы прапануюць: вы б адчынілі свае шапікі для незалежнай прэсы або здавалі свае газэты на продаж у супэрмаркеты, дзе ляжаць «Гастраном» і «БелГазета». Людзі наіўна думаюць, што гэта магчыма. Каб прадаваць газэту, скажам, у краме «Акіян», трэба атрымаць узгадненьне ў ідэалягічным аддзеле гарвыканкаму. А там не даюць. Пішуць проста: «немэтазгодна». Ідэалягічныя аддзелы зацьвярджаюць, узгадняюць, дазваляюць — выконваюць функцыі парткамаў і ЦК савецкага часу. У Інтэрнэце прайшла непацьверджаная інфармацыя, што супрацоўнікаў тых аддзелаў пачалі паралельна прымаць на другую стаўку ў КДБ. Такое шматтысячнае войска, добра аплачванае і не занятае нічым, акрамя кантролю за масамі. Ім лепш, чым пры СССР. У КПСС ты мусіў «партыйныя» ўзносы сплачваць, а тут табе другі мільён выдаюць… Як жа пачынаюць гэтых людзей ненавідзець тыя, каго яны кантралююць.
Людзі, якія набылі сваю першую машыну і першую пралку пры Лукашэнку, нічога лепшага за яго ня бачылі. За яго і прагаласуюць. Свабода, незалежнасьць, гістарычная праўда для гэтых дзяцей брэжнеўскіх бацькоў — мулкія абстракцыі. Апалітычнасьць пакаленьня новых спажыўцоў стала шокам для зборшчыкаў подпісаў за апазыцыйных кандыдатаў. Некалькі рэалістычных ацэнак вынікаў падпіснoе кампаніі — на **старонцы 6**, у апытаньні палітыкаў і палітолягаў.
Я заўжды меркаваў, што музычны партал music.fromby.net дзейнічае на грошы нейкіх замежных дабрадзеяў або праз хітрае выкарыстаньне сродкаў аднаго з цэнтраў творчасьці моладзі, як гэта бывае ў нашай краіне. На «фромбайнэце» можна праслухаць або згрузіць сабе на кампутар сотні беларускіх песень — ня тых, яснае дзела, што ў ратацыі АНТ. Аказалася, гэты надзвычай папулярны рэсурс (цалкам беларускамоўны) створаны й фінансуецца прыватнай асобай — высокааплачваным праграмістам, які хаваецца пад псэўданімам Вецер Мэханічны. Сеціўны праект каштуе ня так дорага, а ўсе праграмныя патрэбы для яго задавальняе сам Вецер. Вынікі чарговага туру «Тузіна гітоў» з music.fromby.net вы знойдзеце на **старонцы 17.** Перамагла Кася Камоцкая з рэтэйкам 14-гадовай (паказальна) даўніны.
Пры Лукашэнку стала, як пры цару. Пакуль ня горш: дзяржава беларускую культуру церпіць, хоць і дыскрымінуе, беларускіх дзеячаў ссылае і г.д. Усё, што ёсьць, ствараецца за грошы прыватных фундатараў. Гэта камфортныя для творчасьці ўмовы. Успомнім, колькі даў пачатак ХХ стагодзьдзя ў літаратуры, мэдыйным жанры, рэлігійнай думцы, гістарыяграфіі й мастацтве. Лягічна чакаць падобнага і ад нашых дзён. Між тым у апошняй «Вострай Браме» Сяргей Дубавец называе іх пэрыядам задоўжанага бясчасься. Я палічыў патрэбным адказаць яму — **старонка 23**.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Музычны сэзон-2006 будзе сэзонам падпольных канцэртаў. Распачала яго «Крама» нелегальным выступам на адной зь менскіх пляцовак.**

# Аднаго твару досыць

мяркуе Лідзія Ярмошына.

Аляксандар Мілінкевіч і Зянон Пазьняк атрымалі афіцыйныя папярэджаньні ад ЦВК за «правядзеньне датэрміновай агітацыі». Мілінкевічу закідаліся каляндарыкі й «дарагія партрэты», Пазьняку — агітацыя за народнае галасаваньне.

Старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына казала, што каляндарыкаў распаўсюджваецца шмат, а партрэты — відавочна дарагія, што ЦВК вядомыя наклады, месцы друку (гэтыя зьвесткі стаяць на кожным каляндарыку. — **З.Д.**), вядомыя маршруты й машыны, на якіх перавозілі гэтыя каляндарыкі зь Менску ў абласныя й раённыя цэнтры (вось тут праробленыя вялікі кавалак працы. — **З.Д.**). «Зразумейце, мы супраць вас нічога ня маем. Але ж нельга займацца датэрміновай агітацыяй», — сказала яна. І дадала, што штаб «прыцягнуў пазабюджэтныя сродкі на друк дарагіх паліграфічных матэрыялаў», што таксама зьяўляецца парушэньнем заканадаўства.

Кіраўнік ініцыятыўнай групы Аляксандра Мілінкевіча Аляксандар Бухвостаў парыраваў, што каляндарыкі, па-першае, не агітацыя. А па-другое, да іх вырабу ініцыятыўная група Аляксандра Мілінкевіча ніякага дачыненьня ня мае. «Вось вы таксама можаце гэтыя каляндарыкі надрукаваць. І хто заўгодна можа, — кажа сп.Бухвостаў. — Чаму ж выраб гэтай прадукцыі прыпісваецца ініцыятыўнай групе? Па адным партрэце, гэта праўда, сябры ініцыятыўнай групы маюць. Але не аддаюць грамадзянам. Паказваюць, так. Але як жа зьбіраць подпісы, не паказваючы нават твару чалавека, за якога прапануеш падпісацца? А не аддаем, значыць, не агітуем», — кажа Бухвостаў.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Сяргей Папкоў на паседжаньні ЦВК у адказ на закіды пра датэрміновую агітацыю пайшоў у контратаку.

Папкоў: «Так, мы агітуем за народнае галасаваньне. І будзем агітаваць надалей. Мы прасілі ЦВК зрабіць запыт у пракуратуру, ці зачыненая крымінальная справа ў дачыненьні да Зянона Пазьняка. Калі так, дык гэта дазволіла б яму вярнуцца ў Беларусь. Але вы гэтага не зрабілі. І калі наш кандыдат ня вернецца, неяк жа трэба тлумачыць яго пазыцыю».

Ярмошына: «Пры рэгістрацыі ЦВК будзе ўлічваць, ці праводзіўся збор подпісаў з парушэньнем заканадаўства. Калі так, дык гэта можа стаць прычынай адмовы ў рэгістрацыі.

Папкоў: «Гэта ўвогуле ня выбары, а псэўдавыбары... Вы ня маеце гонару... Вам загадалі... У вас ужо ўсе лічбы падрыхтаваныя...»

Ярмошына: «Супакойцеся. Гэта не палітычная трыбуна...»

У сухім астатку маем пастанову ЦВК пра вынясеньне афіцыйных папярэджаньняў групам Пазьняка й Мілінкевіча — двух сапраўдных праціўнікаў Лукашэнкі.

Факту, што тэлебачаньне паказвае толькі аднаго кандыдата і за яго ж зьбіраюць подпісы работнікі сацыяльных і жыльлёва-камунальных службаў, спн.Ярмошына пакуль не заўважыла.

Аляксандар Мілінкевіч зьбіраецца абскардзіць «надуманае» папярэджаньне. Сяргей Папкоў мае намер працягваць ранейшую агітацыю.

**Зьміцер Дрыгайла**

## Як стаць членам участковай выбарчай камісіі?

Грамадзкія арганізацыі Беларусі выступілі з ініцыятывай «Народныя выбары». Грамадзянаў заклікаюць вылучацца ва ўчастковыя выбарчыя камісіі, што фармуюцца да 1 лютага, «каб зрабіць выбары адкрытымі». Заявы на ўдзел можна падаваць да 29 студзеня.

Стаць сябрам выбарчай камісіі мае права кожны грамадзянін. Каб вылучыцца, досыць сабраць як мінімум 10 подпісаў грамадзянаў, што пражываюць на тэрыторыі выбарчага ўчастку і маюць выбарчае права.

Каардынатары кампаніі будуць працаваць у 50 гарадах. Падрабязная інфармацыя з узорамі дакумэнтаў, парады па абароне правоў можна атрымаць, зьвярнуўшыся на e-mail kam@belngo.info альбо на тэл. (029) 336-46-84.

Узор заявы й інструкцыю для актывістаў можна знайсьці таксама на сайце www.belngo.info.

Што, калі нікога «чужога» лукашысты ўключаць ня будуць? Тады людзям прынамсі стане ясна, да чаго рыхтуюцца ўлады, мяркуюць ініцыятары кампаніі.

**АШ**


АЛЕНА АДАМЧЫК

**Іронія лёсу: у 2001 годзе Сямён Домаш здымаўся для «НН» на скураной канапе.**

# Скура для Домаша

На мінулым тыдні ў Горадні на Радзе дырэктараў прысутных пазнаёмілі з трыма новымі кіраўнікамі прадпрыемстваў, а ў іхнім ліку Сямён Домаш, які ўзначаліў гарбарнае аб’яднаньне. Калі назвалі яго прозьвішча, прысутныя нібы крыху зьнякавелі, але таксама папляскалі яму ў ладкі, як і іншым.

На мінулых прэзыдэнцкіх выбарах у 2001 годзе толькі Сямён Домаш здолеў стварыць разгалінаваную арганізацыю «Рэгіянальная Беларусь». Ён выглядаў наймацнейшым кандыдатам ад апазыцыі, але сталічнікі зрабілі ўсё, каб яго не абралі кандыдатам ад апазыцыі на выбарах. Сямён Домаш вельмі перажываў гэта, адчуваў сябе падманутым сталічнай апазыцыйнай «намэнклятурай», да таго ж пасьля гэтага на пэўны час у яго ўзьніклі праблемы са здароўем. А пазьней напаткалі праблемы з працай, ён нідзе ня мог уладкавацца. Для сябе ён вырашыў болей ня ўдзельнічаць у палітыцы. Затое ў прэзыдэнты пайшоў Аляксандар Мілінкевіч, кіраўнік ягонага передвыбарнага штабу.

Трэба зазначыць, што Домаш не выглядае зламаным. Проста яму ня хочацца болей удзельнічаць у апазыцыйнай кухні. Улады гэтым скарысталіся. Каб пазбавіць Мілінкевіча патэнцыйнага дарадцы, Домаша паслалі шкуры вычыняць. І ён пагадзіўся.

**Сяргей Максімовіч, Горадня;**
**Мікола Бугай**

# Літаратары і іншыя ідэалягічныя работнікі

17 студзеня калектыў акадэмічнага Інстытуту літаратуры пазнаёмілі з новым дырэктарам: 68-гадовага Ўладзімера Гніламёдава, былога апаратчыка ЦК КПБ, замяніў кандыдат навук, прарэктар Акадэміі мастацтваў 38-гадовы **Валеры Максімовіч**.

Камэртонам падчас «інаўгурацыі» новага кіраўніка сталі для супрацоўнікаў Інстытуту літаратуры словы акадэміка Пятра Нікіценкі (куратара сэкцыі грамадзкіх навук у Акадэміі): «літаратары і іншыя ідэалягічныя работнікі». Пры знаёмстве з калектывам новы дырэктар зазначыў, што інстытут — дзяржаўная установа, таму ў пэўным сэнсе мае быць ідэалягічнай структурай.

Папярэднім месцам працы Максімовіча была Акадэмія мастацтваў, дзе ў якасьці прарэктара ён курыраваў выхаваньне й ідэалёгію. Яшчэ раней — працаваў на філялягічным факультэце БДУ. Але, як згадваюць былыя супрацоўнікі па філфаку, Максімовіча адтуль выжылі. Адным зь ягоных «пэрлаў» быў ліст у Адміністрацыю прэзыдэнта на імя Праляскоўскага: Максімовіч вінаваціў катэдру беларускай літаратуры XX ст., што тая працягвае ў навучальную праграму «нацыяналістаў» ды «калябарантаў». Навучальны курс быў скасаваны, а аўтар адправіўся на павышэньне.

Як кажуць супрацоўнікі інстытуту, у дырэктарскае крэсла сп.Максімовіч імкнуўся: пісаў лісты асабіста кіраўніку Акадэміі навук Міхаілу Мясьніковічу з просьбай прызначыць яго. Абяцаў узьняць Інстытут літаратуры да тых вяршыняў, да якіх пры Мясьніковічу ўзьнялася Акадэмія ў цэлым. Тонкі падыход спрацаваў: кіраўнік Акадэміі аддаў перавагу Максімовічу перад іншымі прэтэндэнтамі.

**АШ**

# «Першы раз бачу такое»

«У Менску зьбіраць подпісы цяжэй, чым у рэгіёнах, сярод моладзі — цяжэй, чым сярод старэйшых людзей». Пра што яшчэ сьведчаць вынікі збору подпісаў за кандыдатаў у прэзыдэнты?

Кампанія збору подпісаў скончыцца 27 студзеня, але пэўныя тэндэнцыі ўжо вымаляваліся. Каманда Лукашэнкі абвесьціла пра 930 тысяч подпісаў, сабраных за першую палову кампаніі. Штаб Мілінкевіча ў нядзелю 15 студзеня называў лічбу 140 тысячаў. Гэта пры тым, што спачатку Калякін дэкляраваў жаданьне сабраць мільён, пасьля — 500 тыс. подпісаў. Астатнія кандыдаты набіраюць яшчэ меней. Ці можна гаварыць ужо пра пэўныя тэндэнцыі на грунце гэтых лічбаў? Аналізуюць палітык Уладзімер Навасяд, палітоляг Юры Чавусаў, журналіст «БелГазеты» Кірыла Жываловіч, кіраўнік аддзелу ўнутранай палітыкі газэты «Белорусы и рынок» Паўлюк Быкоўскі і Лявон Баршчэўскі, ганаровы старшыня Беларускага ПЭН-Цэнтру.

### Уладзімер Навасяд: «У Менску найцяжэй»

«Калі праводзіць нейкія паралелі з 2001 г., то трэба зазначыць, што ініцыятыўная група Мілінкевіча працуе сёньня як валанцёры. Няма ніякіх заробкаў, як гэта практыкавалася ў мінулую кампанію. І я вельмі зьдзіўлены гэтай працай, бо першы раз убачыў такое.

У Менску зьбіраць подпісы цяжэй, чым у рэгіёнах: тут вышэйшы ўзровень жыцьця, і стала больш тых, хто падтрымлівае Лукашэнку. У абвешчаныя тэрміны правесьці нармалёвую піяр-кампанію немагчыма. Калі б Кангрэс дэмсілаў адбыўся напярэдадні Новага году, як прапаноўвалі некаторыя, то Адзіны кандыдат цяпер нічога не рабіў бы. Нездарма выбары былі перанесеныя зь лета на вясну.

Шмат стала запалоханых — я б сказаў, такіх большасьць: людзі шмат разумеюць, але ставіць свае подпісы баяцца.

Перамены ў тым маштабе, які мы хацелі б бачыць, яшчэ ў краіне ня высьпелі. Але трэба працаваць. У тых умовах, якія ёсьць цяпер. Карыстацца легальнай магчымасьцю працаваць з насельніцтвам падчас гэтай кампаніі. Потым будуць мясцовыя выбары і выбары ў парлямэнт. Трэба ўпарта працаваць — крок за крокам».

### Паўлюк Быкоўскі: «930 тысяч — таксама піяр-акцыя»

«Варта зазначыць, што гэта ўсё ж пакуль не рэальна сабраныя, а толькі абвешчаныя галасы. Звычайна ў Цэнтравыбаркам падаецца іншая колькасьць. Дарэчы, абвешчаная праз БелТА колькасьць подпісаў у падтрымку Лукашэнкі — гэта такая ж піяр-акцыя, як і ў іншых прэтэндэнтаў.

Хачу нагадаць, што Лідзія Ярмошына яшчэ ўлетку 2005 г. казала, што ўдзельнічаць будуць чатыры кандыдаты. Думаю, яна не памыліцца. Найбольш верагодна, што гэта будуць Лукашэнка, Гайдукевіч, Мілінкевіч і Казулін. На маю думку, ЦВК ня будзе рэгістраваць Пазьняка ні ў якім разе, бо ён абяцаўся, што ў выпадку рэгістрацыі прыедзе ў Беларусь. Папершае, гэта будзе інфармацыйная нагода, што ўскалыхне палітычную сытуацыю ў Беларусі. Па-другое, Пазьняк ня будзе гуляць па ўладных сцэнарах і можа вывесьці людзей на вуліцу.

Наяўнасьць у выбарчых бюлетэнях прозьвішча Мілінкевіча стане аргумэнтам для Захаду, што выбары адбываліся дэмакратычна. Наяўнасьць прозьвішчаў Мілінкевіча і Казуліна будзе расьцягваць галасы дэмакратычнага электарату. Сытуацыя, калі яны здымуць свае кандыдатуры з выбараў, для ўлады непажаданая. Для гэтага і існуе Гайдукевіч — каб выбары былі легітымныя.

У 2001 г. Гайдукевіч атрымаў каля 3% галасоў — прыкладна столькі ж, колькі сабраў подпісаў за сябе. Але тыя выбары дазволілі стаць яму фігурай нацыянальнага маштабу. Ён трэці палітык па пазнавальнасьці сярод выбарцаў, згодна з апытаньнямі, якія ладзяць незалежныя сацыёлягі на чале з прафэсарам Алегам Манаевым. На першым месцы ідзе Лукашэнка, на другім — Пазьняк, на трэцім — Гайдукевіч, на чацьвертым (цяпер ужо) — Мілінкевіч».

### Кірыла Жываловіч: «Як грамадзянін, я мару»

«Як грамадзянін, я мару, каб праз два месяцы мы жылі ў краіне без Лукашэнкі. Але па выніках гэтай падпісной кампаніі можна сказаць нават і без падліку галасоў, што ў першым туры прэзыдэнцкіх выбараў пераможа Лукашэнка — паводле вэрсіі Цэнтравыбаркаму. У дэмакратычных кандыдатаў няма ні часу, ні магчымасьцяў схіліць шалі на сваю карысьць.

Пасьля выбараў дзейны прэзыдэнт будзе мець яшчэ больш паўнамоцтваў. Але ёсьць тое, пра што сёньня ніхто не гаворыць: дэмакратычныя сілы ўжо могуць паказацца перад усімі як згуртаваная супольнасьць. У шэрагах апазыцыі за сьпінамі вэтэранаў ужо праглядаецца моладзь, якая зможа перамагчы Лукашэнку. Праўда, адбудзецца гэта, на жаль, нават не ў 2011 годзе...

Галоўнае пытаньне, якое пакуль не агучваецца нікім: куды сыдзе Лукашэнка — на Дошку гонару, у турэмную камэру, на пэнсію? Адказ на гэтае пытаньне залежыць ад той моладзі, якая ёсьць у дэмакратычных сілаў».

### Юры Чавусаў: «Роля каманды будзе ўзрастаць»

«Я б не казаў, што збор подпісаў ідзе марудней, чым чакалася. Ня трэба сур'ёзна браць пад увагу мэты, пра якія гучна абвяшчалася, — найчасьцей за ўсё гэта ня болей чым піяр. Штаб адзінага кандыдата задаволены тэмпамі збору подпісаў. Яны набралі крэйсэрскую хуткасьць і складаюць прыблізна па 10 тыс. подпісаў за дзень.

Галоўнае адрозьненьне, якое адчуваецца ў параўнаньні з кампаніяй 2001 году, — гэта тое, што ёсьць адзіны кандыдат. І людзі ўспрымаюць Мілінкевіча як адзінага. Тады ж — памятаеце? — збор подпісаў ішоў адначасова і за Домаша, і за Ганчарыка. А цяпер пытаньне «Хто акрамя Лукашэнкі?» перад намі не стаіць, мы маем цьвёрды адказ: Мілінкевіч.

Натуральна, што агучаныя на сёньня 140 тыс. подпісаў — гэта «брудная» лічба. Іх яшчэ будуць пераправяраць, каб потым ня выкрасьліла

ЦВК. Таму «ўсушка» непазьбежная.

У 2001 г. адразу некалькі кандыдатаў заявілі, што яны сабралі 100 тыс. подпісаў (і нават група паважанага Зянона Пазьняка зрабіла такую заяву). Але потым высьветлілася, што гэта не зусім так. Такія заявы таксама варта разглядаць як элемэнт піярбарацьбы. Прыгадайце хіба, што першым пра 100 тыс. подпісаў заявіў старшыня ЛДПБ Гайдукевіч. Да такога кшталту заяваў трэба ставіцца асьцярожна.

Наконт кароткатэрміновай пэрспэктывы, то бок самой падпісной кампаніі. 100 тыс. подпісаў Мілінкевіч зьбярэ. Думаю, некаторыя іншыя дэмакратычныя кандыдаты таксама могуць сабраць такую колькасьць. Вельмі сур'ёзна і адказна дзейнічае група Казуліна — думаю, ёй удасца сабраць неабходную колькасьць. Ведаючы ролю Гайдукевіча, можна не сумнявацца, што і ён зьбярэ. Фаварыты гонкі ўжо вызначыліся: Мілінкевіч, Казулін, Гайдукевіч, магчыма — Пазьняк.

У сярэднетэрміновай пэрспэктыве (г.зн. усёй выбарчай кампаніі) трэба разумець адно: усе кандыдаты, апрача Мілінкевіча, будуць у Лукашэнкавай батлейцы выконваць ролю, якую адыгрываў Гайдукевіч у выбарах 2001 г. Наяўнасьць іх дае ўладам магчымасьць нэўтралізаваць фаварыта прэзыдэнцкіх выбараў, адзінага кандыдата.

Пра доўгатэрміновую пэрспэктыву, пасьля выбараў, меркаваць цяжка. Можна зазначыць, што ў асобе Мілінкевіча мы атрымалі агульнанацыянальнага лідэра дэмакратычных сілаў, які здольны і дзяржаву ачоліць, і аб'яднаць кааліцыю гэтых самых дэмакратычных сілаў. Думаю, непазьбежна будзе ўзрастаць роля каманды, якая выбрала Мілінкевіча, — не ягонага выбарчага штабу, а менавіта каманды».

### Лявон Баршчэўскі: «Пасыўнасьць моладзі ўражвае»

«Вялікая колькасьць подпісаў за Лукашэнку мае ўзвышаць уладу ў яе вачах і ўмацоўваць яе ў ейным жа інфармацыйным полі. Уладу менш цікавіць меркаваньне замежжа, у тым ліку Расеі, дзе мільённая колькасьць подпісаў напэўна выкліча іронію і кпіны. Ёй важная легітымізацыя свайго існаваньня ўнутры беларускага грамадзтва і асабліва ў сваіх уласных вачах.

Павольны збор подпісаў за адзінага сьведчыць перадусім пра тое, што ўладзе ўдалося зрабіць людзей цынічна-апалітычнымі, што заўжды на руку дзейнай уладзе. Памылкай апазыцыі быў разьлік на маладэ электарат: пакаленьне маладзейшых за 30 аказалася апалітычнае цалкам. Яго пасіўнасьць уражвае.

Акрамя Лукашэнкі, Мілінкевіча й Пазьняка, ніводзін іншы кандыдат ня мае шырокай вядомасьці і шанцаў выйграць. І іхны ўдзел у палітычным жыцьці грунтуецца на мабілізацыі фінансавых і іншых рэсурсаў, якія паходзяць ад тых сілаў, што зацікаўленыя, каб адзіны не застаўся адзіным».

**Апытваў Аркадзь Шанскі**

**Зробім высновы і прагнозы. Віктар Шэйман хоча даказаць шэфу сваю адміністрацыйную звышэфэктыўнасьць. Таму ўпершыню падтрымка сёньняшняга курсу будзе падмацаваная таталітарнымі лічбамі ў два, а можа нават тры мільёны подпісаў.**

**Зянон Пазьняк шчыра змагаецца за збор ста тысячаў подпісаў. Ягоную справу ўскладняе адсутнасьць структураў у многіх рэгіёнах і непрысутнасьць палкаводца на полі бітвы.**

**Кандыдаты, якія зьбіраюць подпісы, не адрасуючыся ні да якой канкрэтнай сацыяльнай ці культурнай групы, здаецца, найбольш заклапочаныя тым, каб не нанесьці выпадкам шкоды электарату галоўнакамандуючага.**

**Лічба 200—250 тысячаў подпісаў за адзінага кандыдата сьведчыць пра прынцыповую сумленнасьць ягонай каманды, але і пра адсутнасьць у дэмакратаў прыхаванага фінансавага ці іншага рэсурсу. Маем тое, што маем.**

# Зацьверджаны слоган кампаніі Мілінкевіча

— «Свабода. Праўда. Справядлівасьць».

Яго выбралі сярод пяцідзесяці варыянтаў, што надышлі ад сяброў штабу і прыхільнікаў кандыдата. Адна група выступала за канцэпцыю крокаў наперад: «Пойдзем далей, захаваўшы добрае», «Не прыпыняючыся на дасягнутым», «Час ісьці наперад». Другая прапаноўвала спалучыць слова «Беларусь», якое як асноўнае ў сваіх слоганах вось ужо 5 год выкарыстоўвае Аляксандар Лукашэнка, і дадаць да яго нешта новае: «Новая Беларусь», «За новую Беларусь», «За новую Беларусь, за новыя магчымасьці», «За свабодную і квітнеючую Беларусь» (замест слогану Лукашэнкі «За моцную і квітнеючую Беларусь», што нагадвае сытуацыю зь лёзунгам Уладзімера Ганчарыка ў 2001 годзе, калі ў вядомым выразе «Мір вашаму дому» слова «мір» памянялі на «дабро»). Была нават прапанова скарыстаць лёзунг Лукашэнкі, не мяняючы яго ўвогуле: «За Беларусь».

Трэцяя група выказала меркаваньне, што ў лёзунгу ўжо павінна быць слова «прэзыдэнт» на манер леташніх польскіх выбараў, дзе яго выкарысталі абодва лідэры перадвыбарчай гонкі — Лех Качыньскі й Дональд Туск: «Прэзыдэнт, якім вы будзеце ганарыцца», «Новы прэзыдэнт — лепшае жыцьцё», «Прэзыдэнт, які пераможа», «Прэзыдэнт, зь якім пераможа Беларусь», «Прэзыдэнт, за якога ня будзе сорамна».

У іншых зьявілася ідэя аб'яднаць словы «Беларусь» і «прэзыдэнт». Выйшла: «Новы прэзыдэнт — свабодная Беларусь».

Нарэшце, чацьвертая група выступала за акцэнт на слове «свабода», дадаўшы да яго іншыя падставовыя вартасьці, на якіх Мілінкевіч стаіць. Сярод варыянтаў фігуравалі «Выбар свабодных людзей», «Разам да свабоды», «Свабода. Годнасьць. Разьвіцьцё» і г.д.

Фігуравала ў спрэчках таксама й слова «вясна».

Сабраліся праз тыдзень, правёўшы слёганы праз фокус-групы. Няўмольная сацыялёгія паказала, што чатыры словы ў слогане — замнога. Сьпярша азначыліся з галоўным словам. Ім стала «свабода». Неяк адразу ўсім спадабалася «справядлівасьць». Але да кансэнсусу не прыйшлі. Давялося праводзіць яшчэ адзін маніторынг. Ён выявіў, што, акрамя свабоды і справядлівасьці, многім людзям не стае праўды. Так склаўся лёзунг.

**Зьміцер Дрыгайла**

# Беларускае? Канфіскаваць!

На памежным пераходзе «Бераставіца» затрымалі трох грамадзян Беларусі, якія вярталіся зь Беластоку. Падстава — кнігі ў салёне аўто.

Уладзімер Цярохін і яго сябры і не падазравалі, што гістарычную літаратуру, якая легальна выдаецца і распаўсюджваецца на тэрыторыі Польшчы і Беларусі, нельга правозіць праз мяжу. Кожны з затрыманых меў пры сабе камплект зь дзевяці кніжак і часопісаў (кожнай па адным асобніку), якія яны атрымалі ад сяброў Беларускага гістарычнага таварыства ў Беластоку. Сярод кніг — «Доўгая сьмерць Крынак» С.Яновіча, «СБМ. Вяртаньне з забыцьця» Ц.Клыкоўскай, «Кара за служэньне народу» М.Пецюкевіча, «Дванаццатка» Я.Запрудніка .

Спачатку мытнік, убачыўшы кнігі, пабег кансультавацца з начальствам. Вярнуўшыся, загадаў адагнаць машыну на «яму». Там ужо аўто аглеДзелі дасканала, кажа У.Цярохін.

Пасьля нагляду мужчынаў дапыталі. «Дзе ўзялі кнігі? Каму везьлі? Ці чыталі самі?» Супрацоўнік мытні тав.Кавальчук дрэнна валодаў беларускай. Таму складаньне пратаколаў расьцягнулася на тры гадзіны, да самае раніцы. Уцямна растлумачыць прычыну канфіскацыі літаратуры мытнікі ня здолелі, спаслаўшыся на загад начальства і на тое, што ў зборніку матэрыялаў «Наш радавод» утрымліваюцца зьняважлівыя зьвесткі пра прэзыдэнта Беларусі. «Зьнявагай» аказалася меркаваньне пра тое, што Лукашэнка дрэнна выказваецца на адрас палякаў.

Сябры БГТ накіравалі лісты пратэсту на адрас пасла ў Варшаве Паўла Латушкі ў сувязі з канфіскацыяй іх выданьняў на мяжы.

**Адзін з пацярпелых**

# Беларусы Кракава згуртаваліся

Суполка называецца «Люблю Беларусь».

Цяжка было лічыць сябе беларусам і адчуваць, што ты адзін. Нават калі гэта старажытны, непаўторна прыгожы Кракаў. Калі ўжо было зусім дрэнна, ты ішла ў Ягелёнскі ўнівэрсытэт да мэмарыяльнай дошкі Скарыну, напампоўваючы сваю сьвядомасьць ціхім гонарам, што дасьць табе сілаў трымацца... Потым ліхаманкава праглядала аб’явы — можа, ёсьць канцэрт беларускага гурту ці беларускае спатканьне. І колькі было радасьці, калі ладзілася нейкая беларуская імпрэза...

У апошнія гады сытуацыя зьмянілася. Інтэнсыфікавалася дзейнасьць беларусаў у Кракаве. Усё больш канцэртаў беларускай музыкі, праводзяцца Дні беларускай культуры. У 16-ты дзень месяца праходзяць Дні салідарнасьці. На галоўнай плошчы а 20-й гадзіне па менскім часе запальваюцца белыя і чырвоныя зьнічы ў знак падтрымкі. Нарэшце, зарганізавалася суполка беларусаў.

«Люблю Беларусь» — рэлігійна-культурная група, якая яднае беларусаў і тых, хто нейк цікавіцца яе культурай. Супольная малітва па-беларуску ў касьцёле, сьпяваньне «Магутнага Божа» і гутаркі — ад гісторыі хрысьціянства на Беларусі да сучаснай беларускай культуры і агульначалавечых праблем. На сустрэчы зьбіраюцца вельмі розныя людзі рознага веку, розных зацікаўленьняў, веравызнаньня... Але яднае ўсіх тая частачка Беларусі, якую кожны носіць у сваім сэрцы. І кожная сустрэча прыносіць нязвыклае пачуцьцё споўненасьці і шчырай радасьці, узмацняе веру і распальвае ў сэрцы агеньчык надзеі.

У найбліжэйшых плянах — беларускамоўная імша, супольныя выправы, спатканьне зь літаратарамі, імпрэза з паказам беларускага фільму і музыкай...

Магчыма, «Люблю Беларусь» зь цягам часу стане часткай падмурку ў будаўніцтве нечага вялікага. Пакуль на кожнае спатканьне прыходзіць усё больш і больш людзей, і чакаеш пятніцы як сьвята... Бо ў пятніцу пойдзеш на Столярскую, 12 — там чакаюць свае...

**Натальля Місюк, Кракаў**

## СЬЦІСЛА

### Падпіска – справа дзяржаўная

Індывідуальных падпісчыкаў на дзяржпрэсу, нягледзячы на адносна нізкія кошты, не прыбаўляецца. Хоць маляўнічымі плякатамі «Советской Белоруссии» завешаныя ўсе шыбы ў будынку галоўпаштамту ды гарадзкія рэклямныя тумбы. Але падпіска на дзяржаўную прэсу — адна з галоўных задачаў вэртыкалі. Чынавенства добра памятае запавет Леніна аб газэце «як калектыўным арганізатару і прапагандысту», ролю якога ў выбарчы год цяжка пераацаніць. Таму на што іншае ў бюджэтных установах грошай не стае, а на падпіску заўсягды знойдуцца.

### Крадзеж году

У аршанскай краме «Мэта» скралі «Кнігу заўваг і прапаноў». Калі мясцовыя пінкертоны ня знойдуць пакражы, пацерпіць кіраўнік крамы, у адпаведнасьці з дэкрэтам прэзыдэнта «Аб удасканаленьні работы з насельніцтвам», ён будзе пакараны штрафам у памеры ад 4 да 10 базавых велічыняў. Цана кнігі — 1 500 руб.

### Міні-інтэрнат для асуджаных

У Якаўлевічах (Аршаншчына) адчынілі інтэрнат для састарэлых і інвалідаў. Тут будуць дажываць век 70 былых асуджаных, што ня маюць даху над галавой. Новы інтэрнат — самы малы ў вобласьці, астатнія 14 разьлічаныя больш як на сто насельнікаў. Такім чынам, на Аршаншчыне выконваюцца сацыяльныя стандарты: па 7 м$^2$ на чалавека.

### Зь цягніка на аўтобус

У Воршы сёлета пачнуць будаваць новы аўтавакзал, які разьмесьціцца побач з чыгуначным. Цяперашні аўтавакзал знаходзіцца на паўночным ускрайку Воршы і паціху прыходзіць у занепад — за апошнія гады значна скараціўся пасажырапаток, а ад таго й прыбыткі транспартнікаў на тое, каб годна ўтрымліваць вялізны будынак.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

# Ахвяраваньні ад падпісчыкаў

Вялікі дзякуй Анатолю П., які ахвяраваў 150 тыс., Р.Г. зь Менску, якая ахвяравала 200 тыс. рублёў.

Таксама дзякуй за ахвяраваньні:

Марыі Н. і Сьцяпану Б. зь Менскага раёну.
Ігару П., Уладзімеру М. з Маладэчна.
І.Г. з Смалявічаў.
Андрэю А. з Крупак.
Зьмітру Б. з Валожынскага раёну.
Людміле Р. з Капыльскага раёну.
Віктару Н. з Пухавіцкага раёну.
Антону Т. з Жодзіна.
Дз.Т. з Салігорску.
Рэгіне Д. з Барысава.
М.Т., Натальлі Б., Аляксандру Б., Андрэю В., Юр'ю Г., Канстанціну Ж. з Горадні.
Антону Б., П.Ц. зь Ліды.
Гражыне К. зь Бярозаўкі.
Алегу Р., Васілю М. з Мастоў.
Аркадзю Г. з Смургонскага раёну.
Ігару М. зь Дзятлаўскага раёну.
Анатолю Г., В.Р., Мікалаю Р., Рыгору Л., Віктару А. з Гомелю.
Мікалаю Л. з Гомельскага раёну.
Леаніду Р. з Рэчыцы.
Міколе Б. зь Сьветлагорскага раёну.

**Рэшта сьпісу ахвярадаўцаў будзе друкавацца ў наступных нумарах. Чытачы, якія пералічылі ахвяраваньні ў разьліку толькі на адзін месяц, паклапаціцеся пра грошы на выхад «НН» у наступныя месяцы.**

### Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла вам запозьнена. Рэч у тым, што вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. А квіток ахвяраваньня трапляе да нас толькі праз 3—10 дзён.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя: **3015 212 000 012** | Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир
Плательщик

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя: **3015 212 000 012** | Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

**КВИТАНЦИЯ**

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир М.П.
Плательщик

### Ці трэба паўторна дасылаць адрасы ў Рэдакцыю?

Не, аднойчы даслаўшы, больш ня трэба (калі вы рэгулярна атрымліваеце газэту). Тады досыць не забывацца рэгулярна пералічаць ахвяраваньні.

### Калі вы не атрымалі газэты

да панядзелка ўключна, а ў Менску — да суботы ўключна, канечне тэлефануйце ў Рэдакцыю.
**ПЫТАЦЦА АЛЯКСАНДРУ.**
Тэлефоны:
(017) 284-73-29
(029) 618-54-84
(029) 260-78-32

### На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» — 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

# Увазе падпісчыкаў «НН»!!!

Некаторыя падпісчыкі «НН» пералічылі ахвяраваньні, але не даслалі адрасоў, абмежаваўшыся імёнамі. Так вы газэты не атрымаеце, даражэнькія. Вы, мусіць, думаеце, што вас уся краіна ведае. Не заўжды гэта так.

**Георгі Мікалаевіч зь вёскі Ранчыцы,** дашліце дакладны адрас, назву раёну й вобласьці. **Зьміцер К., Натальля А., Лідзія К. зь Менску,** што пералічылі ахвяраваньні, мы ня ведаем Вашых адрасоў. **Сп.Астроўскі з Аршанскага раёну,** як дакладна называецца Ваша вёска? **Леанід Мікалаевіч Н. з вул.Калініна,** калі ласка, паведаміце свой дакладны адрас. **Ахрамчук В.Г.,** калі ласка, дашліце свой адрас. **Алеся Юр'еўна М.** з Наваполацку, зь якой Вы вуліцы?

Пакідаючы жарты, кажам вам вялікі дзякуй, чытачы «НН». Вы аказаліся сапраўднымі грамадзянамі. З новага году падпісчыкаў «НН» паболела на 320, прычым адрасы й квіткі надыходзяць а надыходзяць.

Даць рады такой плыні няпроста. Таму будзьце ласкавы на будучыню дасылаць разборлівы й поўны адрас. Выконвайце наступныя парады:

## Правілы падачы адрасоў:

Абавязкова падавайце індэкс, бо зь індэксам газэта дойдзе хутчэй.

Калі вы жывяце ў вёсцы ці ў мястэчку, пазначайце раён і вобласьць.

Ня трэба дасылаць квіток, пакіньце яго ў сябе, гэта вашае пацьверджаньне таго, што вы зрабілі ахвяраваньне.

Разборліва падавайце свае зьвесткі.

Атрымліваць газэту можна зь любога нумару, толькі паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас.

## Дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

1) Просім усіх чытачоў «Нашай Нівы» **дасылаць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны.**
Т.: (017) 284-73-29, (029) 707-73-29, (029) 618-54-84, e-mail: nn@promedia.by, а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас.**
Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

# Падарожжа ў сэрца

Аляксандар Мілінкевіч пабываў у Маладэчне й Вілейцы.

Аляксандар Мілінкевіч парушыў традыцыю «сядзець дома» ў выходныя. Радыкальнае скарачэньне часу падрыхтоўкі да выбараў не дае магчымасьці рабіць паўзы. Усе хібы й выгоды ўікэндаўскіх ваяжоў паказаў нядзельны выезд у сэрца беларускага нацыянальнага руху пачатку XX ст. — Маладэчна й Вялейку.

Для нацыянальнага кандыдата было важна даведацца пра настроі ў рэгіёне, які даў беларусам Янку Купалу, прэзыдэнта БНР Міколу Абрамчыка і, дарэчы, легендарнага рэдактара «НН» Аляксандра Ўласава. Паколькі прадпрыемствы й навучальныя ўстановы не працавалі, мэтавай тэрыторыяй былі рынкі.

Пасьяховасьць паездак толькі ў другую чаргу залежыць ад здольнасьцяў госьця. Галоўнае — падрыхтоўка на месцы. Сумневы, што справа выгарыць, зьявіліся, калі быў прызначаны надта раньні час старту зь Менску. У Маладэчне былі ўжо а 10-й. На харчовы рынак цягнуліся пераважна сталыя людзі са стомленымі тварамі. Пікет па зборы подпісаў за Мілінкевіча стаяў насупраць галоўнага ўваходу, але па іншы бок дарогі і за сьпінамі незарганізаваных гандляроў амаль зьліваўся зь мясцовасьцю. Нешматлікія мінакі збольшага не зьвярталі ўвагі альбо азіраліся ды перашэптваліся. Не сказаць, каб Мілінкевіч гутарыў толькі з арганізатарамі, але і пра масавае зацікаўленьне ягонай асобай сьцьвярджаць не выпадала.

Крыху жывей было, калі пайшлі па рынку. Гандляры на кантакт ішлі ахвотна і праблемаў не хавалі. Заробкі нізкія, падаткі высокія, нарматыўная база мяняецца штомесяц. Выслухаўшы аднаго прадпрымальніка, Мілінкевіч ішоў да іншага, а за ім на некаторай адлегласьці шкандыбалі спэцслужбоўцы. З новага году ў іх новая тактыка: не замінаць, каб не рэкламаваць, але па-ранейшаму ўсё адсочваць, «напрацоўваць базу» дзеля далейшых высноваў. Адзін назірае, іншы высьвятляе, пра што пытаўся прэтэндэнт — падзел працы.

На выхадзе Мілінкевіч набыў у баявой гандляркі дзьве рыбіны-чырвонапёркі.

Паехалі на рэчавы рынак. Месца пікету здавалася ідэальным: за тры мэтры — уваход, за два — абменны пункт. Аднак ў вачох пакупцоў пытаньне: хто гэта? Троху людзей назьбіралася, але выснова была несуцяшальная. Пасьля сыходу Генадзя Карпенкі ў Маладэчне сканаў ня толькі футбол, але і грамадзкае жыцьцё, разварушыць якое сілаў не хапае.

Апрацаваўшы рынкі, Мілінкевіч усклаў кветкі да помнікаў Міхалу Агінскаму, Міколу Ермаловічу і «Пакутнікам за волю і незалежнасьць Беларусі». «Вось што ў нас заўсёды бездакорна, дык гэта ўскладаньне кветак», — заўважыў нехта.

На шляху да Вялейкі абмяркоўвалі ўбачанае. Пра эфэктыўнасьць не было і гаворкі, але карыснасьць досьведу такіх паездак сумневу не падлягала. Пагатоў менавіта ў Маладэчне ад прадстаўніка каманды Аляксандра Казуліна прагучала прапанова пасьля здачы подпісаў сесьці за стол перамоваў. Намесьнік старшыні БСДП(Г) Аляксей Кароль таксама адсочваў візыт Мілінкевіча ў свой горад. Зь іншага боку, падчас працы ў тых ці іншых партыйных структурах Кароль часьцяком быў «асобнай думкай»…

У Вялейцы — зноў рынак, зноў пікет па зборы подпісаў. Ад Маладэчна — адно невялічкае, але вырашальнае адрозьненьне: абʼява, што а 13.00 будзе адзіны, які адкажа на ўсе пытаньні. Хутка вакол Мілінкевіча сабралося амаль 80 чалавек. Размова доўжылася больш за паўгадзіны. Аб самых высокіх цэнах на харч у рэгіёне, аб заняпадзе некалі вядомага на ўвесь Саюз «Зэніту», аб спойваньні моладзі, беспрацоўі, адʼезьдзе на чужыну па заробкі, аб адсутнасьці пэрспэктываў. Адным словам, аб эканоміцы абсурду, якая афіцыйна завецца цудам.

Мілінкевіч чарговы раз пераканаўся, што акцэнт трэба рабіць ня толькі на адсутнасьці свабоды й альтэрнатывы, але і на праvалах у эканоміцы, якія добра відаць за межамі МКАД. Каманда адзінага на пачатку палітычнай кампаніі здавалася закладніцай пабудаваных уладай мітаў: цяжка, маўляў, штосьці супрацьпаставіць Лукашэнку ў эканоміцы, дабрабыт нібыта расьце. «У чыноўнікаў заробкі па тысячы даляраў, у нас — 170 тыс., толькі рублёў, а ў сярэднім і атрымліваецца $250, — заўважыла адна вялейская кабета, што прыйшла на сустрэчу. Анэкдот адзінага пра тое, як адзін беларус хацеў пажыць хаця б дзень у той Беларусі, што паказваюць па тэлебачаньні, быў сустрэты на рынку гучным рогатам.

Размовы з дэмакратычным актывам абодвух гарадоў паказалі, што ў Мілінкевіча застаецца яшчэ адзін сурʼёзны праціўнік — расчараваньне. Нават сваім давялося пацьвярджаць, што пасьля выбараў у выпадку няўдачы ён не саскочa.

«Даю слова: я не зьбягу ніколі, нават калі будзе пагражаць турма», — Мілінкевічу прыйшлося паўтарыць гэтае абяцаньне.

**Зьміцер Уласаў**

## Мілінкевіч накіруецца ў Варшаву і Шчучын

**Канец гэтага тыдня Аляксандар Мілінкевіч праводзіць у Гарадзенскай вобласьці: у пятніцу — у Шчучыне, у суботу — у Горадні. У гэтых гарадох, апроч сустрэчаў з грамадзянамі, Мілінкевіч таксама зьбярэ дакумэнты, неабходныя для падачы дэклярацыі аб даходах.**

**Увесь наступны тыдзень адзіны прэтэндэнт ад дэмакратычных сілаў будзе за мяжой. Спачатку ён накіруецца ў Варшаву, дзе чакаецца ягоная сустрэча з прэзыдэнтам суседняй краіны Лехам Качыньскім. Адтуль Мілінкевіч вылеціць у Страсбург, каб выступіць на спэцыяльным паседжаньні Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы, прысьвечаным Беларусі. Цікава, што апроч Мілінкевіча на гэтае паседжаньне запрошаны блізкі сябар А.Лукашэнкі Ўладзімер Канаплёў.**

**ЗД**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Высланы на поўнач Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Палігон

Ад вялікай зямлі Малое Сітна аддзяляе палігон. Агромністая балоцістая пустка, калісьці выкарчаваная, а цяпер зарослая падлескам, займае плошчу памерам зь Менск.

Кажуць, што стрэльбішчы пад Дрэтуньню былі і да вайны. Але менавіта пасьля ІІ сусьветнай, што перацякла ў вайну халодную, у Крамлі вырашылі, што лепшае месца для адпрацоўкі танкавых прарываў у Заходнюю Эўропу — у старажытным сэрцы Беларусі. Так у акупацыйнай зоне 1563—1578 гадоў, аточанай фарпостамі Івана Жахлівага — Казьянамі, Сокалам, Сітнам — паўстаў палігон.

Старажылы згадваюць, што для палігону адсялілі тры сельсаветы вёсак. Лес бязьлітасна валілі. Балацявіны ў басэйне Палаты загацілі адборным дрэвам. Прыежджыя кітайцы ў жаху хапаліся за галовы: аддайце лес нам, мы вам колькі хочаце бэтону прывязём. Але ў «самай мірнай краіне» не лічыліся ані з выдаткамі, ані з прыродаю, ані з думкаю «братоў меншых». У цэнтры Палігону адгрохалі шыкоўны камандны пункт з падземнымі паверхамі, гатэлем і рэстарацыяй; набудавалі бункераў, кашараў, нарабілі мішэняў ды муляжоў. Засталося толькі аддаць каманду: зараджай... цэлься... агонь!

Калі на палігоне бахалі гарматы, у Малым Сітне ды навакольных вёсках выляталі шыбы. Чыгунныя балванкі са сьвістам расьсякалі паветра па-над хатамі, паражаючы «зададзеныя мэты» ў навакольных лясох, і прымушалі вяскоўцаў прысядаць на кукішкі, гадаючы: ці слушна разьлічылі там генэралы, а то зараз як шарахне!.. Мужыкі з гонарам распавядуць, як за часамі Машэрава на вучэньні краінаў Варшаўскага пакту сюды зьехаліся савецкі міністар абароны Грэчка, лідэр ГДР Хонэкер ды Войцех Ярузэльскі. Дзесьці ў 1970-х на вайсковыя зборы на Дрэтуньскі палігон выклікалі як рэзэрвіста і майго бацьку.

Тыя зь мясцовых, хто хадзіў на палігон у грыбы-ягады ў 1980-х, раскажуць, як вайсковыя вэрталётчыкі, выканаўшы «пастаўленую задачу» зь мінімумам боекамплекту, разварочваліся над

## ХРОНІКА

### Галадоўкі

**Сяргей Скрабец** 10 студзеня абвясьціў галадоўку. Ён патрабуе, каб яго выпусьцілі пад падпіску аб нявыезьдзе на час удзелу ў выбарах. Суд над палітыкам пачаўся 16 студзеня.

У Калінкавічах з 16 сьнежня галадае чарнобыльскі ліквідатар **Васіль Сіліверст**. Ён дамагаецца, каб прызналі прычынай захворваньняў і інваліднасьці ягоны ўдзел у ліквідацыі вынікаў катастрофы.

### Прэса вочы коле

Віцебская «Белпошта» 10 студзеня адмовілася распаўсюджваць недзяржаўны **«Віцебскі кур'ер»** адразу па выхадзе першага нумару за 2006 год.

11 студзеня каля рэдакцыі **«Народнай Волі»** сілавыя структуры выставілі пост.

У Ваўкавыску 12 студзеня міліцыянты затрымалі распаўсюдніцу **«Местной газеты» Маргарыту Макавей**, сканфіскавалі 69 асобнікаў выданьня, хоць яна мела ўсе неабходныя дакумэнты.

**Фёдара Поляка** затрымалі 12 студзеня ў Сьветлагорску за тое, што ў яго ў руках была газэта **«Рэгіянальныя навіны»**.

16 студзеня на расейскай мяжы арыштаваны наклад незалежнай газэты **«Вольны горад»**: яе везьлі з Смаленску ў Крычаў.

### Пастка для Зубра

Актывіста моладзевага руху **Аляксандра Казакова** 10 студзеня выклікалі на допыт у менскую пракуратуру: на яго й **Зьмітра Зубра** завялі крымінальную справу «за супраціў работнікам міліцыі ў часе затрыманьня». Казакову падчас затрыманьня зламалі нос.

14 студзеня ў Менску ля кінатэатру «Перамога» затрымалі 10 грамадзянаў Расеі, у тым ліку прадстаўніка студэнцкага руху «Я думаю» **Івана Ніненка**, а таксама менчукоў **Вадзіма Місюка** і **Ігара Помаза**. Іх зьвінавацілі ў нанясеньні графіці «антыпрэзыдэнцкага характару». Чацьвёра з масквічоў належаць да гурту «CWWTP», які меўся ўдзельнічаць у канцэрце ў сталічным клюбе.

У Гомелі 16 студзеня на 15 сутак асуджаны **Сяргей Хасьцічэнка** за «антыдзяржаўныя» графіці.

### Хоме адмовілі

Выключаная з БДЭУ актывістка студэнцкага руху **Тацяна Хома** 12 студзеня атрымала адказ зь Мінадукацыі на скаргу: міністэрства лічыць, што студэнтка-выдатніца «рэгулярна парушала ўнутраную дысцыпліну ўнівэрсытэту».

### Беды Лябедзькі

Лідэра АГП **Анатоля Лябедзькі** 9 студзеня чатыры разы надглядалі на дзяржаўнай мяжы.

### Чэскіх сэнатараў не пусьцілі ў Беларусь

Чэскім сэнатарам **Карлу Шварцэнбэргу** і **Ярaміру Шцеціну** беларуская амбасада 13 студзеня адмовіла ў візах без афіцыйнага тлумачэньня.

### Тузаюць актывістаў Пазьняка...

7 студзеня ў Лідзе падчас збору подпісаў затрымалі **Ўладзімера Хрышчановіча**: на яго склалі пратакол пра адміністрацыйнае парушэньне.

У в.Вароны (Віцебскі р-н) 9 студзеня трое невядомых у цывільным спрабавалі ўварвацца ў дом **Уладзімера Плешчанкі**, чальца ініцыятыўнай групы лідэра КХП-БНФ.

У Менску 11 студзеня міліцыянты затрымалі зьбіральніцу подпісаў **Алу Гуцаву**: на яе склалі пратакол, заявіўшы, што забаронена зьбіраць подпісы ля мэтро. 12 студзеня ля мэтро затрымалі **Валер'я Забродзіна**.

### ...Мілінкевіча

Выхавацельку рабочага інтэрнату віцебскага прадпрыемства «КІМ» **Ніну Кавалёву** 9 студзеня змусілі напісаць заяву на звальненьне: ёй прапанавалі расклад працы, што ёе не задавальняў.

Пад Жлобінам 12 студзеня міліцыянты затрымалі аўтамабіль **Уладзімера Кацоры**, кіраўніка Гомельскага штабу адзінага: машыну агледзелі ды склалі пратакол.

У Бялынічах 11 студзеня затрымалі **Міколу Мяцеліцу**. На яго склалі пратакол: яго вінавацяць у распаўсюдзе каляндарыкаў з партрэтам Мілінкевіча.

У Касьцюковічах затрымалі **Ўладзімера Папкова**: міліцыянты заявілі, што пасьведчаньне чальца ініцыятыўнай групы можа быць фальшывае.

12 студзеня а 7.30 чальца ініцыятыўнай групы **Барыса Вырвіча** з в.Машчаніца (Бялыніцкі р-н) забралі з дому міліцыянты: яны мелі загад ад начальніка РУУС прывезьці Вырвіча на размову да старшыні райвыканкаму.

**Яўгена Скрабутана** міліцыянты затрымалі 12 студзеня на чыгуначным вакзале ў Мастах, заявіўшы, што шукаюць скрадзены ў вагоне цягніка тэлефон. Сканфіскавалі 5000 каляндарыкаў з партрэтам Мілінкевіча і відэакасэту «Звычайны прэзыдэнт».

У Полацку міліцыянты 11 студзеня спрабавалі ўварвацца ў кватэру актывісткі выбарчай групы **Леры Сом**, сьпярша вінавацячы яе, што ў кватэры шумяць, а потым — што ў кватэру насілі нейкія газэты і ўлёткі.

Пракурор Смургонскага раёну 16 студзеня выклікаў **Алеся Дзергачова**, кіраўніка раённага выбарчага штабу, і за выпуск бюлетэню «Наш Смургонскі край» вынес пісьмовае папярэджаньне «дзеля прадухіленьня магчымага парушэньня закону».

возерам Вырвіна і шугалі астатнімі ракетамі проста ў возера. Потым, прызямліўшыся, надзьмувалі гумавыя лодкі, спускаліся на ваду ды напаўнялі іх глушанай рыбай. Згадкі пра палігон часоў незалежнасьці — аповеды пра неразарваныя супрацьтанкавыя міны або праекты шушкевіцкае адлігі ператварыць камандны пункт у турбазу...

За Лукашэнкам вучэньні аднавіліся. Змрочны палігон дагэтуль застаецца дэталлю баявога мэханізму, сканструяванага імпэрыяй зла на галоўным, заходнім кірунку ўдару. Як дзясяткі прадпрыемстваў савецкае «абаронкі», як «Нафтан», што мусіў забясьпечваць палівам танкавыя армады. Як гіганцкія тутэйшыя сьвінакомплексы для бесьперабойнага харчаваньня мільённага войска. Усю Беларусь, талерантную, трапяткую, духовую, савецкая імпэрыя ўкрыжоўвала на раскрэсьленых крамлёўскімі генштабістамі плянах *III сусьветнай*.

У Вольнай Беларусі Дрэтунскі палігон можа стаць музэем савецкага мілітарызму. Усё жалезьзе, прызначанае для зьнішчэньня паловы сьвету, так і просіцца сюды. І сюды, а не на бутафорскую лінію Сталіна, трэба вазіць школьнікаў ды замежных турыстаў. Ці — правесьці на палігоне вучэньні па разьмініраваньні для «гарачых кропак» былога сацлягеру. Ці — арганізаваць манэўры эўрапейскіх міратворцаў...

Але каб уся Беларусь зноў не ператварылася ў *Палігон* для зброі, нацэленай на астатняе чалавецтва — 19 сакавіка мы абавязкова мусім перамагаць!

*в.Малое Сітна*

Прыезджыя кітайцы ў жаху хапаліся за галовы.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**У суботу, 14 студзеня, зуброўцы вывесілі над Нямігай расьцяжку з напамінам аб Дні памяці. Міліцыянты, што якраз натрапіліся побач, толькі апатычна зірнулі ў той бок — «не на працы». Так расьцяжка і правісела гадзіну.**

### ... за іншых кандыдытаў

11 студзеня ў Гомелі затрымалі **Сяргея Гапанюка** й **Алега Шабетніка**, якія зьбіралі подпісы за генэрала Валера Фралова.

Вайскоўцам з Слуцку **Н.Баранаву** і **Л.Баранавай** прапанавалі напісаць заявы пра выхад з ініцыятыўнай групы А.Казуліна, пагражаючы звальненьнем з войска.

З інтэрнату Менскага радыётэхнічнага каледжу 13 студзеня выселілі сябра ініцыятыўнай групы А.Казуліна **Арцюхова**.

Старшыня калгасу «ПСК Кашара» Рагачоўскага раёну Церашкова на сходзе 4 студзеня папярэдзіла калгасьнікаў, што за подпісы за кагосьці яшчэ акрамя Лукашэнкі іх могуць нават звольніць.

У Рагачове сябрам ініцыятыўнай групы А.Казуліна **Паўлавай** і **Фірагінай** пагражалі, што яны страцяць працу, калі будуць працягваць зьбіраць подпісы. **Спн. Нягары** ў Рагачове міліцыянт забараніў займацца зборам подпісаў, заявіўшы, што кампанія яшчэ не пачалася.

### Сем сутак арышту за хвіліну пратэсту

Праваабаронцу з Барысава **Алеся Абрамовіча** затрымалі 11 студзеня каля Адміністрацыі прэзыдэнта: ён адну хвіліну прастаяў з плякатам «Выбары без дыктатара Лукашэнкі». Суд Ленінскага раёну прысудзіў сем сутак арышту.

**АШ**

# Зь яго пачынаецца Жодзіна

У дачыненьні да 22-гадовага Паўла Красоўскага з Жодзіна заведзена крымінальная справа паводле арт.369 Крымінальнага кодэксу — абраза прадстаўнікоў улады. Абражаныя — чыноўнікі гарвыканкаму. Увечары 12 студзеня ў Паўла правяліператрус. Паводле заканадаўства хлопцу пагражае штраф альбо абмежаваньне волі да трох гадоў.
З Жодзіна — **Аркадзь Шанскі.**

Паўлу затэлефанавалі па заведзенай раней справе: бабулька аплявала ўдзельнікаў падпіснога пікету — і справу завялі на яе. **Красоўскі (на фота на старонцы 15)** адказаў, што ён пры інцыдэнце не прысутнічаў. «Добра, мы ўдакладнім і перэтэлефануем», — запэўнілі яго. Праз пяць хвілінаў шасьцёра міліцыянтаў сталі пад дзьвярыма кватэры. Яны паказалі пастанову аб распачатай у дачыненьні да хлопца крымінальнай справе. У дакумэнце гаворыцца, што Павал «рэдагаваў публічна дэманстраваны твор «Назіральнік», у якім публічна абразіў прадстаўнікоў улады, а менавіта кіраўніцтва Жодзінскага гарвыканкаму».

«Справу завялі з-за карыкатураў, што мне даслалі электроннай поштай. У іх адлюстраваныя чыноўнікі гарвыканкаму. Я вырашыў надрукаваць карыкатуры. Гэта проста гумар, у голым выглядзе чыноўнікаў ніхто не паказваў, але там былі твары», — тлумачыць Павал.

Хлопец згадвае, што міліцыянты моцна хваляваліся — першая такая справа ў Жодзіне. У Паўла захоўвалася 300 нумароў «Народнай Волі», аднак выданьне міліцыянтаў не зацікавіла. Яны забралі 32 асобнікі самвыдатаўскага «Назіральніка». Потым агледзелі шафы, паднялі матрасы на ложку, абшукалі кніжныя паліцы, спадзеючыся знайсьці як мінімум мінідрукарню. Але ў Красоўскіх дома няма нават кампутара. Усяго канфіскавалі 36 прадметаў. Сярод іх — налепкі з украінскай рэвалюцыі, налепкі кампаніі-2001 «Нацягні яго» («у цэнтры налепкі мужчынскі твар з вусамі», — пазначана ў пратаколе), налепкі «Час прыбіраць» («у цэнтры налепкі — мятла, што вымятае партрэты дзейнага прэзыдэнта»), брашуры. Пры ператрусе прысутнічаў бацька Паўла. Ён толькі іранічна зазначыў, што сухароў для сына ўжо насушыў. Пагатоў досьвед ёсьць: 10 сутак у менскім СІЗА Павал ужо сядзеў. Бацькі хвалююцца за сына, але падтрымліваюць.

У ролі панятых выступілі суседзі. Павал згадвае, што суседзі пачуваліся ніякавата: «Міліцыянты накручвалі панятых: зьвярніце ўвагу, як яны ставяцца да прэзыдэнта! Зьвярніце ўвагу, як яны ставяцца да дзяржаўнай арганізацыі — БРСМ!»

Перасьлед Красоўскага за выхад газэты «Назіральнік» пачаўся пры канцы году — калі выйшаў першы нумар. Каб аддаць позву, участковы адшукаў Паўла ў тэатры на спэктаклі. Пасьля Новага году яго запрасіў на размову загадчык аддзелу грамадзкай бясьпекі гарадзкой міліцыі Вячаслаў Ільліч. Яго цікавіла, калі выдадзена газэта, сродкі, адкуль зьяўляюцца артыкулы ў газэту, хто аўтары. Потым у прысутнасьці Паўла сабралі спэцыялістаў, якія разглядалі, якім чынам можна распачынаць справу — першы выпадак у Жодзіне. «Ільліч увесь час казаў: адмоўся ад выданьня газэты, тады справу пачынаць ня будзем. Потым пазвалі маёра Кузьняцова — начальніка папярэдняга расьследаваньня Жодзінскага ГАУС, які заявіў, што ня бачыць падстаў, каб распачаць справу».

У апошнім нумары, які Павал выдаў ужо ў якасьці кіраўніка Жодзінскага штабу Мілінкевіча, была зьмешчана інфармацыя пра месцы, дзе можна падпісацца за адзінага. Актывізацыю міліцыянтаў Красоўскі зьвязвае акурат з выбарчай кампаніяй: «Гэтым хочуць паралізаваць маю дзейнасьць, узяць падпіску аб нявыезьдзе, цягаць на допыты».

Апускаць рукі жодзінскі актывіст не зьбіраецца, пагатоў што мае падтрымку аднадумцаў: «Мы плянуем правесьці актыўную прэзыдэнцкую кампанію. Міліцыя вельмі баіцца агалоскі. Газэту чыталі, было нават 15 падпісчыкаў. Мяне як выдаўца ведаюць». Чытаюць газэту нават у міліцыі. «Быў выпадак, калі мы раскідвалі па скрынях «Назіральніка» і нарваліся на міліцыянта. Ён пагладзеў карыкатуры, пасьмяяўся, узяў у нас некалькі асобнікаў газэты», — кажа Павал.

Цяпер Красоўскі мае рабіць «Назіральніка» ў 10 варыянтах — асобныя варыянты (па 299 асобнікаў) на кожную гарадзкую выбарчую акругу. Кожны выпуск будзе мець рэдактара і выдаўца. «299 асобнікаў дастаткова, каб ахапіць вялікую частку выбарцаў у акрузе, дзе ёсьць прыкладна па 600 кватэраў. У кожным нумары будзе аднолькавая гарадзкая інфармацыя, але адрозная па гэтай акрузе: недзе вады няма, недзе з ацяпленьнем праблемы...»

На кухні жодзінскага выбарчага штабу абстаноўка спартанская: пліта, нізкі столік, канапа. Аб ногі трэцца котка Фрося. На пытаньне пра магчымую эміграцыю Павал адказвае катэгарычна: «За мяжу я не зьбіраюся. Я размаўляў з эмігрантамі ў Польшчы, бачыўся ў Варшаве з журналісткай Вольгай Класкоўскай. Яна трымаецца, але я не хацеў бы трапіць у такую складаную жыцьцёвую сытуацыю».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Пачаўся сэзон падпольных канцэртаў

«Забароненыя» рок-музыкі пачалі сэзон. На мінулым тыдні ў менскіх клюбах выступілі «Нэўра дзюбэль» і «Палац». На наступным — ва ўмовах поўнай канспірацыі сыграе «N.R.M.».

Інфармацыя пра канцэрты распаўсюджваецца выключна праз Інтэрнэт і эсэмэскі. Месца выступу называецца пры сустрэчы, калі арганізатар падпольнай імпрэзы перадае квіток гледачу. Адсутнасьць афішаў з назвай клюбу — умова, на якой кіраўніцтва аднаго зь іх пагадзілася правесьці канцэрт. Тым ня менш, у «безыменным» клюбе сабралася пад 100 чалавек. Завадатары акцыі — Dexta і Dzik — засталіся задаволеныя. «Укладзеныя грошы акупіліся, нават у плюсе засталіся», — кажа Dexta, стваральнік фэн-сайту «Нэўра дзюбэля».

Перад выступам ён абвяшчае зь невялічкай сцэны: «Гэтаму гурту 17 год. І ніхто ня мае права яго забараняць. Яны — назаўжды!» Музыкі падлучаюцца, прыхільнікі шчыльным колам атачаюць Кулінковіча і Паскуду. Яны сьпяваюць новую песьню «Край», першы падміргвае прысутным, другі абдымаецца з фэнамі. Атмасфэра поўная яднаньня музыкаў з заляй.

«Паслухайце, мы напісалі лепшую сваю песьню», — кажа Кулінковіч пра «Край». Тое самае калісьці ён казаў пра «Скрыпку дрыгвы» і «Я памру тут». Лідэр «Дзюбэлёў» прызнаецца: «Я ня звыкся зь пераходам да падпольных канцэртаў, калі гледачоў зьбіраюць па тэлефоне». Кулінковіч зацягвае «Гумавы дом». У залі — аніводнага чалавека, які б не падпяваў яму.

«Спадзяюся, што шрубы адвінцяць пасьля вядомых падзеяў, зь іншага — навошта іх адкручваць, калі машына добра працуе», — разважае Аляксандар Кулінковіч пасьля канцэрту.

Забароненыя музыкі знайшлі спосаб, як супрацьстаяць гэткай навале. Як у брэжнеўскія часы.

**Сяргей Будкін**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У панядзелак, 16 студзеня, з 18.00 да 18.15 ля менскага ЦУМу прайшоў флэш-моб. Прысутныя павязвалі джынсавыя стужачкі адзін аднаму на вопратку. Затрымалі двух «зуброў».**

# «Шостае падарожжа» Касі

У сьвежым «Тузіне гітоў» перамагла песьня, напісаная 14 гадоў таму — «Шостае падарожжа» Касі Камоцкай на словы Ігара Бабкова. Матыў мокрых валасоў, зблытаных з травой, і доўгага падарожжа ўзьнік пасьля падпісаньня маніфэсту на сходзе беларуска-кельцкага зьвязу.

Песьня, напісаная на пачатку 1990-х, зьявілася ў дэбютным альбоме групы «Новае Неба» — «Дзеці чорнага гораду», і праз 14 год увайшла ў новую праграму «Акустыка». У «сьвежым» варыянце гэты твор удзельнічае ў «Тузіне гітоў». «Шостае падарожжа» было запісана падчас канцэрту Касі разам са Славам Коранем і Юліяй Глушыцкай у менскім Доме літаратара 30 кастрычніка 2004 г. Праграма выдадзена на CD.

Аўтар словаў да «Шостага падарожжа» Ігар Бабкоў напісаў тэкст адмыслова для Касі і ніколі не публікаваў яго як верш. Некалі пры падпісаньні маніфэсту на сходзе беларуска-кельцкага зьвязу ўзьнікла патрэба ў стварэньні гімну — музычнага ўвасабленьня, заснаванага на асацыяцыях з Ірляндыяй. Так у Бабкова ўзьнік матыў. Назву твору і музыку прыдумала сама Кася.

Паэт Ігар Бабкоў кажа: «Адзін мой студэнт з ЭГУ расказваў, што даўно ўжо пачуў «Шостае падарожжа» ў адной з вандровак ад знаёмых і ўвесь час меркаваў, што гэта плён народнай творчасьці. Аказваецца, гэты твор пайшоў у сьвет...»

**SB**

ШОСТАЕ ПАДАРОЖЖА

твае валасы зблытаныя з мокрай травой
як чужы успамін жужалка паўзе па сьцяне
неспакойныя песьні вецер пяе ў трысьнягу
маладая вада шапоча аб бясконцай вайне

дык хутчэй жа вандроўнік зьбірайся ў дарогу хутчэй
на пагорках Эўропы зваяваныя сьпяць каралі
праз халодныя ночы мы пройдзем пад канвоем вачэй
і аднойчы на золку вярнемся да гэтай зямлі

сярод глогу і руты на захадзе сьпіць акіян
толькі верасу вочы сумуюць аб забытай віне
там дзе кроплі шыпшыны мы знойдзем свой пакінуты дом
там маладая вада шапоча аб бясконцай вайне

дык хутчэй жа вандроўнік зьбірайся ў дарогу хутчэй
на пагорках Эўропы зваяваныя сьпяць каралі
праз халодныя ночы мы пройдзем пад канвоем вачэй
і аднойчы на золку вярнемся да гэтай зямлі


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Кася Камоцкая сьпявае «Шостае падарожжа» Сяргею Скрабцу падчас галадоўкі дэпутатаў ППНС за зьмены ў выбарчым заканадаўстве ў чэрвені 2004 г. 16 студзеня 2006 над С.Скрабцом пачаўся суд. Яго вінавацяць у вымантачваньні крэдытаў, незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасьці і падрыхтоўцы да дачы хабару. У турме С.Скрабец вылучыўся кандыдатам на прэзыдэнцкія выбары.**

## Вынікі 8-га туру «Тузіна гітоў»

**www.music.fromby.net**

1. Кася Камоцкая, «Шостае падарожжа» — 481.
2. «IQ-48», «Сьвятло ў цемры» — 461.
3. «З.Ь.М.Я.Я.», «Чукча» — 358.
4. «Глюкі», «Ападкі» — 322.
5. «Tav.Mauzer». «Брудная вада» — 310.
6. «Палац», «Праваджала маці сына» — 265.
7. «Usplesk», «Мара» — 259.
8. «Сьцяна», «Можна быць» — 259.
9. «Žygimont VAZA», «ContraБанда» — 256.
10. «Беларускія Песьняры», «Вочы цёмна-сінія» — 252.
11. «Айша», «Зь вераю» — 183.
12. «Step», «Спалох» — 139.

Праслухаць песьні можна ў Інтэрнэце на сайце «Тузіна Гітоў» і ў радыёэтэры штопятніцы на хвалях радыё «Менск» (92,4 FM) а 23.00 у праграме «Тузін гітоў з Алегам Хаменкам».

### Увага! Рэп-конкурс!

Польская кампанія WJ Records сумесна зь Беларускай рэп-асацыяцыяй і нямецкай Aggro Berlin рыхтуе складанку «United in hip-hop». Завадатары праекту задаліся мэтай сабраць найлепшых хіп-хоп прадстаўнікоў Эўропы. Зборнік выйдзе на двух дысках (песьні і відэакліпы) і будзе прадавацца на тэрыторыі ўсіх краін — удзельніц праекту. Беларуская рэп-асацыяцыя абвяшчае конкурс сярод айчынных выканаўцаў. Да 10 сакавіка можна даслаць свой запіс на e-mail: demo@bratinfo.com і разьлічваць на ўдзел у праекце. Трэк мусіць быць **абавязкова па-беларуску**. Пераможцу вызначыць дырэкцыя WJ Records. Адзін удзельнік ад Беларусі ўжо вядомы — гэта Krou/СрВ — сольны праект лідэра групы «Чырвоным па беламу», лідэраў «Басовішча—2005».

# БДАааа, «Песьняры»...

12 студзеня на Ўсходніх могілках Менску адкрылі помнік Уладзімеру Мулявіну. Увечары ў Белдзяржфілармоніі дзяржаўныя «Песьняры» давалі сольны канцэрт памяці экс–лідэра калектыву.

На канцэрце гучалі даўно вядомыя песьні, якія сёньня выконваюцца трыма калектывамі, што прэтэндуюць на назву. Як патлумачыў музычны кіраўнік калектыву Вячаслаў Шарапаў, бліжэй да лета дзяржаўныя «Песьняры» дадуць канцэрт, які будзе складацца на 70% з новых твораў. Таму, маўляў, выступу нельга надаваць шмат увагі.

Але на канцэрце ні на хвіліну не пакідала адчуваньне, што калектыву бракуе добрага, нават нахабнага драйву. Часта даводзіцца слухаць рок-гурты, выканаўчы ўзровень якіх куды ніжэйшы, але энэргетыкі музыка выпраменьвае аж празь берагі. Вячаслаў патлумачыў гэта спэцыфікай акустыкі: калі дадаць гучнасьці, апаратура пачынае ў гэтай залі «бубнець».

«Песьняры» гучалі хоць і зладжана, але — акадэмічна. Вакал — амаль тое самае: не чуваць было нейкай «д'ябалінкі», не ставала акцэнту на арыгінальнасьць. Ці, магчыма, такое ўражаньне выклікана падсьвядомым жаданьнем параўнаць тое, што маецца, з тым, што было?

Па-другое, у канцэрце — а гэта было прыемным сюрпрызам — удзельнічалі колькі музыкаў клясычнага складу тых, самых і назаўсёды першых «Песьняроў». Падчас выкананьня «Зачаронай» на сцэне зьявіўся піяніст Аркадзь Эскін і кампазытар Ігар Лучанок, а песьня была пададзена ў інструмэнтальнай вэрсіі з джазавымі імправізацыямі. Гучалі «Алеся», «Вераніка», але ўсе гэтыя песьні не чаплялі! Гэта нібы рэмэйк «Кінг-Конга», зьняты ў нашыя дні ў Смалівудзе з выкарыстаньнем тэхнікі гадоў здымкаў «Руіны страляюць...».

Праз колькі часу на сцэне зьявіліся знакавыя постаці калектыву: піяніст Уладзімер Мікалаеў і вакаліст Анатоль Кашапараў. Абодва яны за колькі дзён да канцэрту ў Менску выступалі ў Маскве разам зь «Песьнярамі»-«Лявонамі», якіх сабраў Аляксандар Дзямешка. Кашапараў, які не пакідае занялкі музыкай у Амэрыцы, паказаў, што знаходзіцца ў добрай вакальнай форме. Прывітаўшыся з публікай па-беларуску, ён спачатку прасьпяваў з БДА «Дзяўчынаньку-сардэньку», а ўжо потым пад мінус — фірмовую мулявінскую «Крык птушкі». Вядома, не абышлося бяз «Вологды», і ўжо потым БДА сьпявалі зноў жа знаёмае: «Дорогой длинною», «Лявоніху».

Але быў адзін момант, які літаральна зваліў мяне з ног. Усе сямёра ўдзельнікаў калектыву а капэля выканалі славуты палянэз «Разьвітаньне з радзімай». Сьпявалі добра, зладжана. Толькі палянэз гучаў... на расейскай! Большай недарэчнасьці прыдумаць немагчыма! Цікава, ці паўтораць тое музыканты на заяўленым канцэрце праз пару месяцаў?

Тое, на што здатныя цяперашнія «Песьняры», цікавіць многіх. Аншляг у залі — таму доказ. Як і тое, што за сцэнай былі заўважаны і скрыпач зь першага складу «Песьняроў» Валянцін Бадзьяраў, кампазытары Алег Моўчан і Эдуард Ханок. Безумоўна, перад цяперашнім калектывам ёсьць два шляхі: альбо заставацца своеасаблівым кавэр-бэндам, перапяваючы багатую спадчыну калектыву, альбо не імкнуцца насьледаваць і капіяваць, а шукаць уласнае аблічча. Другі шлях няпросты і нават няўдзячны, але калі гэта «Песьняры» шукалі простыя дарогі? Так што нам застаецца пачакаць. Прынамсі, да лета...

**Дзьмітры Падбярэскі**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Ёка Она Ўладзімера Мулявіна — Сьвятлана Пенкіна.**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# У Беларусі, і нідзе болей

У Мастацкім музэі працуе вялікая выстава беларускіх маляваных дываноў — незвычайнага мастацтва, што ня мае аналягаў у суседніх народаў. Піша **Сяргей Харэўскі**.



**Пры жыцьці мастачка Алена Кіш была бажавольнай жабрачкай. Сёньня яе працы выстаўляюцца ў Нацыянальным музэі.**

Маляванка — расьпісаныя фарбамі посьцілкі — клясычны нацыянальны жанр. Доўгія гады ён заставаўся ў цені як жанр сакральны. Значную ролю ў зьбераджэньні традыцыяў маляванкі адыгралі Марачкін, Маркавец, Кулік. А для навукі іх адкрыў Міхась Раманюк.

Пачатак дзяржаўнае калекцыі маляваных дываноў быў пакладзены ў 1988 г. пасьля набыцьця музэем-запаведнікам «Заслаўе» маляваных дыванкоў, створаных Я.Драздовічам. Сёньня тамтэйшая калекцыя, частка якое знаходзіцца на выставе «Краіна мары. Беларуская маляванка», налічвае 200 адзінак. Гэта найперш шэдэўры мастачкі са Случчыны Алены Кіш і клясыка Я.Драздовіча. Падчас шматлікіх пошукаў маляванак супрацоўнікамі Заслаўскага музэю-запаведніку былі адкрытыя імёны некалі знаных у народзе майстроў: Фёдар Сухавіла, Канстанцін Касьпяровіч, Генадзь Кузаўкоў, Таісія Клопава, Сяргей Шурпік, Туча, Уладзімер Бука, Галіна Заяц. Іхныя творы можна ўбачыць на гэтай неардынарнай выставе незвычайнага мастацтва, што ня мае аналягаў у суседніх народаў.

Маляванкі звычайна пісалі на самаробным радне, часьцей чорнага колеру. Адвольная размалёўка фарбамі выконвалася без папярэдняга нанясеньня грунту (з гэтае прычыны помнікі гэтага мастацтва хутка нішчыліся з-за нетрываласьці).

Росквіт гэтага віду мастацтва прыпадае на сярэдзіну XX ст. Маляваныя дыванкі былі ў многіх хатах захаду й поўдня краіны. Яны купляліся, замаўляліся, але найперш вырабляліся самімі гаспадарамі. Таму былі вострa індывідуальныя.

На вобразна-сэмантычны лад беларускіх маляванак відавочна паўплывалі юдэйская традыцыя і ўкраінская арнамэнтыка. Гэтак сярод вобразаў былі распаўсюджаныя жыдоўскія сымбалі: ільвы, лебедзі, алені, часьцяком у атачэньні вінаградных гронак. У кветкавую кампазыцыю зазвычай уводзіцца геамэтрычны арнамэнт: кругі, ромбы, шматкутныя зоркі. У сэмантыцы арнамэнтальных маляванак выяўляецца водгульле культу ўрадлівасьці маці-Зямлі, для сюжэтна-тэматычных твораў характэрнае выразнае індывідуальнае ўяўленьне аб райскім жыцьці. Шырока ўжываюцца ў дыванах казачныя выявы зьвяроў ды птушак: паваў, жаўранкаў, лісаў, катоў, мядзьведзяў, зайцоў. Вельмі часта сустракаюцца й галубы — хрысьціянскі сымбаль Сьвятога Духу. Часта дываны мелі каліграфічныя ініцыялы аўтараў і ўладальнікаў, даты маляваньня.

Тыповым зьместам дываноў былі містычныя сюжэты, галоўнымі пэрсанажамі якіх выступаюць закаханыя і паляўнічыя, фальклёрныя пэрсанажы. У пачатку XX ст. у традыцыйную схему дываноў уводзяцца рамантычныя краявіды з бажніцамі й замкамі.

Адлюстраваньне на палатне ідэальных сюжэтаў дазваляла звычайнаму чалавеку ўзьнесьціся па-над буднёнасьцю й сьмяротнасьцю, апынуцца ў Краіне Мары. Трыюмф жыцьця, што перамагае сьмерць, літаральна рэалізаваўся мастаком праз росьпіс на чорным, «зямным» колеры зыркімі, «нябеснымі» фарбамі.

# Набліжэньне эпохі

Калі пры поўнай залі чынавенства на чале з Лукашэнкам канфэрансье абвясьціў 2-гі канцэрт Рахманінава для фартэпіяна з аркестрам, я быў перакананы, што зайграюць папулярны пачатак гэтага клясычнага твору. Аднак зайгралі не пачатак, а — «фрагмэнт фіналу». Ці быў у гэтым намёк музыкаў, ці не, але ўпершыню з савецкіх часоў па-асабліваму ёкнула сэрца... Піша **Сяргей Дубавец**.

Аглядаючы сёньняшнія літаратурныя дасягненьні, ты зноў шукаеш між іх нейкага этапнага твору, нейкага бясспрэчнага адкрыцьця, новага імя ці хоць бы якога выверту літаратурнага працэсу. Але замест знаходак чарговы раз прыходзіць канстатацыя літаратурнага бясчасься, якое доўжыцца ўжо два дзясяткі гадоў. Штосьці, зразумела, і пішацца, і зьяўляецца, але так, каб...
Памятаю, даўным-даўно, яшчэ ў Каралішчавічах, мы слухалі дэклямацыю вершаў. І калі чытальнік закончыў, паўхвіліны трымалася паўза, а пасьля заля проста выбухнула воплескамі, і ўсе ўзбуджана паўтаралі толькі адно слова: паэт, паэт, паэт...
Сучасьнік можа цешыць сябе спадзевам, што ў ягоныя вершы папросту не ўчыталіся, не разгледзелі ў ім паэта... І нельга адмаўляць яму ў рацыі. Бо каб публіка вычытвала і «вычувала» ў культуры сапраўдныя обэртоны, яна, публіка, павінна быць настроеная на адну хвалю, жыць у адной сыстэме каардынат, мець адну гіерархію каштоўнасьцяў. А гэта якраз тое, што за мінулыя дваццаць гадоў публіка страціла.

## Ну, дзе вашы шэдэўры?

Сёньня, каб дачакацца зьяўленьня шэдэўраў і геніяў, патрэбныя ня толькі аўтары і творы, але тая пазнавальная адзіная хваля, на якую аўтар і твор маглі б арыентавацца і ў якой маглі б прагучаць як геній і шэдэўр. Патрэбная эпоха. А яе няма. «Ну дзе вашы шэдэўры?» — пытаецца чытач у літаратара, наіўна думаючы, што гэта пісьменьнік стварае эпоху. Ён, вядома, на яе ўплывае, але зноў жа, толькі тады, калі яна, гэтая супольная хваля, ёсьць.
Хрэстаматыйны прыклад — апавяданьне Леаніда Дранька-Майсюка, якое адкрывае апошні нумар часопісу «Дзеяслоў». І чытаецца, і напісана культурна, акуратна, але адкуль і куды — адкуль узята і куды скіравана, да чаго гэта можна было б прыладзіць, — невядома. Міма эпохі, бо эпохі няма. Між тым, многія яшчэ памятаюць паэтычны дэбют гэтага аўтара ў савецкія часы, калі ні да каго не падобныя вершы пра цукровых пеўнікаў адразу і дарэчы леглі ў супольны малюнак літаратуры той дадатковай фарбай, якой у ім, у малюнку, яшчэ не было.
Гэта значыць, што за савецкім часам была тая супольная хваля, была публіка, і разам яны ўтваралі эпоху, дзякуючы чаму сталі магчымымі дзясяткі выдатных беларускіх літаратараў і твораў. Мы ўсе стаялі насуперак сыстэмы, цэнзуры і маналітнага абсурду застойнага жыцьця, і наша адзінства, наша эпоха выяўляліся ў паўслове, паўнамёку, паўжэсту. Але пасьля хваля была страчана. Да разбурэньня агульнае сыстэмы каардынат спрычынілася шмат што: і распад саюзу, і рынак, і сучасная Лукашэнкава русіфікацыя. Толькі ж іншага шляху, апроч як адбудоўваць гэтую сыстэму, няма. Прычым мы не адбудуем яе на ўзор заходніх дэмакратыяў, дзе свае сыстэмы складаліся стагоддзямі. Не адбудуем і таму, што цалкам пазбаўленыя такога досьведу, і таму, што сёньняшні аўтарытарны рэжым не пакідае выбару. Падман цэнзуры, эзопава мова ды іншыя хітрыкі, што часьцяком прыводзілі да зьяўленьня клясычных твораў беларускае літаратуры, — вось той шлях, да якога падштурхоўвае нас рэчаіснасьць.

* * *

Развагі пра літаратуру праектуюцца і на палітыку. Калі няма эпохі, няма адкуль брацца адэкватным грамадзкім лідэрам, няма з чаго нараджацца і куды скіроўваць сваю дзейнасьць. Таму на прэзыдэнцкія выбары ў нас ідзе шмат кандыдатаў, практычна з аднаго кошыка, але кожны са сваёй тактыкай, ажыцьцяўленьне якой без удзелу астатніх немагчымае. І гэта таксама – выпадзеньне з эпохі, якой няма. Была б яна – можна было б падумаць, што яны наўмысна сварацца, гуляюцца ў лебедзя, рака і шчупака, каб абдурыць галоўнага апанэнта. Але эпохі – таго таемнага інтэлектуальнага абэртону, злучва «тых, хто ўсё разумее» – няма.
Чаму яна, эпоха, не нарадзілася за гэтыя 12 гадоў? Таму што ўвесь гэты час ішло самасьцьверджаньне новае ўлады, а публіка няспынна была гатовая да самых нечаканых перамен. Напэўна, сёлета ўвесну сытуацыя зьменіцца. Бо ўсе раптам зразумеюць, што апынуліся ў «вечным царстве», што больш ужо ніякіх пераменаў чакаць не выпадае. І гэта будзе галоўная перадумова набліжэньня эпохі. (...)

## Эзопава асалода

Беларуская літаратура даўно забылася пра тое, што значыць падмануць цэнзуру — пра інтэлектуальныя перамогі, пра сам смак гэтага занятку і асалоду ад таго, што твае эзопавы радкі патрапілі ў друк і былі адпаведна зразуметыя публікай. Жывучы ў краіне дыктатуры і аўтарытарызму, татальнага кантролю і ўціску, беларускі літаратар, тым ня менш, піша тое, што хоча, друкуе тое, што

**Працяг на старонцы 22.**




**Нас чакаюць маразы. Па Вадохрышчы яны могуць дасягнуць — 25 $C^0$. Самы час загартоўвацца — на Камсамольскім возеры ў палонку можа акунуцца любы ахвотны.**

# Набліжэньне эпохі

**Працяг са старонкі 20.**

піша, і чытае тое, што друкуе.
Ён нібы ўхіліўся ад цэнзуры, а яна — ад яго. Прынцыповага літаратара ніхто не ўціскае. Цэнзура кантралюе сваю вузкую палоску, на якой сабралася купка беспрынцыпных графаманаў, задаволеных адсутнасьцю крытыкі. Усім добра.
Падманваць цэнзуру няма патрэбы, пакуль ёсьць незалежныя выданьні. Мы кажам, што гэтыя выданьні ледзьве ліпяць апошнія дні, тым ня менш іх прысутнасьць пазбаўляе сытуацыю таго напружаньня, якое і натхняе літаратара на інтэлектуальныя перамогі. Мы пішам як эўрапейцы, саміх сябе ўсьведамляючы паўночнымі карэйцамі. Адсутнасьць чыстага жанру пасяляе сьвядомасную эклектыку, у якой мы адначасова і змагары, і тыя, хто ня надта верыць у патрэбу свайго змаганьня. Мы не разумеем, ці мы ўжо ці яшчэ Кундэры ў Парыжы, ці мы ўжо ці яшчэ Кундэры ў Празе 1968-га. Што тут скажаш або напішаш?..

## У бітвах за волю

Каб параўнаць тыповыя ўчынкі мастака ў сытуацыі чыстага жанру і нячыстага, падвешанага, прывяду два прыклады. Напачатку 1980-х на рэспубліканскай мастацкай выставе Ўладзімер Крукоўскі выставіў сваю працу, якая адразу стала клясыкай беларускае культуры. На плякаце былі напісаныя радкі зь беларускага савецкага гімну — «У бітвах за волю, у бітвах за долю», што, напэўна, і прымусіла цэнзуру гэты плякат «прапусьціць». Бо намаляваная на ім была жанчына-Беларусь, вялікая і дужая, у ваяцкай кальчузе, складзенай са старадаўніх гербоў гарадоў, зь вялізным мячом, словам, такая, у якую мы ўсе і верылі і якая бяз гімнавых радкоў ніколі б не патрапіла на выставу, бо была абсалютна адваротным вобразам таму, які насаджаўся — пра Беларусь несамастойную і цалкам залежную ад Расеі.
Другі прыклад — росьпіс Алеся Пушкіна, які ў вясковай царкве намаляваў люцыпаравы катлы, у якіх гарыць у агні Лукашэнка. Гэты вобраз — нібы крык ад бясьсільля. Сваёй стылістыкай ён блізкі да вершу Славаміра Адамовіча «Убей президента» і да пэрформансаў самога Пушкіна, а працяг мае ў галадоўках, якія так пашырыліся ў лукашэнкаўскія часы. Найвялікшы сэнс усіх гэтых дзействаў зусім дзіцячы — «вось памру, тады плакаць будзеце»... Але я вярнуся да таго царкоўнага росьпісу. На добры лад, такі ўчынак мастака вымагаў бы шырокага грамадзкага абмеркаваньня, чаго, на жаль, не адбылося ані ў афіцыёзнай, ані ў незалежнай прэсе. Зь іншага боку, мне цяжка ўявіць чалавека, які стане хадзіць у такую царкву дзеля сваіх рэлігійных патрэбаў і далучацца да сакруму, гледзячы на Лукашэнку ў пякельным катле.
Уладзімер Крукоўскі даў прыклад клясычнага пераігрываньня цэнзуры. Алесь Пушкін выпусьціў пару ўласнае ятры. Па вялікім рахунку, гэтыя два матывы і адрозьніваюць беларускую культуру за савецкім часам і ў нашы дні.
Няма сумневу, што цэнзура дысцыплінуе, раздражняе і нават натхняе творцу. І калі яна раптам зьнікае, разам зь ёй прападае звыклая сыстэма каардынат. Творца шукае іншай сыстэмы, але не знаходзіць, бо не прывык кіравацца адно эстэтычнымі матывацыямі. Тым часам Лукашэнкава дыктатура дала яму толькі ілюзію вяртаньня старых парадкаў. Пакуль, прынамсі, гэта так.
Творца мусіць расказаць пра сваю эпоху, а ён яе не намацвае, і зрабіць гэта яму замінае падвешаны стан. Ён раптам перастаў разумець, хто ён. Ад яго чакаюць адказаў іншыя, а ён і сам рады запытацца. А тут яшчэ гэты гадзіньнік так брыдка такае над вухам. Гэтай ноччу.
Гэтай ноччу могуць зачыніць «Нашу Ніву».
Гэтай ноччу можа сысьці ў невараць Лукашэнка.
Гэтай ноччу...
Гэтай ноччу гадзіньнік такае ўжо 10 гадоў.
За 10 гадоў наш літаратар так і ня вызначыўся да канца, хто ён: змагар, затворнік, нонканфарміст ці проста сядзіць у пачакальні на чамадане. Адпаведна тое самае адбылося і зь ягоным лірычным героем, і зь ягоным творам і зь ягонай творчасьцю.

## І гэты час не назаўсёды

Чаму савецкая эпоха беларускага пісьменьніка не навучыла, дык гэта пісаць у стол. Без пэрспэктывы друку, бяз шанцаў на вядомасьць, бязь відаў на ганарар. Беларускія пісьменьнікі ніколі нічога істотнага ў стол не пісалі. Зараз бы гэткі досьвед прыдаўся. Бо стол — гэта дом, а дом — гэта крэпасьць.
Для крытыка сёньня дзіўная дылема: альбо чакаць вяртаньня эзопавай мовы, альбо чакаць Нобэлеўскай прэміі для беларускага пісьменьніка. Вырашыць яе можна так: а што больш чакаецца? З гледзішча крытыкі — першае, бо другое — падзея больш палітычная, чым літаратурная.
«І гэты час, і гэты лад не назаўсёды» — гэтыя словы Алеся Разанава былі ўкладзеныя ў песьню, а песьня запакаваная ў пераклад п’есы літоўскага драматурга. Але гэтыя словы напачатку 1980-х прагучалі як набат. Хіба сёньня яны не гучаць гэтаксама?
Праўда, як сам паэт сказаў у інтэрвію «Вострай Браме», сёньня гэтыя словы павінны прамаўляцца іншымі вуснамі.

### Толькі б мову вярнуць

... І працэс, здаецца, пачаўся. Неўзабаве радыё «Свабода» будзе адзначаць кожны прыклад падману цэнзуры, як гэта было ў 1970-я і 1980-я гады.
Вось у страшна прапагандысцкую перадачу «Панорама» на БТ запрашаюць тэатральнага рэжысэра Барыса Луцэнку, які ставіць п’есы ў расейскім тэатры. Луцэнка — постаць такога даробку і велічыні, што юліць ды хлусіць яму няма патрэбы. Маладыя вядучыя насядаюць на мэтра, каб распавёў ім пра мараль, з чаго, так бы мовіць, пачаць... Ідзе жывы этэр. Гледачы замёрлі ў чаканьні адказаў. Луцэнка гаворыць пра беларускую мову, на якой мусіла бісьці беларуская тэлевізія. Замяшаньне на тварах трэніраваных вядучых доўжыцца чвэрць сэкунды. Мэтра нясе не туды! Канечна, канечна, нібы супакойваюць яны Луцэнку, але вы лепш — пра самаўдасканаленьне чалавека, пачні зь сябе і ўсё такое... Натуральна, падхоплівае мэтар, вось толькі б мову беларускую вярнуць...
Гэта — учынак. На самай лукашэнкаўскай тэлевізіі ў самай лукашэнкаўскай перадачы прыйсьці і сказаць самую антылукашэнкаўскую думку, ды так, каб ніхто не насьмеліўся яе аспрэчыць!
Ня ведаю, чаго гэта ўсё каштавала ўдзельнікам сюжэту, але публіка — дасьведчаная, натуральна — перанэрвавалася. І вось у мяне ўжо прагучала слова — публіка. Яшчэ трохі, і само вырвецца — эпоха... Між іншым, у той самы вечар паказвалі ўзнагароды за духоўнае «вазраждзеньне», і было радасна, што Барыса Луцэнкі сярод атрымальнікаў прэміі няма. Наагул, «лаўка запасных» дзеячоў культуры ў галоўнага хакеіста краіны выглядала ў культурным сэнсе больш чым убога. Нават у параўнаньні з папярэднімі гадамі. Сярод папоў, ідэалягічных чыноўнікаў і прапагандыстаў хіба што два рэальныя творцы ратавалі гэты безаблічны шраг — артыстка Акружная і кінаапэратар Гарулёў — людзі вядомыя і сапраўды заслужаныя.
Але хто ж там намінаваны ў галіне літаратуры? Не, нават ня так стаіць пытаньне. Хто зь літаратараў згадзіўся выйсьці на гэтую сцэну? Скобелеў. Верны змагар за чысьціню расейскай крыві і супраць жыдоўскае змовы, а самае галоўнае — асабісты пісьменьнік прэзыдэнта. Пра што гэта сьведчыць? Пра тое, што пісьменьнікі «скончыліся» і што пасьля Скобелева можа быць толькі... сам Лукашэнка. Сёлета ён ужо атрымаў гран-пры свайго імя ў хакеі, налета атрымае ў галіне літаратуры. Вядома, сам ён нічога пісаць ня будзе — напіша Скобелеў, а Лукашэнка зацьвердзіць. Кніжку можна назваць «Цаліна» ці зусім проста — «Малая зямля».
Нездарма прыклады новае эзопавай мовы пачынаюцца з тэлевізіі. Калі пэўны зазор незалежнае тэрыторыі застаецца ў літаратараў, мастакоў, артыстаў тэатру, нават у кіношнікаў, дык яго цалкам пазбаўленыя тэлевізійшчыкі. Вось тая тэрыторыя, дзе цэнзура татальная і нават больш татальная, чым за савецкім часам. І гэта якраз на тэлевізіі трэба чакаць зьяўленьня падманшчыкаў цэнзуры, інтэлектуальных пераможцаў. Гульня ў кошкі-мышкі павінна скончыцца пасьля выбараў. І тады пачнецца клясычны таталітарызм. Слушна, у цывілізацыйным пляне гэта будзе ніжэйшы жанр, чым тое, у чым мы думаем, што жывем. Але як ні парадаксальна, менавіта чысты жанр дасьць магчымасьць разьвіцьця літаратуры.

Мы гаворым пра дыктатуру, а ў нашым прыгожым пісьменстве няма эзопавай мовы. Так не бывае. Альбо гэта не дыктатура, альбо... Аказалася, што проста ўсё даходзіць да свайго лягічнага афармленьня. Спусьціцца на ніжэйшую прыступку грамадзкага разьвіцьця зусім не прасьцей, а можа і цяжэй, чым падняцца на вышэйшую. Спускацца па стромай і крывой сьлізкай сьцяжыне ўніз, дарэчы, заўсёды цяжэй, чым падымацца ўгору.

*Вільня*

*Паводле радыё «Свабода», скарочана*

# Адказ Сяргею Дубаўцу

“Іншага шляху, як адбудоўваць сыстэму” культурных каардынат, гіерархію каштоўнасьцяў, якая існавала ў савецкі час, у нас няма. “Прычым мы не адбудуем яе на ўзор заходніх дэмакратыяў”, бо — аргумэнт чыста лукашэнкаўскі — “мы цалкам пазбаўленыя такога досьведу”, піша Сяргей Дубавец. Гэтая сыстэма адродзіцца, бо ўвесьну “пачнецца клясычны таталітарызм”, і “усе гэта раптам зразумеюць”. Але менавіта гэты спуск у “цывілізацыйна ніжэйшы жанр” і “дасьць магчымасьць разьвіцьця літаратуры”, якое выразіцца ў росквіце “эзопавай мовы”.

Прагнозаў аб хуткім надыходзе таталітарызму я за сваё кароткае жыцьцё начуўся ад беларускіх літаратараў столькі ж, колькі ад лібэральных эканамістаў — прароцтваў непазьбежнага каляпсу эканомікі ў наступным годзе.

Клясычны таталітарызм — гэта значыць, фашызм, нацызм або сталінізм. Гэткі лад немагчымы ў асобна ўзятай Беларусі. З кучы прычынаў — напрыклад, праз немагчымасьць закрыць межы ці перакрыць інфармацыйныя плыні.

У прынцыпе, таталітарызм у Беларусі магчымы. Але толькі пасьля Расеі. А ці магчымы ён у Расеі, гэта асобнае вялікае пытаньне, і ў кожным разе пэрспэкты-

**Працяг на старонцы 27.**

# Паводле законаў сьмятаны



У передвыбарчым булёне размнажаюцца пражэкты палітычных ідэалістаў.
Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Сьвежы прыклад: пасіянарныя прадстаўнікі прадпрымальніцкага руху анансуюць кампанію «Ўлада без Лукашэнкі». Але як дасягнуць жаданай мэты, ініцыятары не тлумачаць. Затое катэгарычна кажуць: тыя, хто ўцягнуўся ў суперніцтва зь дзейным лідэрам на ягоных умовах, ігнаруюць «асноўны прынцып правоў чалавека — роўнасьць усіх перад законам». Во як: не рэжым ігнаруе, а Мілінкевіч!
Сярод крытыкаў-максымалістаў папулярная тэза: апазыцыйныя прэтэндэнты дапамагаюць Лукашэнку легітымізаваць трэці тэрмін. Таму варта або наагул байкатаваць фарс, або так ці інакш сапсаваць абедню. Напрыклад, праз «народнае галасаваньне». Але без належнага інфармаваньня ды пры інэртнасьці масы праект народнага галасаваньня здольны хіба ўдарыць бумэрангам. Потым казённыя мэдыі пасьцябаюцца: глядзеце, толькі купка адэптаў падтрымала адарванага ад рэаліяў палітычнага эмігранта!
Ну а байкот — увогуле зброя слабых, і таму гэта слабая зброя.
Згадваецца досьвед 2000 году. Тады змагары ў белых пальчатках, сказаўшы «не» парлямэнцкім выбарам, гуртам дзяўблі «рэнэгата»-Статкевіча. Між тым іх анэмічная стратэгія толькі дапамагла ўладзе ссунуць апанэнтаў у маргінальную яміну.
Сёньня асабліва недарэчна, калі нехта ўзяўся за гуж, а потым, нібы ўчора нарадзіўшыся, з агідай адмаўляецца ад «удзелу ў фарсе». Хіба быў спадзеў, што спадарыня Ярмошына стане высьцілаць ружамі дарогу на Карла Маркса, 38?
На думку палітоляга Валера Карбалевіча, прыхільнікі байкоту ад пачатку прызнаюць, што пераможа Лукашэнка, і скіроўваюць высілкі толькі на тое, каб неяк падпсаваць уражаньне элегантнай перамогі. Дый сэнс легітымнасьці, кажа экспэрт, байкатысты разумеюць цьмяна. Сапраўды, яна палягае не ў фармальных прыкметах (што там скажа Вэнэцыянская камісія), а ў тым, ці прызнае кагосьці за ўладара народ.
Калі ў афіцыйнага правадыра даволі шмат шчырых прыхільнікаў, дык ад лёзунгаў байкоту яму ні горача ні холадна. А вось у антылукашэнкаўскага электарату ад падобных лёзунгаў, як і ад пэрсанальных псэўдаальтэрнатываў, едзе дах.
Зь іншага боку, зірнеце: уладу нэрвуе нават мінімум передвыбарчай атрыбутыкі. У сёньняшніх умовах нават партрэт апазыцыйнага лідэра над столікам зборшчыкаў подпісаў — ужо выклік сыстэме, якая спрабуе закрэсьліць альтэрнатыву гульнёю ў маўчанку.
Паказальна тое, што як чорт крыжа наверсе баяцца не абстрактна-максымалісцкіх лёзунгаў, а менавіта пэрсаналізаванай альтэрнатывы — з вусамі і барадой гарадзенскага фізыка. Ваяўнічыя прапагандысты круцяцца як гады на патэльні: і ўкусіць хочацца, і разам з тым называць табуяванае прозьвішча начальства не дазваляе.
Сёньня мы зайздросьцім чылійцам. Дэмакратычны трыюмф кандыдаткі-кабеты канчаткова ставіць сымбалічны крыж на эпосе крывавай хунты. А некалі ж там дэмакраты здолелі перамагчы Пінанчэта на рэфэрэндуме, які ініцыяваў сам дыктатар — у зэніце самаўладзьдзя, узяўшы за гарляк мэдыі. Ягоныя працаўнікі прайшлі ад дзвярэй да дзвярэй па ўсёй краіне — па ўсёй гэтай кішцы даўжынёй у тры з паловай тысячы кілямэтраў — і перамаглі!
Генэрал Фралоў любіць згадваць алегорыю пра дзьвюх жабаў у збане са сьмятанай. Тая, што адмовілася змагацца паводле непразрыстых правілаў сьмятаны, так і склеіла ў ёй ласты. А другая — зьбіла масла. Заўжды лепей варушыць канцавінамі!



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Дэмакратычны

Нават у такой прымітыўнай форме выбары — больш цікавае шоў, чым турнір аматараў-хакеістаў і пуск газу ў Докшыцах.
Фэльетон **Лёліка Ушкіна.**

Калі ўлады перанесьлі тэрміны выбараў так, што месяц збору подпісаў прыпаў на тыдні постнавагодняга запою, здавалася, яны зрабілі геніяльны ход. Паходы па кватэрах атрымлівалі фармат калядаваньняў. Уявіце: у вас постнавагодні бадун. Званок. На парозе зьбіральнік подпісаў. Вы пакідаеце яму аўтограф, але з

умовай
вас пава
«штраф
снайпэр
адмові
паехала
нас ня л
дамаў,
Вось та
барацьб
Усё вы
Па-пер
якія зап
выкліка
рэакцы
Майму
ў дзіцяч
заявіла
падпіш
пазбаўя
наступо



**Акадэмік Аляксандар Вайтовіч завяршыў сваю кароткую палітычную кар'еру заклікам да байкоту прэзыдэнцкіх выбараў. На фота: А.Вайтовіч (зьлева) з Валер'ем Фраловым ля Цэнтравыбаркаму падчас рэгістрацыі ініцыятыўнай групы.**

# ...сатурналій

...што госьць праявіць да ...агу і прапусьціць ...оную». Ад тосту «за ...ра» ён і сам не ...цца, а там пайшло-... «Каб здохлі ўсе, хто ...любіць», «за дзяцей», «за ...якія тут прысутнічаюць». ...кая батлейка замест ...бы з дыктатурай. ...йшла інакш. ...шае, вінаватыя ўлады, ...усьцілі адмінрэсурс, ...аўшы адмоўную ...ю.

...знаёмаму маладому тату ...ным садку выхавацелька ..., што калі ён не ...ацца «за», то яе ...ць прэміі, і як ...ства — стаўленьне да яго



дачкі ў садку збоку пэрсаналу будзе адэкватнае. Гэта адразу выклікала ў бацькі страшэнныя фантазмы, як пэдагог у прыліве помсты вучыць немаўля, што пераходзіць вуліцу трэба на чырвонае сьвятло, а ў якасьці хатняга заданьня раіць пагуляцца зь сярнічкамі, калі бацькоў ня будзе дома.

Па-другое, на тле росту ВУП у геамэтрычнай прагрэсіі, чарговых прарываў на фронце будаўніцтва саюзнай дзяржавы і дзяжурнай кампаніі супраць сэксрабаўладальнікаў гульня ў збор подпісаў зачаравала экзатычнасьцю і інтрыгай. Ці зьбярэ Мілінкевіч 300 тысяч подпісаў, а Лукашэнка 10 мільёнаў?

Гарады сталі выглядаць весялей. Зьявіліся людзі з маленькімі столікамі і партрэтамі кандыдатаў. Побач зь імі новы бігборд з выявай Ксеніі Сітнік, павялічанай ананімным фаташопшчыкам да габарытаў Кінг Конга, выглядае ня гэтак жудасна.

Зьбіральнікі ператварылі цэнтар сталіцы ў атракцыён камікадзэ. Нахабна парушаюць Закон аб дыскрэдытацыі РБ, адкрыта ў публічным месцы кажучы, што ня ўсё так добра пры бацьку. Гэта чуюць інтурысты. Акрамя таго, кожны можа цяпер ад душы пасьцябацца з рэжыму: падысьці да рэспубліканскіх патрыётаў, якія зьбіраюць подпісы за свайго спонсара, і папрасіць распавесьці нешта пра заробак у 250 баксаў або спытаць: «А дзе ж наша першая лэдзі?» КВК проста адпачывае.

Улады дапусьцілі вялікую памылку. Нават у такой прымітыўнай форме выбары — больш цікавае шоў, чым турнір аматараў-хакеістаў і пуск газу ў Докшыцах. У Чырвоным доме трэба ўжо зараз задумацца, як пераключыць піпл на іншую фішку. Мяркую, што адзіным выхадам можа быць пераход зь юліянскага на ўсходні каляндар, што дазволіць адсьвяткаваць Новы год яшчэ раз, напрыканцы студзеня.

## Тры дарогі братоў Каўфманаў

**Да артыкулу Андрэя Расінскага «Геаграфічная маргіналія, або Культурная мэтраполія» («НН», №2, 13 студзеня 2006).**

Калі пасяліўся ў Беластоку Абель Каўфман, гаспадар букіністычнай крамы, невядома. Але тут у яго нарадзіліся тры сыны-кінэматаграфісты: у 1896-м — Дзяніс (Давід), у 1897-м — Міхаіл (Майсей), у 1906-м — Барыс (Борух). Самы знакаміты — старэйшы Дзяніс, вядомы пад імем кінаавангардыста Дзігі Вертава. Яго ўплыў на сусьветную кінадакумэнталістыку можна параўнаць з узьдзеяньнем Грыфіта і Эйзенштэйна на мастацкае кіно. Але й Міхаіл з Барысам пакінулі значны сьлед у кінамастацтве — хоць і ў розных краінах.

Міхаіл Абрамавіч Каўфман (як і Дзіга, ён зьмяніў імя і прозьвішча па бацьку) у 1920-я быў адным з найвядомейшых савецкіх апэратараў і найбліжэйшым паплечнікам старэйшага брата. Менавіта ён зьняў вертаўскія фільмы «Адзінаццаты» (1928) і «Чалавек з кінаапаратам» (1929), якія лічацца клясыкай кінапубліцыстыкі. Пасьля апошняга фільму іх шляхі разышліся. Міхаіл сам сасьпеў да самастойнай рэжысэрскай працы, і яго творчыя прынцыпы не супадалі з мастацкімі мэтадамі Дзігі. У сваю чаргу старэйшы брат абвінавачваў Міхаіла ў салідарнасьці з тымі, хто яго зьняслаўліваў, чаго, па сьцьвярджэньні дасьледчыкаў, не было. Нэгатыўную ролю адыграла і ўзаемная антыпатыя Міхаіла і жонкі Дзігі — Лізаветы Сьвілавай, мантажора яго стужак.

У Міхаіла Каўфмана былі свае трыюмфы. Дакумэнтальны фільм «Увесну» кіназнаўца Жорж Садуль назваў найлепшай стужкай 1929 г. У 1930-я Міхаіл замкнуўся ў сваёй шкарлупіне. Рэч у тым, што ён жыў у грамадзянскім шлюбе з італьянкай па нацыянальнасьці. Яго «папярэджвалі»: сувязь з чужаземкай небясьпечная і для кар'еры, і нават жыцьця. І аднойчы яна зьнікла (забілі? — **АБ**). Праз некалькі дзён іх дачку знайшлі ў адным з маскоўскіх паркаў, а яшчэ цераз некалькі дзён яна памерла ад пераахалоджваньня. Так савецкая дзяржмашына расправілася з творцам-свавольцам. Псыхалягічны шок адбіўся на ўсім далейшым жыцьці гэтага чалавека. У паваенныя гады ён ціха працаваў на сталічнай кінастудыі навукова-папулярных фільмаў.

Лёс Барыса Каўфмана склаўся вельмі ўдала. Каб яго не забралі ў польскае войска, Абель Каўфман адправіў сына ў Францыю (спачатку ён вучыўся ў Грэноблі, потым у Сарбоне). У гісторыю сусьветнага кіно Барыс Каўфман увайшоў спачатку як выдатны апэратар мастацкіх стужак французскага кінаклясыка Жана Віго (сярод іх — шэдэўр «Аталянта», 1934 г.), а потым як камэрмэн карцінаў амэрыканца Сыднэя Люмэта, у тым ліку «12 раззлаваных мужчынаў», які паказвалі ў СССР у 1960-я. За ўдзел у фільме Эліа Казана «Ў порце» Барыс атрымаў «Оскара» (1955).

Абодва браты, Міхаіл і Барыс, памерлі ў 1980 г. Абодва самаахвярна служылі прафэсіі. Толькі адзін пражыў у сацыялізьме, зьведаў на сваім карку ягоныя антыгуманістычныя завіхрэньні. Другі напоўніцу рэалізаваўся ў сыстэме капіталізму. Праўда, і над ім вісеў дамоклаў меч у часы паляваньня на вядзьмарак у ЗША. Э.Казан, які супрацоўнічаў з камісіяй па расьсьледаваньні антыамэрыканскай дзейнасьці, даваў сьведчаньні супраць шэрагу кінэматаграфістаў, якія прытрымліваліся камуністычных поглядаў, але змаўчаў пра тое, што ў Б.Каўфмана браты жылі ў СССР.

Ня ўсё ўдалося зьдзейсьніць і Дзігу Вертаву. Сам ён прыгадваў (кніга «Дзіга Вертаў. Артыкулы. Дзёньнікі. Задумы, што ўжо ў маленстве ён і яго аднагодкі «пакрысе перайшлі ад захапленьня казкамі з чараўнікамі да казак самае прыроды, да дзівосных зьявішчаў на зямлі, пад зямлёй і ў небе...». Дзігу так і не пашчасьціла зьняць і гэты музычна-паэтычны фільм, і многія іншыя — таленты ў СССР, якія не ішлі ў агульнай калёне сацрэалізму, скідвалі ўбок. Саслалі ж пры канцы жыцьця ў «ампірна-кічавыя навіны», як згадаў Андрэй Расінскі.

Пра многія факты з жыцьця сям'і Каўфманаў я пачула ў выдатным дакумэнтальным фільме масквіча Яўгена Цымбала «Дзіга і яго браты». Беластоцкі пэрыяд яму дапамагаў узнавіць журналіст Томэк Вішнеўскі, які даслаў паштоўкі Беластоку пазамінулага і мінулага стагодзьдзяў. Насьпела патрэба вярнуць братоў Каўфманаў у беларускі кантэкст.

**Ала Бабкова, кінакрытык**

## Падзяліся ўсьмешкай са сваімі

**Прапаную абвясьціць «Тыдзень усьмешкі»:** няхай кожны з нас падарыць хоць адну ўсьмешку суседу, знаёмым і незнаёмым людзям на вуліцы! Няхай па ўсьмешцы можна будзе пазнаць — гэта «свае». Вось што павінна стаць сымбалем незалежнасьці! І няхай людзі, якія вяртаюцца з-за мяжы, ня чуюць сябе «ідыётамі», бо дазваляюць сабе быць у добрым гуморы!

**Беларуска, бяз адрасу**

## Пасьлякалядовая акцыя, або добрае сэрца Супрановіча

**Заўжды шчыра захапляўся арганізацыйнымі здольнасьцямі лідэра «БМА Group» сп.Супрановіча, але апошнім часам давялося стаць сьведкам абставінаў, у якіх праявіліся душэўныя якасьці Віталя.**

Напярэдадні Новага году ён заўважыў, што адзін зь бяздомных «пад'ездных» кацяняткаў, якія туляюца па панадворку шматкватэрніку, выглядае на жахліва хворага. Ён тут жа забраў гэную малую котачку да міжкватэрнага тамбуру на дзьве кватэры (да сябе ўзяць ня мог, мае свайго — таксама раней падабранага — гадавалага каточка). Суседзі па пад'езьдзе падтрымалі ініцыятыву Віталя. Потым былі паездкі да вэтэрынараў, штодзённыя ўколы (і гэта пры занятасьці сп.Супрановіча!). Цяперака котка здаровая — таму прысьпеў час іншаму чалавеку выявіць міласэрнасьць. Шукайма добрых гаспадароў для котачкі, якую вылекаваў Віталь, а таксама для брацiка гэтай котачкі, які па-ранейшаму туляецца ў пад'езьдзе. Ахвотныя дапамагчы няхай зьвяртаюцца па наступных тэлефонах:

(017) 249-08-88, 249-08-93,
(029) 649-08-88, 400-68-82,
90-102-12.

**В. Ал-ч, Менск**

## Моцную дзяржаву «абсярац» ня будуць

**Я шмат у чым згодны з Кастусём Траўнем («Нашы дзячаты абсяралі», «НН», №46).** Але міты ня могуць быць надзейным апірышчам, бо міты — гэта тое, чаго не было. «Як толькі ідэалы, міты СССР былі зруйнаваны — дзяржава разбурылася». Я сказаў бы інакш: СССР разбурыўся — яго ідэалы, міты занадта разыходзіліся з рэчаіснасьцю.

Галоўнай задачай беларускіх адраджэнцаў зьяўляецца сёньня не стварэньне мітаў аб мінулым, а барацьба за заўтрашні дзень нацыі. Калі ў нас будзе нармальная дзяржава, здольная забясьпечыць дабрабыт і нацыянальную сьвядомасьць грамадзян, нікому з нармальных людзей ня прыйдзе ў галаву яе «абсяраць».

**Усяслаў Шатэрнік, Менск**

## УДАКЛАДНЕНЬНІ

Спатканьне А.Мілінкевіча і К.Марцінкевіча адбылося ня ў Гайнаўцы, як паведамлялася ў мінулым нумары, а ў самім Беластоку. Памылка дапушчаная праз збой у тэлефонным запісе.

* * *

У артыкуле Аляксандра Фядуты «Белы крумкач на сьнезе» фразу «Але «Кніга ўзнаўленьняў» успрымаецца ледзь не як маніфэст геамэтрычнасьці» трэба чытаць: «Але «Кніга ўзнаўленьняў» успрымаецца ледзь не як маніфэст гермэтычнасьці». Памылку набору хай даруе нам Паэт.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail:**
**nn@promedia.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

# Адказ Сяргею Дубаўцу

**Працяг са старонкі 22.**

вы расейскага таталітарызму ніяк не прывязаныя да выніку нашай вясны. Таму прагноз С.Дубаўца наконт таталітарызму ня спраўдзіцца. Пасьля мінулых выбараў краіна перажыла кароткі, але плённы для ўмацаваньня нацыянальнай ідэнтычнасьці пэрыяд лібэралізацыі. Чаму гэта ня можа паўтарыцца? У адрозьненьне ад Дубаўца, ня сьмею быць катэгарычным, але прынамсі ня стаў бы такой магчымасьці выключаць, перадусім у эканамічнай сфэры. Як ня стаў бы і выключаць імавернасьць зьяўленьня некалькіх дзясяткаў палітвязьняў.

Таталітарызму ня будзе. Але дапусьцім, што ён будзе. Тады абсалютна памылковы іншы тэзіс — што таталітарызм дасьць магчымасьць разьвіцца літаратуры. Дарэчы, тут Дубавец ізноў цьвердзіць процілеглае таму, што пісаў раней — у “Ружовым тумане” і інш., аб тым, што літаратура таталітарнага пэрыяду не дала ніводнага вартага твору. Прыпусьцім, што Дубавец мае на ўвазе наступнае: твораў не дала, але кантэкст, “хвалю” стварала.

Цяперашні стан беларускай літаратуры выражаецца ў тым, што яна прадукуе параўнальна малую колькасьць прафэсійных тэкстаў. Гэта мае пад сабой тры прычыны: звужэньне кола спажыўцоў праз русіфікацыю, звужэньне кола аўтараў праз русіфікацыю і скарачэньне датацый на літаратуру, якія ў малых нацыяў кампэнсуюць вузкасьць рынку. Якую з гэтых трох прычынаў скасуе надыход таталітарызму? Для беларускай літаратуры ён меў бы той жа эфэкт, што настойка каліны для пацыента з паніжаным ціскам.

Сыстэма каардынат і гіерархія каштоўнасьцяў, якія існавалі ў беларускай культуры ў савецкі час, былі сапраўды па-свойму цэльнымі. Гэта дасягалася праз сцэнтраванасьць іх на Маскву, скуль прыходзілі моды, уплывы, абэртоны і паўнамёкі. Таму яны і разбурыліся — а не праз рынак ці Лукашэнкаву русіфікацыю, на што ківае С.Дубавец (у сваёй настальгіі па імпэрскіх часах, моцных гаспадарніках на чале Саюзу пісьменьнікаў і г.д. ён пачынае моцна нагадваць Івана Шамякіна). Не разумею, якім чынам гэтую масквацэнтрычную сыстэму можна адбудаваць. Вярнуцца ў каланіяльную залежнасьць складаней, чым увайсьці другі раз у тую ж раку. Дый што ад таго беларускай культуры было б, дай ты гэта зрабіць.

У 1994 годзе С.Дубавец прагназаваў, што Кебіч набярэ больш галасоў за Лукашэнку, а Шушкевіч — за Пазьняка, дзеля таго, што “беларусы ня любяць крайнасьцяў”. У 2001 годзе С.Дубавец спачатку верыў у шанцы Зянона, а пасьля пабачыў у Лукашэнку лацінаамэрыканскага дыктатара. Не за палітычныя прагнозы мы любім С.Дубаўца і не ў палітычнай навуцы ён быў нашым настаўнікам. На гэты раз ён, думаю, і сам рады памыліцца.

Эзопава мова расквітнела толькі ў часы Брэжнева, калі рэжым выраджаўся і стаў непапулярным. Не пры Сталіну і не пры Хрушчову… Была дыктатура — а Эзопавай мовы не разумелі.

У Беларусі трывае і, магчыма, яшчэ доўга будзе трываць дыктатура. Вельмі сучасная дыктатура. Ёсьць у ёй ад Бэрлюсконі і ад Чавэса, ад Пілсудзкага і ад СССРу.

Пакуль існуе вольны Інтэрнэт і незалежныя СМІ, Эзопава мова будзе актам сумленьня — але ня нэрвам жыцьця. Пачытайце “ЛіМ”, “Беларусь сегодня”, ня кажучы пра шчырыя рэгіянальныя газэты. Там “паўсловаў, паўнамёкаў, паўжэстаў” па пяць штонумар. І што? “Міма эпохі”, як выразіўся С.Дубавец. Пакуль Севярынец сядзіць у Сітне, а Халіп ходзіць да сьледчага, Эзопава поза інтэлігента не чапляе. Публіка чакае большага.

Наша лукашэнкаўскае сёньня мне бачыцца не выпадковасьцю, не баршчавіком, прынесеным на ботах прыбалтыйскіх інтэрфронтаўцаў-адстаўнікоў, як выводзіў С.Дубавец у папярэднім эсэ, прысьвечаным угодкам літоўскіх падзеяў 1991-га, а лягічным вынікам нашага машэраўскага ўчора — напрыклад, адсутнасьці дысыдэнцкага руху ў БССР ці структуры нашай эканомікі. Лукашэнка на беларускай савецкай літаратуры выхаваны. Лякалізуючы прычыны лукашызму вонкі Беларусі, як робіць С.Дубавец, мы сутыкаемся зь немагчымасьцю зразумець генэзіс гэтай зьявы.

А зарок таго, што “гэты лад не назаўсёды” бачыцца якраз у тым, што цяпер многія беларусы адкрыта пратэстуюць, а іншыя байкатуюць бэзбахтэры рэжыму. Як паўстаньне Каліноўскага, стварэньне “Нашай Нівы” ці абвяшчэньне БНР былі зарокам будучае незалежнасьці Беларусі — якімі б трагічнымі або наадварот камічнымі ні здаваліся б яны сучасьнікам, так сёньняшні ўдзел тысячаў беларусаў у адкрытых акцыях пратэсту, праца ў незалежных мэдыях ці руцінная палітычная дзейнасьць — зарок дабудовы нацыі, якая выразіцца ў стварэньні дэмакратычнай і нацыянальнай дзяржавы. У гэтым адкрытым пратэсьце і ёсьць кантэкст, і “хваля”.

Чакаючы ля мора эпохі, дзяяч культуры прыпадабняецца да таго палітыка, які вечна рыхтуюцца не да гэтых выбараў, а да наступных.

Карціна нацыятварэньня перастае быць такой драматычнай, калі заўважыць, што літаратура перастала адыгрываць у ім ранейшую ролю. У нядаўнім эсэ, прысьвечаным Караткевічу, С.Дубавец выказаў думку, што сёньня такі геній немагчымы. Проста геніяў трэба шукаць у іншым месцы — рок-музыцы, палітычнай, сацыяльнай і рэлігійнай думцы ды інш.

Беларусь перажывае доўгую зіму. Зіма загартоўвае.

…Не магу нават вычарпальна адказаць свайму настаўніку. Рэальнасьць: увесь час ідзе на распаўсюд газэты. У гэтым сэнсе лукашэнкаўцы дабіліся свайго. Мушу здаваць гэты нумар. Працягнем рэфлексіі ў наступным.

# Гульня ў інфанты

На мінулым тыдні акадэмік Аляксандар Вайтовіч, які раней выйшаў быў з выбарчай кампаніі, падтрымаў кандыдатуру Зянона Пазьняка. Рэагуе **Віталь Тарас**.

Праўда, зрабіў ён гэта ўскосным чынам. Спачатку Вайтовіч сказаў, што ініцыятыва Пазьняка аб «народным галасаваньні» заслугоўвае ўвагі. А церазь некалькі дзён на сайце былога кандыдата зьявіўся заклік да распаўсюду інфармацыі аб гэтай ініцыятыве, якую акадэмік палічыў слушнай (пра саму схему з заменай выбарчых бюлетэняў, прапанаваную Пазьняком, «Наша Ніва» паведамляла ўжо неаднойчы). Напрошваецца высноўа, што каманда Вайтовіча падтрымлівае лідэра БНФ. Праўда, выглядае гэта трохі непасьлядоўна, калі ўлічыць, што акадэмік Вайтовіч, спыняючы збор подпісаў, заявіў аб нелегітымнасьці саміх цяперашніх выбараў з удзелам Аляксандра Лукашэнкі ды заклікаў усіх спаборнікаў адмовіцца ад выбарчай кампаніі.

## Акадэмічны капрыз

Падчас сёлетняй выбарчай кампаніі ўвогуле ўзьнікае ўсё больш пытаньняў. Не да ўлады, зразумела. Яе дзеяньні яшчэ й якія лягічныя ды прадказальныя, сьведчаньнем чаго стаўся, напрыклад, выклік у Цэнтравыбаркам на дыван кіраўнікоў ініцыятыўных групаў па зборы подпісаў за Мілінкевіча й Пазьняка. А вось апазыцыйныя сілы, якія выставілі сваіх прэтэндэнтаў, паводзяць сябе нярэдка алягічна. Калі ўдзел дзейнага прэзыдэнта ў выбарах незаконны, як сьцьвярджаюць некаторыя з прэтэндэнтаў, дык навошта асьвячаць, так бы мовіць, гэтыя выбары сваім удзелам у іх? Спадзяваньне на тое, што ўлады ўдасца перахітрыць «народным галасаваньнем»? Але ж гульням з падменнымі паперкамі на галасаваньні споўнілася прыкладна столькі год, колькі ў Беларусі існуе апазыцыя. Ці мелі гэтыя гульні з паперкамі хоць аднойчы які-кольвек заўважны эфэкт? Мяркуючы па тым стане, у якім апынуліся сёньня дэмакратыя ды беларуская апазыцыя, — наўрад ці.
Адкуль у ініцыятараў падобных гульняў упэўненасьць у тым, што ў народзе раптам абудзіцца сьвядомасьць і людзі пачнуць у масавым парадку выносіць з сабой выбарчыя бюлетэні, пакінуўшы ў скрынях паперкі зь імем сапраўднага пераможцы «народнага галасаваньня»? І што: сябры выбарчых камісіяў, убачыўшы гэтыя вынікі, раптам засаромеюцца ды пачнуць дзейнічаць не паводле інструкцыяў, складзеных Цэнтравыбаркамам, а паводле сумленьня й маральнага абавязку? Ня выключана, што сярод прыхільнікаў такога змаганьня з рэжымам ёсьць тыя, хто шчыра верыць у слушнасьць падобных мэтадаў.
Зразумела, кожны грамадзянін мае права ня толькі галасаваць за таго, каго ён падтрымлівае, але й рабіць гэта такім чынам, які лічыць мэтазгодным і адпаведным закону. Альбо не галасаваць увогуле. Пры гэтым звычайны грамадзянін можа спачатку падтрымліваць аднаго кандыдата, потым — іншага, і нават ставіць подпіс на этапе іх збору за кожнага з прэтэндэнтаў, а ў выніку выкрасьліць са сьпісу ўсіх кандыдатаў альбо байкатаваць выбары. Але ж палітыкі ня маюць права на тое, каб рабіць нешта пад уплывам эмоцыяў альбо капрызаў.

## Біць альбо ня біць?

Палітык, які спачатку не схацеў падтрымаць адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў, пайшоў на выбары самастойна, потым адмовіўся ўдзельнічаць у іх, заклікаючы ўсіх дзейнічаць паводле ягонага прыкладу, ды, урэшце, падтрымаў іншага прэтэндэнта, наўрад ці быў сапраўдным палітыкам.
Падобная палітыка нагадвае не палітыку, але гульню ў пясочніцы. Калі людзі, якія лічаць магчымай падобную «палітыку», ігнаруюць волю лідэраў дэмакратычных партыяў, што змаглі згуртавацца вакол адзінага кандыдата, яны дэманструюць ня проста сваю нелаяльнасьць ідэі адзінства, упартасьць ці асабістыя амбіцыі — яны дэманструюць сваю нясьпеласьць, свайго роду інфантылізм у палітыцы.
Тут няма гаворкі аб тым, наколькі ўдалым быў выбар дэмакратычных сілаў, што спынілі яго на цяперашнім «адзіным кандыдаце». І ня ў шанцах яго на выбарах. І нават ня ў тым, наколькі гэтыя выбары можна прызнаць законнымі.
Усё гэта — прадмет учарашніх дыскусіяў. Пазалеташні сьнег. Зараз ідзе выпрабаваньне беларускай апазыцыі на трываласьць, здатнасьць рабіць нешта, адстойваць свае інтарэсы й прынцыпы ў самых складаных варунках. Скардзіцца на лютасьць улады — справа, дальбог, няўдзячная. Спачуваньня тут можна дамагчыся хіба на Захадзе. Свайго роднага абываталя казкамі пра злога



Аб якой жа павазе да інтэлігенцыі можа ісьці гаворка, калі частка яе падтрымлівае былога рэктара, вядомага ня толькі сваім цынічным стаўленьнем да беларускай мовы, але й перасьледам студэнтаў па палітычных матывах?




**Нямногія беларускія палітыкі адчуваюць і адстойваюць інтарэсы пэўных сацыяльных групаў. Найлепшы сродак ад інфантыльнасьці — паездкі па рэгіёнах. На фота: абвестка ў Слоніме.**

воўка і «чырвоны каптурок» ня праймеш. Ваўкоў баяцца — у лес не хадзіць.

З другога боку, немагчыма вечна хадзіць аднымі й тымі сьцежкамі. Немагчыма ўвесь час рыхтавацца да наступных выбараў. Прычым, заўважым, прайграных выбараў. Справа, зразумела, не ў стратэгіі й тактыцы, якія трэба распрацоўваць загадзя, ня ў тым, што санкі трэба рыхтаваць улетку, але ў тым, што прыйшоў час плаціць па старых рахунках.

Калі ўлада ўвесь час трымае лідэраў апазыцыі за дурняў, выстаўляючы іх у дзяржаўных СМІ блазнамі, злодзеямі, нягоднікамі, але дазваляючы ім пры гэтым пэрыядычна ўдзельнічаць у спэктаклі пад назвай «выбары», нельга не задацца пытаньнем, ці толькі ўлада ў гэтым вінаватая? Калі апазыцыя дазваляе сябе заўсёды біць, яна й будзе заўсёды бітая.

## «Птушыны грып» у палітыцы

Калі ставіцца да выбараў і ўдзелу ў іх як да нечага несур’ёзнага, маргінальнага, дык і ставіцца да іх удзельнікаў народ будзе несур’ёзна, грэбліва. Зноў жа, размова аб легітымнай заваёве ўлады шляхам выбараў, на жаль, ужо даўно не вядзецца. Рэч у тым, каб дэмакратычная апазыцыя, у тым ліку — творчая інтэлігэнцыя, вярнулі самапавагу да сябе, веру ў свае сілы й вартасьць. Тады зьявіцца й павага з боку грамадзтва.

Аб якой жа павазе сёньня можа ісьці размова, калі частка творчай інтэлігэнцыі падтрымлівае былога рэктара, вядомага ня толькі сваімі рэтраградньімі поглядамі й цынічным стаўленьнем да беларускай мовы, але й перасьледам студэнтаў па палітычных матывах? Вылучэньне такога кандыдата пад нібыта дэмакратычнымі сьцягамі выглядае, хутчэй, як зьдзек з дэмакратычных прынцыпаў.

Пыха й непавага да апанэнтаў, самаўпэўненасьць і фанабэрыстасьць, цынізм непрыемныя ў кожным чалавеку. Калі ж гэтыя рысы праяўляюцца ў дзеячах апазыцыі, якая нічога, у прынцыпе, рэальнага не дамаглася за апошнія 12 гадоў, альбо ў тых, хто толькі нядаўна зрабіўся дэмакратам з-за зьбегу акалічнасьцяў, то яны здольныя выклікаць агіду ды неўразуменьне.

На горшыя чалавечыя якасьці, у тым ліку і ў асяродку палітыкаў, заўсёды разьлічвае ўлада. Зразумела, яна ў любы момант можа зьмяніць правілы гульні, прыдуманыя ёй самой. Яна можа проста зьняць усе фігуры з шахматнай дошкі, пакінуўшы аднаго караля. Але нават дэспатычная ўлада звычайна марыць аб «чыстай перамозе» над спаборнікам. Значна больш каштоўным для яе было б пакінуць некалькі пешак праціўніку, каб атрымаць затым «элегантную перамогу».

Інфантыльнасьць у палітыцы, ці нежаданьне думаць, некаторы час можа здавацца нават забаўнай. Зь цягам часу, аднак, яна набывае цяжкія формы дэбілізму. На жаль, некаторыя з гэтых формаў бываюць заразныя. У адрозьненьне ад «птушынага грыпу», яны ня лекуюцца. І галоўнае — маюць глыбокія наступствы.

# Джынсы — не найгоршы варыянт

каб пачуцца свабодным. Піша стылістка Сьвятлана Длатоўская.

«З часам нават самая арыгінальная ідэя ператвараецца ў штамп. А калі штампам злоўжываць, гэта можа выклікаць усеагульнае раздражненьне. Так адбылося з каляровымі рэвалюцыямі», — напэўна, мае рацыю спадар Тарас, пачынаючы гэтымі словамі свой артыкул «Джынсы ці джынса?» («НН», №46). Але ці дапаможа чужы пасьпяховы тавар, калі ўзяць яго за свой талісман? Не, калі бачыць за паняткам «джынсы» толькі зручную вопратку.

## Крыху гісторыі

Дзень нараджэньня джынсаў — 15 траўня 1853 г., калі эмігрант Леві Страўс вырашыў зарабляць на жыцьцё гандлем гаспадарчымі таварамі на каліфарнійскіх капальнях, у тым ліку італьянскай парусінай. Нараджэньне пачалося з граматычнай памылкі: надпіс «Genes» (Генуя) на цюках з тканінай прачыталі як «джынс».

У 1856-м кампанія Страўсаў мела добрую краму і пачала гандляваць штанамі, якія ўжо набылі амаль клясычны выгляд, зьмяніўшы карычневую парусіну з Генуі на сінюю саржу — «denim» — з французскага Німу (de Nim). Партыя мела нумар 501 ды арыентавалася на новых спажыўцоў — каўбояў. Калі Леві ўжо быў мільянэрам, габрэй-эмігрант з Рыгі Дэвіс на замову нейкага бамбізы даўмеўся замацоўваць скрыжаваньні швоў на кішэнях меднымі рымарскімі заклёпкамі і прапанаваў сваю вынаходку Страўсам.

Стагодзьдзе джынсы перацякалі ў Эўропу як сувэніры, покуль не былі запатрабаваныя як пратэстны атрыбут у выступах супраць кансэрватыўнасьці нораваў пакаленьнем 1960-х — 1970-х гг.. Джынсы сталі надзвычай папулярныя. Пацёртыя нагавіцы насілі і кіназоркі, і палітыкі ды прадстаўнікі каралеўскіх сем’яў у нефармальнай абстаноўцы. Кампанію «Levi Strauss & Co» ўзнагародзілі прэміяй за асаблівыя заслугі перад індустрыяй моды ЗША.

## У кожнага свой кайф

З дэніму цяпер вырабляецца ўсё: ад капелюшоў да паліто. Матэрыял ужываецца дзе варта і дзе ня варта, імітуецца і падрабляецца. Узьнік цэлы культ: ёсьць цэлыя сайты, дзе падрабязна тлумачыцца, як выбраць мадэль, як адрозьніць фірму ад падробкі, старыя экзэмпляры выстаўляюць на аўкцыёнах і прадаюць за шалёныя грошы.

Тэхнолягі экспэрымэнтуюць са спосабамі апрацоўкі тканіны і гатовых вырабаў. Нават «япі» — маладых гарадзкіх прафэсіяналаў — спадары Армані, Гацье, Вэрсачэ спакусілі прыняць свой нестандартны погляд на джынсавы стыль у жыцьці.

З 1990-х у моду зноў прыйшлі «аскетызм і нястача». Стылі «гранж» (маргінальны шык) і яго спадкаемца «гіпі-шык» сталі новым спосабам дэманстрацыі высокага сацыяльнага статусу і матэрыяльных магчымасьцяў. Таму невядома, ці зразумее патлаты інтэлектуал 1970-х (адзеты ў паношаныя джынсы) у акулярах і з барадой маладога джынсача ў швэдры зь неапрацаванымі манжэтамі, асабліва калі на плячах у апошняга — куртка са скуры кракадзіла.

Гэтаксама як і жанчыны: адныя празь нястачу перашываюць старыя мужавы джынсы ў дзіцячую вятроўку, другія «ловяць кайф», далучаючыся да п’янкой супэрмоднай вынаходкі — стылю «вінтаж», бо вячэрнюю сукенку ад Гацье, зробленую такім самым чынам, толькі з большай колькасьці джынсавых абноскаў, камэнтатары ад сусьветнай моды называюць прыкладам віртуознага і нечаканага валоданьня матэрыялам.

Аднак чаму людзі так упадабалі гэтыя сінія штаны? Хіба бязь іх мала зручных і камфортных рэчаў?

Адно зь першых патрабаваньняў да адзеньня — яго функцыянальнасьць. Псыхолягі моды дакладна вызначылі, што функцыянальнае адзеньне ўзмацняе таварыскасьць, схільнасьць да супрацоўніцтва, згоды ці кампрамісу. Жанчыны ў зручным адзеньні менш агрэсіўныя і жорсткія.

## Сымболіка сіняга

Клясычныя джынсы зачароўваюць магічнай глыбінёй індыга і нагадваюць пра вечны рух выцьвіласьцю ды прыцьвіласьцю. Таму хацелася б прыпыніцца менавіта на сымболіцы сіняга колеру.

У ілюстраваных альбомах, прысьвечаных беларускаму народнаму адзеньню, гэтых фарбаў сустрэнеш няшмат, хоць у міталёгіі беларусаў сіні, як і паўсюдныя белы ды чырвоны, зьвязаны з культам продкаў.

У беларусаў ёсьць устойлівае словазлучэньне «сіні лён». Праўда, большасьць мяркуе, што гэта ідзецца пра кветкі, паколькі індыга тут не расьце, а льняное валакно кепска фарбуецца расьлінным спосабам.

Мая бабуля згадвала, што за іх сялом было гарэлае балота. Той, хто не ленаваўся сьцягваць снапы празь лес, потым праз багавіньне і вымочваць іх у чорнай, «гарэлай» вадзе



запаветнай азярынкі, меў потым каштоўную сінюю палатніну.

На Старажытным Усходзе лічылі, што калі цела Крышны стала сінім, цыкль зямной гісторыі падыходзіць да свайго завяршэньня, трэба чакаць гібелі гэтага сьвету. Японцы кажуць: сіні — «колер дзіркі, праедзенай наймацнейшым з лугаў — часам». У Эўропе асабліва шанаваліся сінія камяні, але пазьней гэты колер набыў нэгатыўнае адценьне: «сіняя спадніца» ў Францыі — ахвяра мужчынскай здрады, «сіні плашч» у Нідэрляндах, наадварот, — не найлепшых паводзінаў жонкі.

## Штаны як паказьнік прагрэсу

І што б ні казалі модныя часопісы, падручнікі па псыхалёгіі моды канстатуюць: адна з функцый моды — прыўнясеньне пэўнай меры аднастайнасьці праз выбар з розных культурных мадэляў адной, якая інтэрпрэтуецца як норма. Мода выхоўвае і фармуе асаблівасьці ўспрыманьня супольнасьці і яе густ.

1970-я былі ня толькі дзесяцігодзьдзем «кепскага густу» — тады ўпершыню пачалі гаварыць пра рэальнасьць пагрозы экалягічнай катастрофы і ўзьнік «экалягічны падыход» да праблем у дызайне. Адзін з галоўных кірункаў — разумнае скарачэньне спажываньня, вяртаньне да якасных рэчаў «працяглага карыстаньня», выкарыстаньне няшкодных матэрыялаў, чыстых тэхналёгій і разьвіцьцё творчых здольнасьцяў чалавека. Саюз дызайнэраў Нямеччыны ў 1983 г. запатрабаваў «наяўнасьці ў прамысловым вырабе духоўнасэнсавай стымуляцыі», то бок каб рэч скіроўвала спажыўца да самастойнай арганізацыі сваёй жыцьцёвай прасторы, была элемэнтам «пазла», а не гатовай мадэльлю.

Згадайма яшчэ пра сучасную канцэпцыю побыту ў постындустрыяльным грамадзтве: менавіта ад якасьці нашага вольнага часу залежыць фармаваньне новых мадэляў культуры, каштоўнасных арыенціраў, дзе на першым пляне індывідуальнасьць, яе здольнасьці, радасьці, мары. Дык пра што гэта мы? Хіба не пра джынсы — проста зручнае адзеньне, экалягічнае, даўгавечнае, тое, што стымулюе дарошчваць сябе да таго вобразу, у якім будзе камфортна і радасна адчуваць сябе роўнымі ці лепшымі, марыць, працаваць, быць шчасьлівымі.

Шмат каму надакучыла быць пэрсанажамі старых савецкіх анэкдотаў, якіх змушаюць сядзець голай дупай на голай зямлі і думаць, што трапілі ў рай. Хочацца ўстаць і што-небудзь рабіць. Ня кожнаму сёньня яшчэ ўцям, што менавіта трэба рабіць, навошта і каго слухаць, але, каб пачаць, трэба найперш нацягнуць штаны (ці ўсьвядоміць нарэшце, што на табе яны ёсьць), і ня самы горшы варыянт, калі гэта — джынсы.

Ці дачакаецца Менск мэмарыяльнай таблiцы ў гонар Сымона Пятлюры? Артыкул украінскага гісторыка **Міколы Чабана**.



# Як украінцы рабілі рэвалюцыю ў Беларусі

У чэрвені я пабываў у Менску, на IV Міжнародным кангрэсе беларусістаў. Фатаграфуючыся ў цэнтры, там, дзе ў 1917-м зьбіралася Цэнтральная рада беларускіх арганізацый, я лавіў сябе на адной думцы: як цесна перапляліся гістарычныя лёсы беларусаў і ўкраінцаў. Лютаўская рэвалюцыя засьпела ў Менску ўкраінцаў, якім неўзабаве наканавана было стаць славутымі. *Аляксандар Яната* (1888—1938) — слынны аграном і батанік, правадзейны член Акадэміі навук УССР — у 1917 г. быў у Менску сакратаром Украінскага вайсковага камітэту Паўднёва-Заходняга фронту. *Васіль Аўраменка* (1895—1981) — вядомы ў сьвеце харэограф, актор, дасьледчык і знаўца ўкраінскіх танцаў. У Першую сусьветную знаходзіўся ў Менску.

Але самае знакамітае — імя Сымона Пятлюры. На Заходнім фронце Пятлюра займаў пасаду намесьніка ўпаўнаважанага Саюзу земства і гарадоў, які загадваў забесьпячэньнем арміі. Напаўваенная пасада дазваляла яму бываць у вайсковых часьцях, весьці палітычную работу сярод украінцаў. У красавіку 1917 г. ён арганізуе правядзеньне ў Менску ўкраінскага зьезду Заходняга фронту. Зьезд стварыў Украінскую франтавую раду на чале зь ім.

Далейшая біяграфія Пятлюры выпісана дэталёва. Ён быў на вачах. А папярэдні менскі пэрыяд выглядае цьмяна. Выручылі ўспаміны сучасьніка — вышэйзгаданага В.Аўраменкі, які з 1925 году жыў у Канадзе, а з 1928-га — у Нью-Ёрку, дзе і памёр.

Менскі пэрыяд жыцьця Васіль Аўраменка ўзнавіў ва ўспамінах «На хвалях рэвалюцыйных гадоў», апублікаваных у 1978 г. у альманаху Ўкраінскага народнага саюзу.

Родам Васіль Аўраменка зь вёскі Сьцебліў на Чаркашчыне. Напярэдадні падзей, якія апісваюцца, Васіль быў паранены і прыехаў у Петраград. Хадзіў, згадвае ён, у опэру, у тэатры. Уражальная дробязь — штрых эпохі: быў такі парадак, што параненыя мелі нашыўкі — яны сядзелі з жанчынамі, а ўсе палкоўнікі ці генэралы, пакуль сьвятло ня згасьне, — стаялі…

**Мікола Чабан**

*Менск—Днепрапятроўск, 23.07.2005*

## З успамінаў Васіля Аўраменкі «На хвалях рэвалюцыйных гадоў»

Паабяцалі мне водпуск на тры месяцы, а калі б я захацеў ажаніцца, дык і маёнтак прыпісалі б. Але я паппрасіў дазволу, каб адпусьцілі мяне паехаць на Беларусь, у Менск.

Камандаваньне згадзілася, далі мне досыць грошай, нават купілі шубу. Маючы водпуск і грошы, я захацеў сабе каманду ачуньваючых, прыехаўшы ў Менск. Сярод ачуньваючых быў такі Варвак, меў трупу «маларасейскую». Хоць сам ён быў жыд, ведаў нашу мову, умеў ставіць прадстаўленьні ўкраінскія. У трупе шмат было таксама жыдоўскіх актораў. На прадстаўленьні прыходзілі і генэралы, і шмат хто з генэральнага штабу.

Я вельмі любіў ставіць для салдат камэдыі. Але нядоўга давялося імі цешыцца, бо аднаго разу прыйшлі і абвясьцілі мне, што настала рэвалюцыя, хоць яны і былі з генэральнага штабу. Я спачатку ня мог дазнацца, што такое рэвалюцыя. «Цар адрокся ад прастолу», — сказалі. Я зьдзівіўся — як жа ж: а восьмай гадзіне мы яшчэ сьпявалі «Божа, беражы цара»!

Я распытваў яшчэ пра рэвалюцыю, ня мог зарыентавацца, хто такія дэмакраты, а хто сацыялісты. Вырашыў зрабіцца сацыялістам, загадаў зьняць царскі сьцяг, а павесіць чырвоны, хоць і ня ведаў сам, што і чаму. Сказаў толькі ўсім, і жыдам, каб ішлі заўтра зранку ў царкву, але каб ужо не сьпявалі «Божа, бе-

Як паведаміла дасьледчыца-беларусістка Патрыцыя Грымстэд-Кенэдзі, бібліятэка Пятлюры пасьля 1945 г. апынулася ў Менску. Містыка, заканамернасьць? Закон прыцягненьня?

ражы цара», а маліліся за Часовы ўрад.

Выйшлі з царквы, салдаты ўзялі мяне на рукі і нясуць па вуліцы, а там, у гарадзкім садзе, ужо сход — тысячы людзей! «Мы ёсьць дэмакраты, мы — за працоўны народ, зямля сялянам, а фабрыкі і заводы для рабочых!..» «Мы — сацыял-дэмакратычная партыя! Ура-а-а!» А я ж сам зь сялян, я ж афіцэр, то я сабе і давай прамаўляць… Напісаў верш пра Расею. Я ім той верш прачытаў, а адзін бедны да мяне падступае і просіць, каб я яму даў «адзін хутарок», бо ў яго аж шасьцёра дзяцей…

На другі дзень я ўжо сабе вяду справы, калі раптам паведамляюць, што дэлегацыя прыйшла, Яната і Кавярдзінскі, першы — міністар нейкі. Павіталіся і дадалі: «Мы чулі, як вы прыгожа па-ўкраінску гаварылі». Я зьдзьвіўся, што яны сказалі «па-ўкраінску», а не «па-маларасейску», узрадаваўся. Яны паведамілі, што сёньня ў «Беларускай хатцы» ўвечары будзе сход некалькіх украінцаў, там будзе рэдактар Пятлюра, украінец зь Петраграду, будзе Лебядзінец, Ільляшэвіч, Прыходзька, Сіманенка і яшчэ нейкія дзьве жанчыны.

Узялі мяне ў карэту. Абкружылі «Беларускую хатку» аховай, каб ніхто лішні не зайшоў. Я прыехаў з маім ад’ютантам Іваненкам, які згадзіўся наводзіць парадак пры ахове.

На сходзе ўстаў С.Пятлюра і прамаўляў недзе з гадзіну, асабліва пра ўкраінскую губэрню. Я тады ўзьняўся і папрасіў, зьвярнуўшыся да яго «Сымон Васілевіч»: «Прашу мне падаць назвы губэрняў украінскіх». Ён падаў мне недзе з 12 і сказаў, што прыедзе Гучкоў (У 1917 г. ваенны і марскі міністар у Часовым урадзе. — **«НН»**), і будзе вялікая нарада, а таксама што ўжо ёсьць Украінская Цэнтральная Рада; прыедзе палкоўнік Навахацкі зь Зялёнага Кліну, будуць хоры. Яшчэ ён сказаў так: «Як ужо пачнецца нарада і засьпяваюць «Мы ахвяраю ў баі»… па-ўкраінску, усе украінцы павінны заняць свае пазыцыі і нешта сказаць па-ўкраінску». Усё так і адбылося, і я там меў свой пункт. Адбылася нарада, за намі ішлі жыды…



**Абвяшчэньне незалежнасьці Ўкраінскай Народнай Рэспублікі на Сафійскім майдане ў Кіеве 20 лістапада 1917. У цэнтры — С.Пятлюра.**

Але пасьля нарады пачалася «кераншчына», пайшлі зьезды. Мы ўхвалілі сабраць украінцаў у Менску. Сымон Пятлюра тады быў у Земскім саюзе (...) ваенным чыноўнікам. Ён паклапаціўся пра залю вялікую, і мы дамовіліся, што нас прыйдзе недзе шасьцёра-сямёра, выберам прэзыдыюм.

Прыйшлі з Кавярдзінскім, а наглядальнікі, выключна з панямі, кажуць: «О, гэта маларосы зьбіраюцца», а нехта крыкнуў: «Камітэт!» Калі менавіта тут Пятлюра ідзе, дзякуй табе, божа. Кавярдзінскі кажа: «Вы будзеце старшынём збораў, я буду адкрываць, а ўсе астатнія — члены». Пятлюра ідзе, мы за ім, а тут нехта зноў крычыць: «Камітэт!» Кавярдзінскі ўстае і ня ведае, як гаварыць: «Гаспада, я прапаную сёньня абабраць старшынём гаспадзіна Пятлюру». А ўсе на тое: «Харашо, харашо», — запляскалі.

Пятлюра падняўся, ужо як старшыня, усе заціхлі, адбываліся зборы. Потым палкоўнік Жукоўскі (зь лістапада 1917 г. міністар ваенных спраў, міністар працы, увесну 1918 г. — міністар ваенна-марскіх спраў ва ўрадзе Ўкраінскай Народнай Рэспублікі. — **«НН»**) устаў і закрычаў: «Гаспадзін старшыня, я маю ўкраінскае сэрца і душу, я ня ўмею па-ўкраінску гаварыць, але я зараз памру за Ўкраіну!» — пасьля таго, як мы засьпявалі «Шчэ не вмэрла Ўкраіна»… А я сабе і кажу:



**Сымон Пятлюра.**

«Дайце мне сказаць», — і толькі перамяніў у вершы пра Расею на Ўкраіну, а ўсе — «Ура-а!». Ужо мы маем сваю Цэнтральную Раду, свой хор, а ў Кіеве ўжо нашы палкі і г.д., вайсковы зьезд. Я ўжо парабіў казацкія жупаны, залатыя пагоны, шапкі з аколышкамі, хоць Керанскі і забараніў, мы ж былі яшчэ ў фэдэрацыі.

Сабраліся: Пятлюра, дваццаць чалавек, тры вагоны, паравоз, кулямёты — і ў Кіеў. Яны паехалі, а мы тут засталіся, палк[оўнік] Навахацкі і іншыя…

Kali pinskamu probaŝču Kazimieru Śviontku nadali hodnaść arcybiskupa, Vincuk Viačorka spytaŭsia: «Čamu nie biełarusu Čarniaŭskamu?» Na hetaje pytańnie ja adkazaŭ parasiejsku: «Простоват отец Владислав». Piša **Anatol Sidarevič**.

Takuju vysnovu ja zrabiŭ paśla adnaje-adzinaje maje sustrečy z hetym śviatarom.

Niekali ŭ «Našaj Nivie» drukavaŭsia zdymak ajca Ŭładzisłava: stary ksiondz ks.Čarniaŭskaha nie było «pryrodnaj i nadpryrodnaj razvažnaści, čym jon nastrojiŭ suprać siabie častku ludziej, nia kažučy pra ksiandzoŭ».

Hetyja słovy naležać biskupu Česłavu Sipoviču. Mienavita jon, tady jašče nie ŭładyka, razam ź jinšymi biełaruskimi hreka-katalickimi śviatarami i najpierš z «łacinskim» administrata-ram Mienska-Mahiloŭskaje dyjaceziji Bałasłavam Słoskansam chadajničaŭ pierad papam Janam XXIII ab pryznačeńni ryma-katalickaha biskupa Biełarusi. I było toje ŭ lutym 1960 h. Voś jak. Cikava, ci chadajničali ciapierašnija rymska-katalickija biskupy Biełarusi ab pryznačeńni archireja dla hreka-katalikoŭ?



**Аляксандар Надсан**. Біскуп Чэслаў Сіповіч: сьвятар і беларус. — Менск: МГА «БелФранс», 2004.

# Pijanerskaja praca

z abiaremkam knih… Jon byŭ, jak i należyć ksiandzu, knižnikam, prapaviednikam Evanhiella, ale nia byŭ dyplamatam, nia byŭ, pavodle apostała, rachmanym, jak hołub, i chitrym, jak źmiej. Chto raźnios siarod tutejšych polskich dy apalačanych ksiandzoŭ viestku ab kantaktach Vatykanu z a.Uładzisłavam ab tym, što Śviaty Pasad razhladaje pytańnie pra katedru dla jaho, i tym samym ustryvožyŭ vychavancaŭ archibiskupa Ramualda Jałbrzykoŭskaha? Nie vyklučaju, što jon, jašče nie atrymaŭšy mitry i pastarali, moh i pryhrazić tym ksiandzam, jakija miesca biełaruskaje movy bačyli adno ŭ chlavie.

Patrebu biskupa dla Biełarusi adčuvaŭ kožny, chto sutykaŭsia z kaścielnym žyćciom. Musić, tamu ja ŭ dumkach i prymiervaŭ mitru da kožnaha ź viadomych mnie śviataroŭ. I zrabiŭ vysnovu, što pavažany ks.Čarniaŭski biskupam być nia moža. I voś praz hady paśla taje sustrečy i paśla hutarki ź Vincukom Viačorkam ja čytaju, što ŭ

Uładyka Česłau sumniavaŭsia nakont ks.Čarniaŭskaha, ci atrymaje toj «vysokuju acenku paźniej u historyji». My ž viedajem, što a.Uładzisłaŭ niezaležna ad sanu karystaŭsia pavahaju kulturnych ludziej pry žyćci i pakinuŭ pa sabie viečnuju pamiać jak pieraktadčyk Novaha Zapavietu. I jon, uładyka Česłaŭ, pakinuŭ pa sabie pamiać nia stolki biskupstvam, kolki zasnavańniem Biełaruskaje biblijateki ŭ Londanie.

Akcentujučy na hetym uvahu, aŭtar razhladanaje knini mitraforny protapraśviter Alaksandar Nadsan piša, što z usich prajektaŭ i inicyjatyŭ biskupa Sipoviča mienavita «Biblijateka imia Franciška Skaryny stałasia najbolš tryvałaj i daŭhaviečnaj».

Viedajučy mitrata Nadsana jak talenavitaha palemista (zhadvaju tut jahony źjedlivy artykuł ab «pravasłaŭnaj filalohiji» ŭ «ARCHE»), ja bajaŭsia, što aŭtar daść sabie volu. I choć u tekście a.Alaksandra praryvajucca notki niezdavolenaści z taje pryčyny, što biskup Sipovič naležaŭ da ordenu maryjanaŭ, jamu ŭdalosia paźbiehnuć adnabakovaści ŭ aśviatleńni dziejnaści ŭładyki Česłava.

Kazać, što spravy maryjanskija (a mienavita vykanańnie biskupam Sipovičam abaviazkaŭ kiraŭnika ordenu ŭ 1963—1969 h.) škodzili spravam carkoŭna-biełaruskim, nie vypadaje. U takoj ža miery možna było b pisać, što vykanańniu archirejskich abaviazkaŭ škodziŭ udzieł biskupa ŭ pracach II Vatykanskaha Saboru. Siadzieŭ ža ŭładyka biazvyjezna ŭ Rymie kožnuju sesiju Saboru… Dy za heta dakarać było b niekarektna.

Viadoma, mnohaje zaležyć ad biskupa, ale nia ŭsio. Ajciec Janka Sadoŭski nie zachacieŭ być śviatarom, a.Kastuś Maskalik vyklikaŭ narakańni parafijanaŭ u Francyji… A duchavienstva brak. Sytuacyjŭ vyratoŭvaje toje, što ŭ domie maryjanaŭ u Londanie majecca adnosna małady manach Leŭ Haroška. Jon i razryvajecca pamiž Londanam i Paryžam. Nareście

a.Leŭ pakidaje stalicu Złučanaha Karaleŭstva. Ajciec Alaksandar tłumačyć heta tym, što pamiž archimandrytam dy kimści vynikła nieparazumieńnie nakont taho, jak pastavić palicy ŭ biblijatecy. Adnak aŭtar razumieje, što takoje tłumačeńnie niedastatkovaje, i piša pra indyvidualizm a.Haroški dy pra toje, što hety śviatar pryvyk doŭhija hady pracavać samastojna. Hety druhi tezis niejak nie stasujecca z tym, što było paśla. A paśla a.Leŭ zamianiŭ a.Piotru Tatarynoviča na pasadzie dyrektara biełaruskich prahram na Vatykanskim radyjo, i pad jaho kiraŭnictvam «biełaruskija prahramy ŭźnialisia na rovień, nie pierasiahnuty da našych dzion». Nia dumaju, što zakaraniełу indyvidualist zmoh by naładzić pracu redakcyji i užycca ŭ niemałym dy šmatmoŭnym kalektyvie radyjo. Zrešty, ludzi, nadzielenyja niezdarovym indyvidualizmam, jak praviła, nie vytrymlivajuć seminarska-akademičnaha dy klaštarnaha režymu i abo sami pakidajuć hetyja supolnaści, abo hetyja supolnaści vyciaśniajuć jich. Z ajcom Haroškam hetaha nia zdaryłasia. A znany paryski biełarus Michaś Naŭmovič nazyvaŭ jaho vialikim śviatarom i čałaviekam ahramadniejšaj kultury (hł. pradmovu da knihi «Miesca vydańnia — Paryž»). Dumajecca, što vyjezd archimandryta ź Londanu mieŭ dadatkovyja pryčyny, a dla aśviatleńnia hetaha kanfliktu patrabujucca charaktarystyki jinšych jaho ŭdzielnikaŭ.

Biskup Sipovič zastaŭsia biez svajho niefarmalnaha vikaryja, superyjora maryjanskaha domu. Paśla adjezdu a.Haroški hetuju pasadu zaniaŭ daŭno nie małady a.Jazep Hiermanovič. A novych śviatarskich i manaskich paklikańniaŭ nie było. Ščaślivym vykliučeńniem stałasia vyśviačeńnie a.Raberta Tamušanskaha (1966), jaki zamienić archimandryta Lava na Vatykanskim radyjo. Praź dziesiać hadoŭ paśla hetaha vyśviačeńnia pačniecca zaniapad i domu biełaruskich maryjanaŭ, i Biełaruskaje katalickaje misiji ŭ Londanie.

Mitrat Nadsan piša: «Na paklikańni siarod moładzi raźličvać nie davodziłasia». Na žal, jon nie tłumačyć hetaha tezisu. Na maju dumku, ci nie haloŭnaja pryčyna była ŭ niešmatlikaści biełaruskaje emihracyji naahul i ŭ małalikaści hreka-katalickaje hramady na Zachadzie ŭ pryvatnaści. Padruhoje, ludzi, jakija pieražyli niastačy i hoład, nie mahli nie paddacca čaram hramadztva spažyvańnia, nie addacca hiedanizmu, na jaki zachvareła Eŭropa. I tut, na Baćkauščynie, ja baču, jak adzin vypusknik katalickaha ŭniversytetu zamiž taho, kab vyśviačacca, idzie ŭ biznes, druhi źjaždžaje ŭ bahatuju Ameryku i robicca tam — dobra i heta — pravasłaunym śviatarom, a treci… Mitrat Nadsan piša ŭ svajoj knize pra internat dla chłopcaŭ imia śv.Kiryły Turaŭskaha, što mieŭsia pry Biełaruskaj katalickaj misiji. U internacie jich vychoŭvali biełaruskija śviatary. I nivodzin z tych vychavancaŭ nie apranuŭsia ŭ ryzu (kali b zdaryłasia, što niechta ź ich staŭ śviatarom, a.Alaksandar heta adznačyŭ by). Jašče ciažej z manaskimi paklikańniami. A manastva jość aporaj, staŭpom hreka-katalickaje carkvy. I manachaŭ najpierš vyśviačajuć u biskupy.

Z časoŭ śv. papy Kipryjana Kartahienskaha viadoma: chto nia ź biskupam, toj nie ŭ carkvie. Heta značyć i toje, što biaź biskupa carkvy ŭ ścisłym značeńni hetaha słova niama. Mienavita heta i mieŭ na ŭvazie ukrajinski archibiskup Ivan Bučko, kali paśla chiratoniji ŭładyki Česłava adznačyŭ, što Katalickaja Carkva ŭschodniaha abradu siarod bełarusaŭ adnaviłasia. I sam a.Alaksandar piša, što vyśviačeńnie pieršaha ad 1839 hodu biskupa davała nadzieju na lepšuju budučyniu Biełaruskaje Hreka-Katalickaje Carkvy.

Ad biskupa zaležyć mnohaje, ale nia ŭsio. Atrymaŭšy 7 lipienia 1960 h. dobry šaniec, BHKC mieła jaho da śmierci 2 studzienia 1986 h. biskupa Ŭładzimiera Tarasieviča, nastupnika uładyki Česłava, taksama, nota bene, manacha. Čamu jana straciła hety šaniec u zamiežžy, ja, zdajecca, častkova pakazaŭ. I kali pry aktyŭnym udziele aŭtara razhladanaje knihi pačałosia adradžeńnie Uniji na Baćkaŭščynie, Carkva była ŭ stanie hierarchičnaha siroctva. U stanie paŭsiroctva jana znachodzicca i ciaper.

Kniha a.Alaksandra, pabudavanaja na asabistych uspaminach, zapisach Česłava Sipoviča dy jinšych krynicach, napisanaja dobraju movaju, stylova vytrymanaja, źjaŭlajecca pieršaju hruntoŭnajŭ pracaju z najnoŭšaje biełaruskaje carkoŭnaje historyji. Viadoma, na bazie novych krynic temu daśledavańnia buduć raspracoŭvać jinšyja aŭtary, ale pijanerskaja praca a.Alaksandra zaŭsiody budzie ŭ jich pad rukami.

## НОВЫЯ КНІГІ

**Осада Пскова глазами иностранцев: Дневники походов Батория на Россию (1580—1581 гг.)** / Вступ. ст. и коммент. А.А. Михайлова; Биогр. очерк Н.Ф. Левина. — Псков: Псковская областная типография, 2005. — 504 с.: ил.

Грамадзкую думку Расеі і цяпер хвалюе выправа Батуры. Пскоў войскамі Рэчы Паспалітай ня быў узяты. Затое ВКЛ вярнула Полацак, вызваліла Інфлянты, а Батура рушыў на ўсход. У войску знаходзіліся мэмуарысты, што пакінулі ўспаміны пра паход. Мэмуарыстыка і рэгулярны абмен інфармацыйнымі лістамі («рукапіснымі газэткамі») сталі пэўным фэномэнам шляхецкай культуры ВКЛ і Рэчы Паспалітай у XVI—XVII ст. На расейскую польскамоўныя дыярыюшы перакладаліся некалькі разоў у XIX ст. Пераклад настаўніка гісторыі пскоўскай гімназіі Арэста Мілеўскага, апублікаваны ў 1882—1897 г., быў поўным, таму яго і ўзнавілі ў выданьні 2005 г.

Нягледзячы на палітычныя і канфэсійныя прыхільнасьці, у дыярыюшах аўтары апісвалі найперш свае ўражаньні. Гэта не былі нататкі культуртрэгераў, што глядзелі на расейцаў як на барбараў. Аддавалася належнае вайсковым якасьцям ворага, а стрыманае апісаньне сцэны з расейскім палонам здольнае выклікаць спачуваньне да апошніх: *«Садзіўшыся на стругі, палонныя прасілі гетмана, каб ім было дазволена разьвітацца са сваімі, на што гетман і пагадзіўся. Яны, ад'яжджаючы, кланяліся адзін аднаму, цалавалі зямлю і наўзрыд плакалі. Паміж імі быў адзін па імені Мікула, чалавек прыгожы, прыемны, статны і малады. […] Разьвітваючыся з маці, тройчы пакланіўся ёй да зямлі, потым, абліваючыся сьлязьмі, з гучным рыданьнем цалаваў яе. Разьвітаўшыся з маці, адпаясаў шаблю ды аддаў сыну. Калі мы запыталіся, навошта ён аддае шаблю, ён сказаў: «Навошта мне гэтая шабля? Учора я ня здолеў абараніцца ёю, так што мне ня варта насіць яе»*.

Цікава, наколькі розны досьвед можна вынесьці з вайны. Роспач, заклік да помсты, пачуцьце нянавісьці. У гэты шэраг трапляе сузіраньне.

**ADz**

# Блазен Гасподні

Гэта ў Карла Маркса чалавецтва, сьмеючыся, расставалася са сваёй мінуўшчынай. У Віктара Шалкевіча беларусы, сьмеючыся, аплакваюць сваю сучаснасьць. Піша **Аляксандар Фядута**.

Гарадзенцы — дзіўныя людзі (па сабе ведаю). Яны чамусьці ўпэўнены, што нават сонца ўстае на захадзе. Удакладнім: сонца свабоды ўстае на захадзе Беларусі. Гэтая фармулёўка трохі больш карэктная, а таму паспадзяёмся, што пан рэдактар ня будзе яе выпраўляцьа.

Беларусь расколата мэнтальна. Лінія расколу — мяжа паміж Беларусьсю Заходняй і Беларусьсю Ўсходняй, паміж Гарадзеншчынай і Шклавіцяніяй, паміж фальваркамі і саўгасамі, свабодай сумленьня і напаўпрымусовым праваслаўем.

Адбываецца гэты раскол і ў беларускай паэзіі. Там, у Шклавіцяніі, застаюцца бясконцыя зборнікі Навума Гальпяровіча і Раісы Баравіковай, тужлівыя лепятаньні неўміручага сьпевака бабчынскіх палёў і нескладушкі аўтара шлягеру «Таварыш Прэзыдэнт, настане той мамэнт». На Гарадзеншчыне гучаць вытанчаныя творы а-ля барока Юрася Пацюпы, гулкім рэхам адбіваюцца ад сьцен старога замку нечаканыя (для чалавека яго пакаленьня) паэтычныя валторны Юркі Голуба.

Але галоўным голасам Гарадзеншчыны, свабоднай і разьняволенай, стала гітара Віктара Шалкевіча.

Худы, нязграбны, адзначаны блазенскімі грымасамі, вылупленымі вачамі і задзёртым да неба — маўляў, зірні, Госпадзі, на твор рук сваіх! — і без таго вялікім носам, выходзіць Шалкевіч на тэатральную сцэну, каб прасьпяваць свае вершы.

Так сьпяваў Аляксандар Галіч. Так сьпяваў Булат Акуджава. Так сьпяваў Уладзімер Высоцкі і сьпявае Цімур Шааў. Вершы былі для іх важнейшыя за музыку.

Шалкевіч нашмат больш музыкальны. Але і для яго вершы — важнейшыя. Ён, прафэсійны артыст, разумее, што спачатку было — Слова.

Добрай раніцы, жлобская нацыя!
(Сонца ўзыходзіць лупатае.)
Добрай раніцай, жлобская нацыя!
(А ніхто дурную ня сватае.)

І — усё ж сказана. Сапраўды, хто ж пасватае нявесту, жлабаватую і дурную, няздольную крытычна зірнуць на сябе збоку? Ніхто. Нікому такая не патрэбна. А калі і спатрэбіцца — значыць, выгады жаніх шукае.

Чатыры радкі — і пастаўлены дыягназ усяму народу. Дыягназ дакладны і неаспрэчны, як прысуд.

Шалкевіч і ўсю нацыянальную гісторыю здольны ўкласьці ў некалькі ліхіх куплетаў полькі-трасухі — і таксама зьвёўшы яе да дыягназу:

Бо нейкія засранцы
Папсавалі танцы.
Худыя, як цьвікі.
Кажуць, што бальшавікі.

Дапусьцім, іншы раз танцору ня толькі бальшавікі замінаюць, але і немцы, палякі, Калякіны і Мілінкевічы, пісьменьнікі і паэты. Але гэта — нацыянальная рыса.

Народ стаіць і толькі пазяхае.
Грукнулі сенцы:
завіталі немцы,
У вантробе прыпякло так,
што з носу пацякло.

А народ пры гэтым працягвае стаяць і пазяхаць. І хто б там яго ні прыпякаў, немцы, палякі ці бальшавікі, пазяхаў ён і будзе пазяхаць. І ўсю сваю Гісторыю прамаргае, як прамаргаў сувэрэнітэт, дэмакратыю, мову.

Шалкевіч падыходзіць да гісторыі Беларусі канцэптуальна. Яе мінуўшчына для яго — крыніца ўсіх сёньняшніх заган і хвароб.

Войт нашае гміны Гарбоўскі Васіль
У свой час жабраку гаварыў:
«Бяры залатоўку, маліся што сіл,
Каб хам нігды панам ня быў!»
Але час мінуў — і пагляньце-ка вы:
Нібы там чыясьці рука
Прымкнула касьцёлы, пабіла званы,
На цэрквах заместа крыжоў — груганы,
Жыцьцё чалавека ня мае цаны,
Няма ўжо ні войта, ані жабрака,
Затое ёсьць хамская ўлада —
Подласьць і здрада,
Хамская ўласьць —
Чорная масьць.

Хто ў гэтым вінаваты? Галеча наша вінавата. Бо хамская ўлада — улада ўчарашніх жабракоў, якія дарваліся да магчымасьці адпомсьціць усім за ўласную галечу, але больш культурнымі ад гэтага не зрабіліся.

Гляджу: што ні пан — то ўчарашні жабрак,
Падраныя боты, прыпалены фрак,
Але ж морду дуе, трымаецца так,
Як быццам шляхецкай крыві.

Справа ня ў тым, шляхецкая кроў цячэ ў жылах канкрэтнага чалавека ці кроў сялянская. Рэч у сьветаадчуваньні. Чалавек, які помсьціць усяму сьвету за свае падраныя боты, іншай улады, апроч як хамскай, ажыцьцявіць проста ня можа. Такая проза жыцьця.

Шалкевіч — страшны судзьдзя. Таму што ён — судзьдзя вясёлы. Ён чыніць свой суд над намі ўсімі так,

**Працяг на старонцы 38.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Віктар Шалкевіч у спэктаклі «Тутэйшыя» Гарадзенскага тэатру лялек.**

# Блазен Гасподні

**Працяг са старонкі 36.**

што іншы раз і не разумеем мы, што з нас сьмяюцца.

Я помню той самы зьезд БНФ, на якім нечакана для ўсіх ня выбралі Зянона Пазьняка. У канцы першага дня зьезду на сцэну выйшаў Шалкевіч, прывычна трасянуў галавой, як жарабец, што застаяўся ў стойле ды нарэшце вырваўся на волю, і засьпяваў. Адну песьню, другую, трэцюю…

Трэцяя песьня была пра парсючка, якога чакае самае страшнае з хірургічных умяшаньняў:

Кастрацыя! Кастрацыя!
Чык! Чык! Чык!

Заля аплядзіравала ледзьве ня стоячы. Шалкевіч так пацешна круціў вачамі, паказваючы парсючкоў жах, што ніхто, заходзячыся з рогату, нават не ўслухоўваўся ў рытмічную аснову гэтага самага «Чык! Чык! Чык!». А дарма. Таму што менавіта гэтым рытмам пачаўся дзень таго зьезду БНФ — стоячы сьпявалі песьню Сокалава-Воюша: «Фронт! Фронт! Фронт!»

Шалкевіч — страшны судзьдзя. Таму што ён — судзьдзя вясёлы.

Песьня пра парсючка, як і многія іншыя Шалкевічавы песьні, аказалася прарочай. Зьезд на гэтым і скончыўся — дэ-факта: «Чык! Чык! Чык!»

Але там, як і ў выпадку зь няшчасным парсючком, — трагедыя. А вось, здавалася б, найчысьцейшы фарс — «Таварыш Сапега»:

«Сплашное вакруг казнакрадзтва!
Кругом — свалач'ё і врагі!
Нет веры ў обшчэславянскае братства,
Туманяць народу мазгі!
Хранеець народ без работы!
Крэсьцянская гібне сяло!» —
І крупныя каплі крывавага поту
Яго арашалі чало.

Ня фарс. Тут трагедыя ўжо куды большая будзе — біблійная. «Таварыш Сапега» ўсьведамляе сябе мэсіяй, закліканым ўратаваць свой народ, выкупіць яго няшчасьце. І буйныя каплі крывавага поту — не ад чырвонай шапкі (чытай: шапкі Манамаха!), а ад цярновага вянка, ад мукі з прычыны ўласнай велічы.

Пры гэтым Шалкевіч ня кпіць. Ён чалавек веруючы. У яго свой Бог — старэнькі, які ідзе па дарозе і застаецца непазнаным пастырам душ чалавечых, што абганяе Бога, седзячы за рулём «мэрсэдэса». Кожнага разу, калі бачу айца Фёдара Поўнага, які выходзіць з аўтамабіля, я ўспамінаю гэты верш (ня песьню — верш!) Віктара Шалкевіча. І робіцца страшна за старэнькага Бога: Шалкевіч паўтарае калізію легенды пра Вялікага Інквізытара Дастаеўскага. Не сумняваюся, што Вялікі Інквізытар у наш час таксама мусіў бы падкаціць да турмы, у якой пакутаваў Збаўца, ня менш як у «мэрсэдэсе». А чым там у Дастаеўскага скончылася, спадзяюся, чытачы ведаюць…

Але Шалкевіч верыць у дабро. Дабро ўвасабляе для яго сьвяты Мікалай — калядна-навагодні сьвяты, які зьяўляецца да дзяцей, каб хоць на хвілінку зрабіць іх шчасьлівымі.

Сівабароды добры дзед,
Ён не забыўся пра цябе,
Як і пра ўсіх — малых, лупатых і цікаўных.
Яму абрыднула язда,
І нам, бацькам, яго шкада,
А што рабіць? Яшчэ хвілінку пачакаем.

У гэтай гісторыі — два пункты гледжаньня, нібыта ілюстрацыя да тэорыі Марціна Бубера. Адзін пункт гледжаньня — бацькі, які апавядае гісторыю і добра ведае — як і ўсе дарослыя, — што сьвятога Мікалая не існуе. А ёсьць толькі артыст, якога нанялі (у найлепшым выпадку, у найгоршым — трохі падвыпіўшы сусед у касьцюме Дзеда Мароза). Ён адбудзе нумар, вып'е чарку і паедзе па наступным адрасе.

І ёсьць дзяўчынка. Якая, у адрозьненьне ад бацькі, ведае дакладна: сьвяты Мікалай існуе. Проста таму, што дабро павінна існаваць заўсёды. І Мікалай — яго ўвасабленьне. Не дарма пра яго хуткі прыход паведамляе дзяўчынцы анёл Гасподні.

Стары, дасьведчаны анёл,
Айца нябеснага пасол,
Штогод у наш дом з навінай добрай
прылятае.
А ты, цікавая ўсяго,
Ізноў з пытаньнем да яго
Пра таямнічага сьвятога Мікалая.

І анёл адказвае ёй па сутнасьці.

Ёй — маленькай, цікаўнай, добрай. Ёй — можна адказваць па сутнасьці. А з дарослых можна і пасьмяяцца: «Чык! Чык! Чык!»

У Анатоля Франса ёсьць цудоўнае апавяданьне пра сярэдневяковага скамароха-жанглёра. У сьвята Багародзіцы ён ня мог нічога падарыць ёй, апроч свайго мастацтва. І ён падышоў да статуі Маці Божай і пачаў жангляваць адной рукой, стоячы на другой, — вось так, дагары нагамі. Прыёр хацеў прагнаць яго: маўляў, блюзьнерыць, пудзіла гарохавае! Але яго спыніў стары манах:

— Падрэ, няўжо вы ня бачыце?!

Побач з жанглёрам стаяла нябачная для сьмяротных Дзева Марыя і хусткай сваёй выцірала зь ягонага лба пот.

У Шалкевіча ёсьць свая Багародзіца — Беларусь. І ён ёй служыць як умее. І калі-небудзь, калі апроч дыскаў зь яго песьнямі выйдзе ў сьвет і яго кніга, ён прыйдзе ў храм да Свабоднай Беларусі, пакладзе кнігу да аўтара і сьпяе. Пра таямнічага сьвятога Мікалая. Пра старэнькага Бога, якога не пазнаў важны сьвятар у «мэрсэдэсе». Пра маленькую дзяўчынку Камінскую Е. І нават пра Ганку — дзеўку з Пагулянкі. І калі ён адкладзе ўбок гітару і схіліць калена, Найсьвяцейшая абавязкова сатрэ пот зь ягонага лба. Бо ён быў шчыры і верыў у Дабро.




**З 10 студзеня Нацыянальная бібліятэка спыніла абслугоўваньне чытачоў у сувязі зь пераездам у новы будынак. Каб перавезьці гіганцкія фонды, спатрэбіцца чатыры месяцы: адчыніць новую бібліятэку абяцаюць 10 траўня.**



аповесьць

# Шлях дробнай сволачы

**ЕВА ВЕЖНАВЕЦ**

*Праўда сякеры — хлусьня для камля.*
*Праўды ў сьвеце няма. Ля-ля.*

**Люба — журналістка радыё «Вольная Беларусь». Яе сястра Віка працуе ў газэце «Савецкая Беларусь». Зрэдзьчас яны сустракаюцца на «нэўтральнай тэрыторыі», у сталоўцы, што ляжыць між рэдакцыямі. Там Люба і дазнаецца, што іх абаіх нечакана выклікаюць дахаты бацькі...**

**Працяг. Пачатак у №1.**

Мы вокамгненна залезьлі на закінуты пограб, пабралі апалыя сукі, а ўнізе заскакалі й загаўкалі два калматыя зубатыя кундалі. Гаспадыня не паказвалася.

— Добры дзень! Гэта прысада нашай радні. Яны нам дазваляюць лазіць, — пракрычала я нябачнай кабеце.

Бэзавыя кусты рассунуліся, і з суседняга гароду вылезла босая пажылая жанчына — карычневая кохта, шарая спадніца. Задрала галаву, аздобленую плястыкавым грэбнем.

— О, героевы дзевачкі! Злазьце. Пайшлі прэч, ваўкарэзіны вы! — Апошняе — сабакам. — Я думала, гэта малыя зноў цярэбяцца. Хадземце ў хату, я вам малачка дам.

— Не, дзякуй. А вы адкуль нас ведаеце?

— А вы й не пазналі! Усё ў бібліятэку да мяне бегалі, як маленькія былі.

Мы вырачыліся на старую кабету. Некалі Вольга Мікалаеўна насіла прычоску «куклаю», хадзіла ў сарафане зь белай блюзкай і з брошкаю пад горлам. Раз выгнала нас зь бібліятэкі, бо мы прыйшлі туды ў купальніках. Цяпер жа перад намі стаяла бабка, босая й загарэлая.

Мы выйшлі за ёю на дарогу.

— Як ня хочаце ў хату, то давайце тут сядзем, — Вольга Мікалаеўна падабрала спадніцу, апусьцілася проста ў пухкі пыл і ўтапіла ў ім худыя ногі. Я села на раму ровара, Віка засталася стаяць, дзівуючыся на Мікалаеўну. Нам карцела ўведаць, што зь ёю сталася.

— Чуваць, вы абедзьве ў Мінску, на добрай рабоце, але паразводзіліся. Чаго вам не жылося? — запыталася старая.

— А так, ня выйшла жыцьцё, — адказала Віка.

Было відаць, што бабка ня так прагне слухаць, як гаварыць:

— А майго ж насьмерць парэзалі, мама вам не казала? Шахвараст гэты рыжы сьцебануў старою касою. Пасядзеў у Слуцку, а цяпер выпусьцілі яго. Трыццаць гадоў паскудзіць — то цяля ўкрадзе, то хлеў людзям падпаліць. І нічога яму ня зробіш — сын палкоўнікам у Слуцку. А Івасечка мой зь дзяцінства быў павалячка. Я помню, як малы быў, немцы яму ўсю кроў адкачалі. Ледзь выхадзілі. Крываножанькі быў, лысенькі, зь сінякамі пад вачыма, белы, як той сыр. І вось усё жыцьцё абы-як, то бокам, то скокам. Вывучыўся, пайшоў на водаканал, шлюзы ставіў, канавы аплетаў. Ён ужо і стары быў, а сто пяцьдзясят тысяч свае браў. Як няшчаснага дык і грошы губяць. Унадзіўся да Тані хадзіць, да суседкі — ёй 27, п'е як халява, а яму ўжо 65 было. Я яму казала: ёй ня ты, ёй грошы твае патрэбны! Не паслухаў, так



**Ева Вежнавец** — пісьменьніца. Жыве ў Менску.

— Слухай, нічога ня будзе, пакуль ён не памрэ, як ты гэтага не разумееш!

і бегаў туды. Усе грошы туды аддаваў, я яго й выгнала. А яна яго не карміла, краў у мяне малако, бедны. Пастаўлю вядро здаваць, а ён літар украдзе і вадою дальё. Ох, я яго падлавіла, дык саляраю і абліла, сьпічкі трымаю напагатове й кажу: ах жа ж ты пайшоў да тае халявы, дык яшчэ і малако маё піць будзеш! Падлаўлю яшчэ, дык падпалю! Так ён і пайшоў. А тады той дурны зазлаваў, ведама, сам там кавалерыўся, стаў біць майго старога. Той у міліцыю. Участковы пагаварыў з гэтым рыжым — і больш нічога! А тады Іваська пагнаў кароў адпасваць ды заснуў, а рыжага карова наелася медуніцы з малачаем ды здохла вечарам. Ох жа ж той і захадзіўся! Зьбіў Іваську на горкі яблык. Я кажу: падавай у суд! Ну, і прысудзілі таму 3 мільёны штрафу. Усё з хлява павыводзіў. А мой стары якраз да мяне перайшоў. Ну раз едзем мы канём, купілі парасят у Дамашанах, а той гад плот абкошваў, як угледзеў нас, дык за касу, скок к нам — і разануў! Мне нічога, толькі трохі парэзаў, а ў Івасіка й мяса й кішкі вылезьлі. Павезьлі ў Слуцак — ды што там ужо было везьці. А гэтаму белы білет далі, ён зноў тут. Ох, падпалю я яго!

Мікалаеўна гаварыла доўга, Віка спачувальна слухала, а мне не цярпелася змыцца. Такіх гісторый у нашых пастаралях процьма. У Мікалаеўны сваё жыцьцё, у мяне сваё. Малако, хлеб і вопратка ў яе ёсьць. Дровы й сена дадуць улады. І заслужана дадуць. Гэтая ж самая Мікалаеўна (цяпер я яе ідэнтыфікавала) хвалілася летась у краме: «От жыцьцё дык жыцьцё! Некалі я ў школу хадзіла, ламаючы голымі пятамі лядок, а цяпер кум каралю — дзьве пары ботаў маю: адны свае, другія дачка аддала!» На мінулых выбарах, як бацька сядзеў у камісіі, а я прыйшла паглядзець, такая бабка, праходзячы ля партрэта прэзыдэнта, загаласіла:

— Ох, харошанькі ж ты мой, галубочак, так ужо пазірае сваімі вочачкамі!

Ягонаму ж канкурэнту бабка тыцнула дулю: «На табе, воўчая поўсьць! Бач, чаго захацеў!»

Тут праявіліся і жаночае пачуцьцё да асаністага прэзыдэнта, і своеасаблівая культура. Выбары ў беларусаў праходзяць раз на пакаленьне. Іншае ўспрымаецца як мітусьня. Нашто мяняць шыла на мыла?

Так я й сказала Віцы, калі мы ўрэшце пакінулі Мікалаеўну з сабакамі. Мы выйшлі зь вёскі, не сустрэўшы ні душы, толькі дзьве запозьненыя зьмейкі перасеклі дарогу, пакінуўшы разводы ў пыле. Можа, глушэча спадзьвігла Віку, і тая ўпершыню за гады й гады загаварыла «пра палітыку»:

— Яны першы раз самі выбіралі — не каго падсунулі, а каго самі хацелі. І выбіралі з цэлай пляймы людзей. Выбралі, каго выбралі. І цяпер адмовіцца сорамна. Яны яго не здадуць.

— Дый магчымасьці такой ужо ня будзе, — адказала я.

Тут здарылася нечаканка. Віка наблізілася й, нахіліўшыся праз ровар, зашаптала, блізка гледзячы мне ў твар:

— Слухай, нічога ня будзе, пакуль ён не памрэ, як ты гэтага не разумееш! Сыдзі ты з апазыцыі, пакуль ня позна, ты што, ня бачыш, якія цяжкія часы ідуць, іх трэба перацярпець, прашу цябе, сыдзі!

— Ну й куды ж я сыду, Віка?

— У школу, у раёнку, у бізнэс, я думаю, простых хлебаедаў чапаць ня будуць, ня трыццаць сёмы год!

— Якраз, можа, і трыццаць сёмы. Я думаю, Расею зноў скрывіла на асабліві шлях. Сама туды радасна прэцца, прыхапіўшы апошніх саюзьнікаў. Хто пасьпееў вылюднець, той адваліўся. Ну, а расейскія справы ты сама ведаеш — круты кіпень, варацца ўсе.

— Не гавары так, а то яшчэ збудзецца. Праўда, мы цяпер асобная краіна.

— Віка, што ты як цяля? Помніш досьледы з сазлучанымі сасудамі? Беларусь і Расея з ласкі твайго шэфа сазлучаныя. А мы з табой, напрыклад, адлучаныя. Ясна, як пень, — я буду на сьметніку гісторыі, а ты — у падручніках. Я буду хадзіць у калябарацыяністах і здрадніках, а ты — у заслужаных журналістах БССР. Праўда, калябарацыяністы будуць усплываць раз на тры пакаленьні, а так дык цараваць будзеце вы. Мае дзеці будуць хадзіць у школу па вуліцы імя цябе. А можа, наадварот, выкінуць цябе з кагорты за парочашчыя сувязі.

Віка трохі зазлавала.

— Усё ж мы са сваім народам, жывём на беларускія грошы, робім на беларускую ўладу, а вы — то на нямецкія, то на амэрыканскія. А хто плаціць, той і замаўляе музыку.

— Народ, Віка. Менавіта. А пра грошы і замовы ты сама ўсё ведаеш. Што ты пра Дажынкі напішаш? Паглядзім.

— Ой, а ты ўжо што напішаш?

Мы адвярнуліся адна ад аднае і пачалі глядзець на дарогу.

— А гэта някепская ідэйка, — кажу я. — Давай я напішу за цябе, а ты за мяне. Азораныя шчасьцем твары хлебаробаў і г.д.

— Перакрыўленыя ад п'янства аматары «Крыжачка» працуюць за шэлег і вешаюцца ў хлявох, — парыруе Віка.

Пасярэдзіне — жыцьцё?

Мы пераходзілі апошні поплаў перад нашай вёскай. Далей пачынаўся лес. Раптам нешта прымусіла мяне азірнуцца. Далёка па полі, нейк кумільгаючы, апусьціўшы лоб да зямлі, да нас валюхалася нейкая прыгорбленая істота — ці то чалавек, ці то сабака, здалёк блізарукаватыя вочы ня бачылі. Яна здагоніць нас ля лесу, — зразумела я. Мяне працяў люты жах.

— Віка, хто гэта? — крыкнула я, паказваючы назад.

Віка азірнулася, зьбялела й крыкнула:

— Уцякайма!

*Працяг будзе*

## НОВЫЯ КНІГІ

**Evanhelije in der Ubersetzung des Vasil Tjapinski um 1580. Facsimile und Kommentare** / Herausgegeben von Hieorhi Halenčanka. — Paderborn—München—Wien—Zürich: Ferdinand Schoningh, 2005. — 231 s. — (Biblia Slavica. Serie III: Ostslavische Bibeln. Band 5).

(*Эвангельле ў перакладзе Васіля Цяпінскага, каля 1580 г.* Факсыміле і камэнтары / Падрыхт. Георгі Галенчанка).

Кніжка выйшла ў рамках прэстыжнай славістычнай сэрыі «Biblia Slavica», дзе раней публікаваліся творы Скарыны. Прадмова Цяпінскага — адзін зь лепшых узораў патрыятычнай публіцыстыкі XVI ст., — апроч арыгіналу пададзена таксама ў перакладзе на нямецкую. Сам Цяпінскі апублікаваў Эвангельлі паводле Мацея і Маркі ў два слупкі — на царкоўнаславянскай і старабеларускай, што ўзноўлена ў нямецкім выданьні з дапамогаю факсыміле. Над тэкстамі працавалі кваліфікаваныя перакладчыкі і кансультанты, якія не дазвалялі сабе блытацца ў тэрміналягічных пытаньнях.

**Заливако, Александр. Историография генеалогии Беларуси (X—XXI вв.).** — Санкт-Пецярбург.: Невский простор, 2004. — 93 с.

**ADz**

# Знакі прыпынку



УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ

* * *

З Аляксандрам Лукашэнкам (старшынём саўгасу) і Зянонам Пазьняком (навукоўцам) я пазнаёміўся ў розны час, але ў адным месцы: на студыі тэлебачаньня. З Пазьняком — на праграме пра захаваньне старога Менску (пры будаўніцтве мэтро), з Лукашэнкам — на праграме пра вынікі Чарнобылю.

Мяркую, менавіта на тэлебачаньні пазнаёміліся мы ня столькі таму, што я там працаваў, колькі праз тое, што Пазьняк і Лукашэнка ўжо тады былі публічнымі асобамі — і шукалі публічнасьці.

У праграме з удзелам Пазьняка бралі ўдзел людзі казённыя (з гарвыканкаму, Саўміну), якія, як ні намагаўся я выправіць сытуацыю, Пазьняку амаль нічога не далі сказаць. І ён, адсунуўшы мікрафон, замаўчаў дэманстратыўна…

У праграме з удзелам Лукашэнкі таксама бралі ўдзел казённыя людзі (з Саўміну, з Акадэміі навук), якім, як ні намагаўся я выправіць сытуацыю, Лукашэнка амаль нічога ня даў сказаць. Захапіўшы мікрафон, ён гаварыў і гаварыў несупынна…

Пасьля праграмы пра вынікі Чарнобылю старшыня Дзяржтэлерадыё Генадзь Бураўкін сказаў мне: «Глядзі, каб гэтага *(ненарматыўная лексыка)* ані ў якай праграме болей не было, ён усё тэлебачаньне замудазвоніць…»

Неяк я напомніў пра тое Бураўкіну — ён запярэчыў: «Нешта ты блытаеш, не казаў я такога».

Магчыма, блытаю: ня ён казаў… Але ж нехта казаў… І не магу ўспомніць: хто гэта ўжо тады быў такі прадбачлівы?

* * *

Крымскія школы пераводзяцца на ўкраінскую мову. Пра гэта — па ўсіх расейскіх інфармацыйных каналах, і паралельна з гэтым — пра Севастопаль, Крым і валюнтарыста Хрушчова…

Хрушчоў працаваў ва Ўкраіне ў Юзаўцы (Данецку), Харкаве, Кіеве… У Кіеве я спытаўся ў функцыянэра зь ведамства культуры, які за манумэнтальнае мастацтва адказваў: «Чаму помнік Мікіту Сяргеевічу ні ў адным з украінскіх гарадоў не стаіць?..» Той зьдзівіўся: «А за што? Ён жа маскаль, камуняка…»

Такая во хахляцкая няўдзячнасьць… Расея колькі войнаў за Крым праваявала, насьмерць з туркамі білася, а Хрушчоў падпісаў паперу — і калі ласка: вось вам, друзі, Крым. Далучаю…

Да Беларусі, між іншым, таксама што-кольвечы магло далучыцца. Паводле баек, якія чуў я ў Маскве, Сталін напрыканцы вайны меў намер далучыць Кёнігсбэрг да БССР, каб пазьбегнуць памежнай пярэрвы ў камунікацыях — і наагул з эканамічнай мэтазгоднасьці. Але ў такім разе трэба было пакідаць за Беларусьсю і Беласточчыну. Таму ўмяшаўся ў сталінскія намеры паляк Ракасоўскі, які ўгаварыў пайсьці разам зь ім да Сталіна маршала Жукава: «По нашему мнению, товарищ Сталин, земля Пруссии, политая кровью русских солдат, должна быть только русской землей — и никакой другой».

Такая во пшэцкая сквапнасьць…

Калі ўявіць (каб палякам моташна стала), што Ракасоўскі Сталіна зь беларусамі не абдурыў і Беларусь — марская дзяржава, ці паўстаў бы сёньня ў Менску помнік правадыру? Ну хоць бы там, дзе ён некалі ўжо стаяў, — на Кастрычніцкай плошчы (колішняй плошчы імя Сталіна) — задам да Палацу Рэспублікі і перадам да рэзыдэнцыі Лукашэнкі…

Адным з аўтараў помніка (колішняга) таварышу Сталіну быў скульптар Заір Азгур. Неяк у майстэрні ягонай, забітай Ленінамі, Сталінамі і менш буйнымі правадырамі, крытык Рыгор Бярозкін, які паадпачываў у сталінскіх лягерах і да вайны, і пасьля яе, на Азгура, што называецца, наехаў. Якраз за тое, што той рабіў сталінскі помнік. «Кінь ты, Грыша, — адмахваўся Азгур. — Сталіна іншыя рабілі, я толькі гузікі на ім ляпіў».

Такая во жыдоўская хітрасьць…

«Сталінскі гузік!» — называў нейкі час Рыгор Саламонавіч Заіра Ісакавіча.

Байку ж пра тое, чаму і як з маскальскага Крым хахляцкім стаў, пачуў я ад украінскага літаратара, якога часова (і выключна за высокамастацкія заслугі, як раней яно і ў нас бывала) запісалі ў дыпляматы. І даводзіў ён мне ў Варшаве, што маскалі наўмысна (дзеля глыбіннай гістарычнай канспірацыі) брэшуць і брэшуць, нібыта Крым быў далучаны да Ўкраіны праз дурноту Хрушчова, празь нейкія хахляцкія ягоныя (якіх быць не магло!) сымпатыі і сувязі, і што наагул падаравана была Крымская паўвыспа ў імя братэрства савецкіх народаў ледзьве не па п'янцы. А насамрэч, у чым дасюль, маўляў, маскалям сорамна прызнацца, Крым быў закладзены пад каштоўныя савецкія паперы, якія толькі пад гэтую гарантыю на Захадзе, найперш у Амэрыцы, і купляліся. У 1960 г. настаў час абменьваць паперы на рэальныя грошы ды яшчэ плаціць працэнты. Ні першае, ні другое, зразумела, нават ня мелася на ўвазе, калі паперы выпускаліся. Але пазыка ёсьць пазыка, а пад ёю — Крым. Вось тады і прыдумалі перадаць паўвыспу Ўкраіне, на ўсялякі выпадак. Калі абыдзецца дык абыдзецца, а калі не, дык Украіна — самастойная дзяржава з прадстаўніцтвам у ААН, і яна вам нічога ня вінна.

Такое во яно ўсё, разам узятае…

З аднаго боку — абы-што. З другога боку, гісторыя ня тое, што было, а тое, што пра гэта набаяна, напісана, зьлеплена… Сталінскі гузік.

## Віталь Рыжкоў

ЗЯЛЁНЫ ЧАЛАВЕЧАК

Проста блукаючы па вуліцах
нейкім лютаўскім вечарам
і складаючы вершы,
забыўшыся на дакоры,
я выпадкова сустрэўся позіркамі
зь зялёным чалавечкам,
што быў расьпяты на звычайным
сьвятлафоры.

І ня тое, каб вельмі
сьпяшаўся я зараз дадому, —
проста зьяўленьнем сваім
ён адкрыў мне дарогу.
І ён, каго я дачакаўся,
быў зараз больш Хрыстом,
чым той, каго прынята лічыць
сынам Бога…

І чамусьці падумалася
аб далёкім і цёплым чэрвені,
недасягальным лагодным моры…
А вуліца гудзела сабе,
бы вялікае чэрава,
не заўважаючы мэсію,
расьпятага на сьвятлафоры…

## Юзік Дзенісюк

ТЭЛЕФОН ДАВЕРУ

Падлізанцы-стукачы,
Ня псуйце паперу —
Сёньня ўдзень ёсьць і ўначы
Тэлефон даверу.

Ліст пісаць — патрэбен глузд,
Крышку, можа, й веды.
Тут — слухаўка, нумар, хруст…
Ты — вяшчальнік мэдый.

Пра суседа раскажы,
Што цьвікі ўзяў з працы.
Кум пра ўласьць сказаў: рэжым —
БНФ, няйначай!

А другі сусед трыбух
Лашчыць чэскім півам,
Украінскі хваліць «Рух»,
Піша ў «Нашу Ніву».

У яго шляхетны густ
Не давай ты веры —
Праслухоўвай кожны куст,
Пракалупвай дзьверы.

Прасьвідроўвай ціхачом
Дзюрачкі у сьценах.
Будзь сапраўдным стукачом,
Віжам, юдам, ценем.

Калі зрок смуга скуе,
Не марнуй паперу.
Для таго ў нас існуе
Тэлефон даверу.

## Юрась Петухоў

ВУЛІЦА САМОТЫ

Для большасьці завесься Пралетарскай,
А хтосьці ведае й ранейшае імя.
Ты не крыўдуй на іх, мая ты, калі ласка,
Бо ведаю назоў сапраўдны толькі я.
Ты — вуліца Самота. Так банальна
Бяз шыльда-папяровай балбатні
Я ахрысьціў цябе. Ад сэрца. Нефармальна.
Мой сьціплы падарунак ты прымі.
Ад рамантызму плошчы ў час заходу
Іду ня ў парк — няма мне з кім ісьці.
Пяшчотнасьць дрэў на вуліцу Самоты
Зьмяню, спрабуючы на ёй сябе знайсьці.

Кагальны роў мінаю, дзе калісьці
Былі жабрацкія жыдоўскія дамы.
Я зараз сам жабрак. Прашу я з смутку
выйсьця
Для хворай, для галоднае душы.
Пад дахам дрэў, пад покрывам іх ценю
Мне спакайней ад неба боль хаваць.
Па рэштках сноў, аскепках летуценьняў
Наканаваў сабе шпацыраваць.
Але ж мой шлях спаткае скрыжаваньне,
І сам ня ведаю, куды ісьці далей, —
Мо збочыць мне, пакінуўшы блуканьні?
Хоць мне наўпрост ісьці ўсё ж свабадней.

## Хведар Самотны

РЭХА ЗАБЫТАЙ МОВЫ

Не крыўдуйся, забытая мова.
Ты памерла, але не зусім.
Тваё рэха апошняга слова
Будзе жыць…
Будзе жыць…
Будзе жыць…

А народ твой яшчэ пашкадуе
І навечна за то замаўчыць,
І, магчыма, ён рэха пачуе,
А яно
Будзе жыць…
Будзе жыць…

Адгукнецца яно на старонках
Шэрым пылам рассыпаных кніг
І ў вачах анямелых патомкаў
Будзе жыць…
Будзе жыць…
Будзе жыць…

Адгукнецца яно, адгукнецца,
Стукам сэрца яно прагучыць
І у памяці, што застанецца,
Будзе жыць…
Будзе жыць…
Будзе жыць…

## Юрась Нераток

СТАРЫ ВАЯР

Крывавай плямай сонца зьнікла
За змрочны могілкавы бор.
Былы салдат з тугою звыклай
Курыў махру і піў кагор.

Гамонкі тлумныя сьціхалі,
Цямнелі цені на траве…
Гайдаліся ўспаміны-хвалі
Ў яго сьсівелай галаве.

Ён зноўку чуў жалеза бразгат
І бачыў баявых сяброў,
Ішоў у цемры сьцежкай гразкай
І падаў, ранены, у роў.

Палоніў розум хмель паволі,
Навальваліся жаль і злосьць,
Бо страціў ён на ратным полі
І сэнс жыцьця, і маладосьць.

Ён праклінаў вайну-паганку,
Бо разумеў, што ваяваў
За тое, каб яго каханку
Хтось жонкаю сваёй назваў,

Каб бегалі чужыя дзеці
І падрасталі неўпрыкмет
І каб ніхто у цэлым сьвеце
Не зразумеў яго як сьлед.

Не перамога — паражэньне,
Нявыплатны памер цаны!
…Трыццаты год ад нараджэньня,
Дзясяты год пасьля вайны…



# Едзе мышка

Едзе мышка
далінаю
маркоўнаю
машынаю.

Пакуль у горад
дапаўзе —
усю машыну
пагрызе.

**З украінскае паводле Івана Малкавіча**
**пераклаў Мікола Бугай**

# Карчыцкі vs Бранштэйн

30-гадовы мянчук Сяргей Карчыцкі называе сябе геймерам, сьціпла дадаючы — «жрэц Фартуны і Інтэлекту». Сяргей выпускае часопіс «Новая экономика», дзе пляжыць амэрыканізм і свабодны рынак. І, натуральна, гуляе ў сёгі, якія ўважае за сродак паразуменьня чалавецтва: «Сумнеўна, што з задачай яднаньня справіцца мова гамбургераў і Галівуду».

Леташні чэмпіянат Беларусі па сёгах пакінуў уражаньне самадастатковасьці і пэрыфэрыйнасьці: у краіне мала япаністаў, а незарэгістраванай Беларускай асацыяцыі сёгаў не пад сілу арандаваць нават Палац шахмат і шашак. Тым ня менш, пры канцы году пераможца чэмпіянату БАС упершыню пазмагаўся ў міжнародным турніры. Паводле С.Карчыцкага, у Токіё ён пачуваўся сваім:

— Самай цікавай была партыя з Дайскэ Сузукі — зь першай дзясяткі сусьветных «профі». У сэансе адначасовай гульні, арганізаваным для чэмпіёнаў Беларусі, Расеі, Украіны, я перамог славутага гульца (расеец і ўкраінец прайгралі). Але Сузукі даваў нам туру наперад: прафэсіяналы з аматарамі бяз форы не змагаюцца. Наступны фэст заплянаваны на 2007 год: спадзяюся выступіць і там.

Ці ёсьць у сёгі ў Беларусі будучыня? Гутарачы з чальцамі Беларускай фэдэрацыі шахмат, заўважаеш шчыры інтарэс да перастаноўкі фігурак з герогліфамі. Хоць Давід Бранштэйн, які завітаў у клюб «Вясьнянка» на традыцыйны бліцтурнір, сказаў карэспандэнту «НН», што па-ранейшаму аддае перавагу клясычным эўрапейскім шахматам. «І галоўнае ў іх — фантазія», — зазначыў ён. Дарэчы, перамог у калядным спаборніцтве гросмайстар Сяргей Азараў: 5,5 бала з 7.

**ВР**



### Як бы вы згулялі?

Г.Верасаў—Д.Бранштэйн, XIII чэмпіянат СССР, Масква, 1944. Ход белых.

**Адказ:** 1. е4! f4 2. Се1! Те5 3. Сс3 Tg5 4. Kpf2 Kg8 5. ed. У белых яўная перавага. Фантазія не дапамагла «хітрамудраму Дэвіку»: праз 75 ходаў ён здаўся.

# «Песьні свабоды»: складзем дыск разам!

Увага! Рыхтуецца да выданьня альбом беларускай музыкі «Песьні Свабоды».

Выдаўцы зьвяртаюцца да чытачоў «Нашай Нівы» з просьбай прапанаваць пяць песень, якія найбольш вартыя для гэтай складанкі.
Просьба запоўніць купон і даслаць на адрас: **а/с 5, 220085 Менск, (для Віталя). Таксама можна скарыстацца e-mail: pesni2006@tut.by.**

Кожны, хто дашле купон, атрымае ў ПАДАРУНАК кампакт–дыск! Дасылайце купон да 15 студзеня. Выканаўцы, што жадаюць прапанаваць свае творы, могуць зьвяртацца па вышэй пазначаных кантактах.

| **Назва гурту** | **Назва песьні** |
|---|---|
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| 4. | |
| 5. | |
| **Імя** | **Кантакт (e-mail, тэлефон)** |
| | |



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Зрабі з газэты кнігу

«Нашу Ніву» ў новым фармаце зручна пераплятаць у квартальнікі ці гадавікі.




**Пераплётныя паслугі ў Менску:**

**«Апэратыўнае тыражаваньне»**
Тэл. 284–68–18, 284–72–17, 284–81–07,
8–029–6–400–100
Выезд, дастаўка.

**«Аўрора-плюс»**
Вул. Варвашэні, 3
Тэл.: 284–81–84,
284–32–72

**«Данарыт»**
Вул. Чарнышэўскага, 10, оф. 37а
Тэл.: 285–79–29,
8–029–645–99–54

**«Інфамаркет»**
Вул. Харужай, 3, оф. 307В
Тэл.: 284–37–07,
8–029–622–83–01,
8–029–622–83–04

**«Karandash.by»**
Падземны пераход паміж БДУ і БДПУ
Тэл.: 22–77–133
Працуюць і ў сьвяты, і ў нядзелі.

**«Паліграфічныя паслугі»**
Тэл.: 8–029–388–40–82,
8–029–570–74–11,
8–029–400–48–55

**«Фармат»**
Вул. Пугачоўская, 3, оф. 38 (рог Варвашэні і Чырвонай)
Тэл.: 8–029–758–06–16, 774–62–13,
8–029–341–17–29

**«Чэркас»**
Вул. Цэткін, 18
Тэл.: 211–00–63/64/65, 226–45–48,
8–029–643–80–77

Пераплёт таксама робяць **Нацыянальная бібліятэка** (вул.Чырвонаармейская, 7) і **Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа** (вул.Сурганава, 15).

## ВЫСТАВЫ

**Выстава пра Караткевіча**

У сядзібе ТБМ (Менск, вул. Румянцава, 13) працуе выстава «Беларуская песьня», прысьвечаная 75-годзьдзю Ўладзімера Караткевіча.
Экспануюцца творы як зусім маладых мастакоў (іх век ад 6 да 12 гадоў), так і студэнтаў менскіх мастацкіх устаноў.
Штодзённа, ад 11 да 19-й.
Тэл. для даведак: 283-08-85.

## СПОРТ

**Хакей. Чэмпіянат Беларусі**

**22 студзеня** (нядзеля)
«Юнацтва» (Менск) — «Мэталюргс» (Ліепая). Менск. Лядовы палац у Парку імя Горкага.
«Хімвалакно» (Магілёў) — «Рыга-2000».
«Гомель» — «Берасьце».
«Віцебск» — «Керамін» (Менск).
«Хімік-СКА» (Наваполацак) — «Дынама» (Менск).
Пачатак матчаў а 13-й.

## ТЭАТРЫ

**Опэра**

*(На сцэне Цэнтральнага Дому Афіцэраў)*
**20** (пт) — «Багема».
**26** (чц) — «Сэвільскі цырульнік».

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

### Тыльда Сўінтан і мінатаўры

**Хронікі Нарніі: леў, ведзьма і чароўная шафа (Chronicles of Narnia: The Lion, the Witch and the Wardrobe).**

ЗША, 2005, каляровы, 140 хв.

Жанр: казка паводле К.С.Льюіса.

Адзнака: 5 (з 10).

Чатырох дзетак — Пітэра, Сюзану, Эдмунда і Люсі — маці адпраўляе да старога сябры сям'і. Там дзеці знаходзяць чароўную шафу, празь якую трапляюць у казачную краіну Нарнію, замарожаную злой ведзьмай (Тыльда Сўінтан).

Рэжысэр абодвух «Шрэкаў» Эндру Адамз стварыў чароўнае відовішча з кентаўрамі, фаўнамі і гаваркімі бабрамі. Але хрысьціянскія алегорыі Льюіса расьцярушваюцца ў Эдэмскім садзе магічных жывёлаў.

Адмысловыя эфэкты — разынка карціны: леў Аслан, люты воўк, хітры ліс і вайсковец-мінатаўр — паводзяць сябе, як запраўскія акторы.

На іхнім тле прайграюць людзі, і нат выбітная акторка Тыльда Сўінтан становіцца макетам у казачнай дэкарацыі: белы твар, валасы-ледашы, мядзьведзі ў карэце.

Фільм намінаваны на «Залаты глёбус» за найлепшую музыку й песьню.

Спадабаўся і крытыкам, і дзецям.

**Андрэй Расінскі**

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 21 студзеня

**СТВ, 15.25**

**«Вэртыкаль».**

Расея—Украіна. (СССР), 1967, рэж. Станіслаў Гаварухін, Барыс Дураў.

Прыгодніцкая драма.

Альпіністы ў гарах сутыкаюцца са стыхіяй…

Фільм цікавы акторскай ігрой Уладзімера Высоцкага і ягонымі песьнямі.

**БТ, 22.20**

**«Двайны агент».**

Канада—Вялікая Брытанія—ЗША, 2004, рэж. Марэк Канеўска.

Трылер.

1950-я. Салі высьвятляе, што ейны каханы — агент КГБ, які цяпер жыве ў Маскве. Гераіня спрабуе прабрацца за «жалезную заслону»…

Ролі выконваюць: Шэран Стоўн, Рупэрт Эвэрэт.

**АНТ, 23.25**

**«Непакорлівы».**

Італія—Францыя—ЗША, 2002, рэж. Філіп Бэрэн'е.

Трымценьнік.

Жыль вяртаецца дадому пасьля доўгіх гадоў. Але ніхто яго не чакае. Брат Джордж ажаніўся на дзяўчыне Жыля, лепшы сябра — кіраўнік мафіі. І героя абвінавачваюць у забойстве, якога ён не чыніў…

Галоўныя ролі выконваюць зоркі Вэнсэн Касэль і Моніка Бэлючы.

**СТВ, 23.30**

**«Амэрыканская раскоша».**

ЗША, 2003, рэж. Шэры Спрынгер.

Камэдыя.

Рэгістратар шпіталю Харві вырашае маляваць уласныя коміксы. Героем ён абірае сябе самога, а ў якасьці прыгодаў выступаюць штодзённыя недарэчнасьці…

Прыз «ФІПРЭСІ» на Канскім кінафэсьце, галоўны прыз кінафэсту «Сандэнз», прыз крытыкі на кінафэсьце ў Давіле, намінацыя на «Оскара».

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА DVD

**Master Records**

Элізабэттаўн

**Рамантычная драма, ЗША, 2005, рэж.** Кэмеран Кроў.

**У ролях:** Арлянда Блум, Кірстэн Данст, С'юзан Сарандан.

Пасьпяховы дызайнэр, які згубіў працу, ляціць на хаўтуры бацькі. У палёце герой знаёміцца з надзвычай гаваркой стуардэсай...
Менск, Кісялёва 12, т.643-21-08.

*(На сцэне Белдзяржфілярмоніі)*
**28** (сб) — канцэрт старадаўняй музыкі «Мінуўшчыны неацэнны дарунак».

**Купалаўскі тэатар**
**21** (сб) — «Ромул Вялікі».
**22** (ндз) — «С.В.».
**23** (пн) — «Тапалевая завея».

**Ранішнія спэктаклі**
**22** (ндз) — «Ажаніцца — не журыцца».

**Малая сцэна**
**21** (сб) — «Востраў Сахалін».
**23** (пн), **27** (пт) — «Дзікае паляваньне караля Стаха».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**21** (сб) — «Кароль Лір».
**22** (ндз) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».
**22** (ндз) — «Палёты з анёлам».

## КІНАФАРМАТ «4Х4»

**Апошнія дні (Last Days)**
ЗША, 2005, каляровы, 97 хв.
Драма.
Аўтарская вэрсія апошніх дзён Курта Кабэйна, зьнятая Гасам ван Сэнтам.

**Гарпастум**
Расея, 2005, чорна-белае рэтра, 114 хв.
Драма.
Срэбнае стагодзьдзе вачыма Аляксея Германа-малодшага. Фільм — удзельнік Вэнэцыянскага фэсту.

## НАЖЫ

для акуратнага разразаньня паперы прапануе ЦУМ.



Самы танны каштуе 550 рублёў, самы дарагі — 6000 рублёў.

## Збор сродкаў на кнігу Сыса

**У Рэчыцы (Гомельшчына) рыхтуецца зборнік паэзіі Анатоля Сыса. Сродкі можна пералічваць на рахунак аддзелу культуры Рэчыцкага райвыканкаму № 373 500 017 0040 у філіяле № 323 АСБ «Беларусбанк», УНН 400001176.**

**Кожны, хто дапаможа, прытуліцца да выданьня, будзе згаданы ў кнізе.**

## КАЛІ Б...

**...тараканы ўдзельнічалі ў выбарах прэзыдэнта.**



«Сёньня камэндант заявіў, што калі мы не падпішамся за Лукашэнку, ён выганіць нас з інтэрнату».

**...кубік канструктара «Lego» быў бы роўны кубіку газу.**



«Калі «Газпром» захавае нам кошт 48 $ за куб, я дабудую гэтую вежу».



**Пытайцеся ў кнігарнях кнігу Сяргея Балахонава «Імя грушы»**



## У НУМАРЫ

### Акадэмік Аляксандар Вайтовіч



завяршыў сваю кароткую палітычную кар'еру заклікам да байкоту выбараў. **Старонка 24.**

### Скура для Домаша



У Горадні на Радзе дырэктараў прысутных пазнаёмілі з трыма новымі кіраўнікамі прадпрыемстваў… **Старонка 5**.

### Джынсы не найгоршы варыянт



каб пачуцца свабодным. Піша стылістка Сьвятлана Длатоўская. Стыль жыцьця — **старонка 30.**

### Блазен Гасподні



У Шалкевіча беларусы, сьмеючыся, аплакваюць сваю сучаснасьць. Піша Аляксандар Фядута. **Старонка 36.**

### У Беларусі, і нідзе болей



З унікальнай выставы ў Мастацкім музэі піша Сяргей Харэўскі. **Старонка 19.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ВІТАНЬНІ**

**Віншуем Вольгу і Яна** Лагвіновічаў! 12 студзеня яны сталі бацькамі цудоўнага сыночка!!!

**ДАПАМАЖЫЦЕ КАЦЯНЯЦІ**

**Два кацяняткі** (узрост — 4 месяцы): белы пухнаты хлопчык ды шэрая дзяўчынка — вельмі марацъ прыдбаць добрых гаспадароў і верных сяброў. Т.: 017-249-08-88, 249-08-93; 029-649-08-88, 400-68-82, 901-02-12

**КАНТАКТЫ**

**Моладзь** — за Беларусь! Далучайся! Тэл. 755-69-90

**Беларусы** ў Польшчы — яднаймася! E-mail: azaleuski@yahoo.pl

**КНІГІ**

**Прадам кнігі:** «Граматыка» Тарашкевіча, «Энцыкляпэдыя беларускай мовы», «Беларускі арнамэнт» Кацара, «Расейска-крыўскі (беларускі) слоўнік» Ластоўскага, Л.Геніюш «Споведзь», «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі» ды шмат інш. Т.: 753-70-05, 294-02-15

**«Нацыяналізм** у XX-м ст.» Сьміта, «Курапаты» Пазьняка, «Русіфікацыя беларускае мовы ў БССР» С.Станкевіча, старыя нумары «Нашае Нівы» — у падарунак на сядзібе ТБМ. Тамсама: беларускія фільмы і музыка на CD, значкі, слоўнікі. Румянцава, 13 (панядзелак—субота, 13.30—18.00). Т.: 707-40-01

**Прадам слоўнікі** В.Ластоўскага, Яна Станкевіча ды іншыя. Т.: 707-40-01, 234-93-71

**Распаўсюд. Абмен.** Гісторыя, фальклёр, постмадэрнізм, літаратура, псыхалёгія, канфэрэнцыі, круглыя сталы, кнігі, аўдыё, пошта, інтэрнэт. Зьвяртайцеся на e-mail: aleskigi@mail.ru; a/c 195, 220030, Менск.

**Кнігаабмен.** Альбом «Менск — горад СОНца», пераклады: кнігі, перакладзеныя з польскай, ангельскай, нямецкай, расейскай моў, у тым ліку «Дзяды», «Санэты» Міцкевіча, літаратура беларусаў Польшчы XV—XIX ст., падручнікі па журналістыцы. Т.: 753-91-96

## ЖАРТЫ

— Алё! Да мяне ваша газэта не даходзіць!

— А якія нумары Вы, спадару, не атрымалі?

— Ды не, я ўсе атрымаў. Раз прачытаў — не даходзіць. Другі раз прачытаў — усё адно не даходзіць!

Прыватныя абвесткі ў «НН» (ня больш за 15 словаў) дасылайце поштай (а/с 537, 220050 Менск), праз e-mail (nn@promedia.by) або разьмяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Ст. Радашковічы** Лібава-Роменскай чыгункі. Каля станцыі вырасла як бы маленькае мястэчка, ёсьць тут манапольска, пара крам і заездаў, колькі гандляроў і майстар малатарань. У «Нашай Ніве» пісалася пра тое, што патрэбна тут хоць якая школа. Пэўне, гэтыя модлы да кагось дайшлі, бо цяпер адкрыліся аж 2 школы і вучыцца каля 200 дзяцей.

**П.**

**Пачтовая скрынка**

**С. Плаў-ку** (будучаму Зьмітраку Бядулю. — **«НН»**) . У вершах вашых ёсьць добрая думка, але слаба апрацаваны. Ёсьць звароты такія, што ніяк ня могуць быць у вершах, як напрыклад: «Дзе чарот填 мармочыць, там русалкі шайкі» або аб «Белай сьмятане і тумане» дый другія. Пішыце карэпандэнцыі, яны ў вас дужа цікавыя і маюць для нас вялікую вагу.

**1911, №3, 20 студзеня.**

Ліцэнзія № 02040/0174947. Выдадзеная 25.08.2004 г.

ДУ «Рэспубліканскі клінічны шпіталь ІВАВ імя П.М.Машэрава»

стаматалягічныя паслугі

на платнай аснове



Якасна

хутка

нядорага

Менскі раён, пасёлак Лясны.
Т.: 202-23-13

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914),
Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч,
У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 2721.** **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 1.00 20.01.2006.

Замова № 337.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а